МІХАСЬ КУПТЭЛЬ

# АДГАЛОСКІ КАРЭСПАНДЭНТА

СОПАТ 2006

Тэхнічнае афармленне: Люцына Ёахімоўска

Праект вокладкі і графічнае афармленне:
Марцін Куптэль

ISBN 83-923999-0-0
ISBN 978-83-923999-0-2

Copyright 2006 by Michał Kuptel

"... do wieczności przechodzą idee, myśli i ich autorzy"

Michał Kuptel

*"Można pisać korespondencje do "Nivy", ale kiedy nie ma w nich idei, to niech przynajmniej będą w nich informacje" - tak podsumował artykuły niektórych korespondentów w kwietniu 1993 r. Michał Kuptel. Każdy, kto czytał białostocką "Nivę" przez ostatnie ćwierćwiecze, spotykał się z tzw. "dopiskami" Michała. Łącznie wysłał do "Niwy" około 200 takich "dopisków". Około – bo nie wszystkie – bywało – publikowano. Los każdej korespondencji do prasy bywa podobny – redakcja decyduje o jej opublikowaniu. Tym niemniej korespondent cieszy się pewną swobodą myśli i działania, nikt nie może go zmusić do pisania czy odzewu na konkretny artykuł.*

*Jeśli w gazetach publikowane są korespondencje czytelników, to świadczy o ich żywotności, że są czytane, że są komuś potrzebne. Kiedy przegląda się białoruskie gazety okresu międzywojennego, jakie ukazywały się w Wilnie, to uwagę zwraca duża liczba korespondencji z terenu. Nawet, gdy weźmie się do ręki "Nivę" z lat 50. i 60. minionego stulecia, to widać, jaką popularnością cieszyła się nie tylko Białostocczyznie, ale i w innych regionach Polski. Świadczyło to o osobliwym „głodzie" na białoruskie słowo drukowane zarówno wśród Białorusinów zamieszkałych na Białostocczyźnie, jak i tych, którzy opuścili ją oraz na ogół ojczyste białoruskie ziemie z różnych powodów: politycznych, ekonomicznych czy edukacyjnych.*

*Niejaki Aleh Ardynski z Koszalina w 1957 roku pisał do "Nivy": "Napiszcie dlaczego u nas w Koszalinie nie ma "Nivy". Kiosk, w którym kupuję "Nivę", otrzymuje tylko jeden egzemplarz, a czytelników jest wielu". Do redakcji białoruskiego tygodnika przysyłali korespondenci z Wrocławia, Szczecina, Gdańska, Warszawy oraz innych miejscowości. Ze Sztutowa przysyłał wiersze Mikoła Dwarecki (Bazyluk), z Torunia – etnograficzne i historyczne "dopisy" – Marian Pieciukiewicz, z Warszawy – Jerzy Turonak i Aleksandra Bergman , z Koszalina – Henryk Bibiła, z Sopotu – Maciej Konopacki. W latach 70. liczba korespondencji zmalała, choć "Niva" zachęcała pisać, organizując nawet zjazdy korespondentów.*

*Nowa fala korespondentów pojawiła się na początku lat 80. Demokratyzacja i polityczne przemiany wielu ludziom otworzyły oczy, że można swobodnie żyć i oddychać. Świeży oddech nie ominął i "Nivy". Stała się bardziej otwarta na swobodę myśli i wypowiedzi. Zauważa się swoiste białoruskie odrodzenie na Białostocczyźnie, poczucie swej narodowej godności. Chociaż wtedy jeszcze w Białorusi Radzieckiej (BSRR) niewielu marzyło o niepodległości. Wtedy to właśnie w "Nivie" ujawnił się nowy korespondent z Sopotu – Michał Kuptel*

*(Michał Machnacki – jak często podpisywał korespondencje). Działał społecznie wówczas w Gdańskim* Oddziale *Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego. Jesienią 1982 r. wysłał do „Nivy" pierwszą korespondencję. Pisał w niej o białoruskich nazwach miejscowości na Białostocczyźnie. Pierwszy upublicznił ten problem na łamach "Nivy", mimo że w tygodniku posługiwano się wyłącznie białoruskimi nazwami miejscowości. Ależ na tablicach były, jak i dotychczas są, wyłącznie polskie.*

*Michał Kuptel urodził się 12 sierpnia 1942 r. w Mochnatem, w powiecie Hajnowskim, gdzie też ukończył szkołę podstawową. W 1962 r. ukończył Liceum Pedagogiczne w Bielsku Podlaskim. W latach 1963-1967 studiował matematykę w Wyższej Szkole Pedagogicznej w Gdańsku (obecnie Uniwersytet Gdański). Pracował jako nauczyciel matematyki w szkole i wykładowca na Uniwersytecie Gdańskim. Od 1974 r. pracuje jako informatyk i programista w Morskim Instytucie Rybackim w Gdyni. Nie bacząc na codzienne problemy, „Niva" i działalność w białoruskim środowisku w Gdańsku, stały się nieodłączną cząstką jego życia. Michał Kuplet nie tylko prenumerował „Nivę" i ją czytał, ale stał się jej aktywnym korespondentem. Działając aktywnie w środowisku białoruskim w Trójmieście, najpierw w Oddziale BTSK, a potem w Białoruskim Towarzystwie Kulturalnym „Chatka", często pisał o tym, co dzieje się na Wybrzeżu, informując tym samym czytelników „Nivy", że Białorusini zamieszkują nie tylko na Białostocczyźnie, że skupiają się i integrują wokół białoruskiej idei, jakimi problemami żyją, czym się zajmują. Informacyjny charakter tych korespondencji obecnie ma znaczenie historyczne jako dowód białoruskiej obecności nad Morzem Bałtyckim.*

*Michał Kuptel przez ponad dwadzieścia lat jest głównym polemistą "Nivy". Białorusini nie za bardzo lubią być krytykowani przez kogokolwiek, zwłaszcza przez współrodaków. Polemiczne teksty Michała Kuptela albo Michasia Machnackiego świadczą o jego zainteresowaniu problematyką białoruską w Polsce, o dokładnym czytaniu tygodnika i krytycznym podejściu do poglądów tam głoszonych. Oprócz wspomnianych już białoruskich nazw miejscowości, nurtowały go problemy związane z zachowaniem odrębności białoruskiej w Polsce, a przede wszystkim na Białostocczyźnie. Tematy, na które się odważnie wypowiadał, dotyczyły języka białoruskiego, szkolnictwa, samorządu lokalnego, przedsiębiorczości, spraw muzeum, literatury... Wszystko to – aktualne problemy wśród Białorusinów na Białostocczyźnie. Michał Kuptel martwi się, że ludzie nie czytają „Nivy", że na jej łamach nie ma wymiany poglądów. O jego zainteresowaniu „małą ojczyzną" świadczą doroczne korespondencje do Nivy", poczynając od 1982 r. Najwięcej ich zamieszczono w roczniku 1983 – 15.*

*Korespondencje Michała Kuptela charakteryzują się wyrazistością myśli, oryginalnymi uwagami na temat rzeczywistości i miejsca w niej Białorusinów. Widać w nich podejście analityczne i perspektywiczne, przejmowanie się proble-*

*mami białoruskimi, rozmyślania o czasie obecnym i minionym, szukanie rozwiązań na przyszłość.*

*W polemice z Sokratem Janowiczem ("Падбайце аб культуру мовы" –"Niva" z 17 kwietnia 1994 r.) Michał Kuptel sformułował credo korespondenta: "My przy okazji pretendujemy " o przejście do wieczności...", gdy piszemy korespondencje do "Nivy". Otóż, nie muszę „wpisywać się do wieczności" jako autor "Nivy", jestem wolnym człowiekiem. Gdy coś mi się nie podoba we współczesnej rzeczywistości, w poglądach autorów „Nivy", którzy nieraz wypisują głupstwa, chwytam za pióro i piszę. Piszę i wtedy, chcę podzielić się swoimi przemyśleniami. Pisanie, to moje prawo w wolnym i demokratycznym państwie, a wolna wola „Nivy", czy zechce to wydrukować. Należy rozumieć wzajemne relacje między korespondentami a redakcją".*

*Michał Kuptel, pisząc do "Nivy", przez wiele lat wnosi do niej ożywczy powiew, udowadnia, że czyta się ją nie tylko na Białostocczyźnie, udowadnia, że czytelnik ma prawo do własnych poglądów, które może przedstawić na łamach tygodnika, co też dobrze świadczy o redakcji i jej pozytywnym nastawieniu do korespondentów. Choć tych ostatnio jak na lekarstwo.*

***Helena Głogowska***

“...у “вечны лік” уваходзяць ідэі, думкі і іх аўтары”.

Міхась Куптэль

*“Можна пісаць у “Ніву”, і калі ў гэтым няма думкі, то няхай хоць будзе інфармацыя” – у сакавіку 1993 г. пісаў у сваёй карэспандэнцыі Міхась Куптэль. Кожны, хто чытае беластоцкую “Ніву” праз апошняе чверцьвечча, сустрэўся на яе старонках з Міхасёвымі допісамі. За гэты перыяд напісаў іх каля 200. Каля – таму, што не ўсё – бывала – “Ніва” публікавала. Лёс карэспандэнта заўсёды адзінакавы – ён нештатны дапісчык. Таму і ніхто не можа яго прымусіць пісаць наогул, не кажучы ўжо пра заказванне артыкулаў.*

*Калі ў газэты ёсць карэспандэнты, відаць, што яна жыве, што яе чытаюць, што яна некаму патрэбная. Калі гартаецца беларускія газеты міжваеннага перыяду, якія выходзілі ў Вільні, кідаецца ў вочы вялікая колькасць дапісчыкаў з правінцыі. Нават, калі бярэш у рукі “Ніву” 50. ці 60. гадоў бачна якое зацікаўленне выклікаў беларускі тыднёвік не толькі на Беласточчыне, але і ў іншых месцах Польшчы. Сведчыць гэта пра “голад” беларускага друкаванага слова сярод беларусаў пражываючых на этнічнай Беласточчыне, як і тых, якія яе ды не толькі яе, але наогул родныя беларускія землі, пакінулі па розных прычынах, ці то палітычных, ці эканамічных, ці адукацыйных.*

*Нехта Алег Ардынскі з Кашаліна ў 1957 г. пісаў у “Ніву”: “Напішыце, чаму у нас у Кашаліне няма “Нівы”. Кіёск, у якім я купляю “Ніву” атрымоўвае ўсяго 1 экз., а чытачоў ёсць многа”. Слалі свае допісы ў беларускі тыднёвік людзі з Вроцлава, Шчэціна, Гданьска, Варшавы ды іншых мясцін. Са Штутова слаў вершы Мікола Дварэцкі (Базылюк), з Торуня – этнаграфічныя і гістарычныя допісы – Мар’ян Пецюкевіч, з Варшавы – Юры Туронак ды Аляксандра Бэргман, з Кашаліна – Генадзь Бібіла, з Сопату – Мацей Канапацкі. У 70. гады карэспандэнты крыху “аселі”, хаця “Ніва” заахвочвала пісаць, арганізуючы нават з’езды карэспандэнтаў.*

*Новая хваля карэспандэнтаў паявілася на пачатку 80. гадоў. Дэмакратызацыя і палітычныя перамены шмат каму адкрывалі вочы, што можна жыць і дыхаць свабодна. “Ніва” стала больш адкрытая на свабоду думкі і выказванняў. Назіралася свайго роду беларускае адраджэнне на Беласточчыне, пачуццё гордасці за сваю нацыянальнасць. Хаця тады яшчэ ў Савецкай Беларусі і не марылася пра незалежнасць. Тады таксама ў “Ніве” аб’явіўся новы карэспандэнт з Сопату – Міхась Куптэль (Міхась Махнацкі – як часта падпісваў свае дапісы). Дзейнічаў тады грамадска ў Гданьскім Аддзеле Беларускага Грамадска-Культурнага Таварыства.*

*Першую карэспандэнцыю паслаў увосень 1982 г.("Дарага "Ніва") Прысвяціў яе беларускім назвам. Быў першым, які падняў гэтую тэму на старонках "Нівы", хаця тыднёвік на сваіх старонках карыстаўся выключна беларускімі назвамі мясцовасцяў Беласточчыны. Але-ж на таблiцах былі, як і дасюль, выключна польскія.*

*Міхась Куптэль нарадзіўся 12 жніўня 1942 г. у Махнатым на Гайнаўшчыне, дзе таксама закончыў пачатковую школу. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Педагагічным ліцэі ў Бельску Падляшскім, дзе таксама вывучаў беларускую мову. У гг. 1963 – 1967 студыяваў матэматыку ў Вышэйшай педагагічнай школе ў Гданьску (цяпер гэта Гданьскі універсітэт).*

*Завёўшы сям'ю, Міхась Куптэль пасяліўся ў Сопаце. Працаваў настаўнікам матэматыкі ў школе і выкладчыкам на Гданьскім універсітэце. З 1974 г. працуе інфарматыкам і праграмістам у Марскім рыбацкім інстытуце ў Гдыні. Нягледзячы на штодзённыя турботы, "Ніва" і дзейнасць у беларускім асяроддзі ў Гданьску сталі неадлучнай часткай жыцця. Міхась Куптэль не толькі выпісваў "Ніву" і яе чытаў, але стаў яе актыўным карэспандэнтам. Дзейнічаючы актыўна ў беларускім асяроддзі ў Трыгорадзе, спярша ў аддзеле БГКТ, а пасля ў Беларускім Культурным Таварыстве "Хатка", часта пісаў допісы пра тое, што дзеецца на Узбярэжжы, інфармуючы тым самым чытачоў "Нівы", што беларусы пражываюць не толькі на Беласточчыне, што гуртуюцца і інтэгруюцца вакол беларускай ідэі, чым жывуць, што робяць. Інфармацыйны характар гэтых допісаў сёння мае ўжо гістарычнае значэнне як доказ беларускай прысутнасці над Балтыцкім морам.*

*Міхась Куптэль на працягу больш чым 20. гадоў стаўся галоўным палемістам "Нівы". Беларусы не надта любяць, калі іх нехта крытыкуе, асабліва іншы беларус. Палемічныя тэксты Міхася Куптэля або Міхася Махнацкага з'яўляюцца доказам яго зацікаўлення праблематыкай беларускага жыцця ў Польшчы, дакладнага перачытвання "Нівы" і крытычнага да яе падыходу. Апрача ўжо ўспомненых беларускіх назваў мясцовасцяў, турбавалі яго справы звязаныя з захаваннем беларускасці ў Польшчы, а перадусім на Беласточчыне. Тэмы, на якія выказваў свае адважныя погляды, адносіліся да беларускай мовы, школьніцтва, мясцовага самакіравання, прадпрымальніцтва, музейнай справы, літаратуры... Усё гэта актуальныя праблемы сярод беларусаў на Беласточчыне. Міхась Куптэль перажывае, што людзі не чытаюць "Нівы", што на яе старонках няма абмену думкамі. Пра яго зацікаўленне бацькаўшчынай сведчаць штогадовыя допісы ў "Ніву", пачынаючы з 1982 г. Найбольш іх змясціла "Ніва" ў 1983 г. – 15.*

*Допісы Міхася Куптэля характэрны выразнасцю думак, трапнымі заўвагамі наконт рэчаіснасці і месца ў ёй беларусаў. Бачнае ў іх аналітычнае і перспектыўнае думанне, перажыванне праблемаў беларускага руху,*

*асэнсоўванне існуючага і пераажытага, шуканне выхаду на будучыню.*

*У палеміцы з Сакратам Яновічам Міхась Куптэль вылажыў сваё крэда як карэспандэнта: "Мы пры нагодзе прэтэндуем у "вечны лік аўтараў...", калі пішам у "Ніву" свае карэспандэнцыі. Я не мушу ўваходзіць у "вечны лік" ніўскіх аўтараў, я вольны чалавек. Калі нешта не падабаецца мне ў сучаснай рэчаіснасці, у выказваннях аўтараў "Нівы", якія часам выпісваюць дурнату, бяру пяро і пішу. Пішу і тады, калі хачу падзяліцца і сваімі думкамі. Пісанне, гэта маё права ў вольнай і дэмакратычнай дзяржаве і вольная воля "Нівы" гэтае друкаваць. Трэба разумець узаемныя дачыненні карэспандэнтаў і рэдакцыі".*

*Міхась Куптэль сваімі карэспандэнцыямі на працягу многіх гадоў ажыўляе "Ніву", даказвае, што яе чытаюць не толькі на Беласточчыне, даказвае таксама што чытач яе мае свае погляды, якія можа прадставіць на старонках тыднёвіка, што добра сведчыць таксама пра пазітыўныя адносіны рэдакцыі да карэспандэнтаў. Хаця нажаль іх незашмат.*

**Лена Глагоўская**

# ДАРАГАЯ “НІВА”

Нараканне на тое, што няма “беларускіх назваў на карце беласточчыны” (Міхась Шаховіч – “Ніва” № 30 ад 26.02.82 г.) або што ў беларускіх школах не навучаюць беларускай мовы, нічога канкрэтнага не дасць.

Першая справа – гэта назвы вёсак, гарадоў, вуліц. Трэба каб былі яны напісаны на польскай і беларускай мове. Няхай кожны беларус, і не толькі, жывучы ў Польшчы, ведае, што жыве ў беларускай вёсцы ці горадзе. Я не бачу перашкоды каб так не было.

Міхась Шаховіч піша, што беларусы адмаўляюцца ад сваёй мовы і ад беларускага паходжання. А ці ж маюць адзначыць сябе вялікай літарай “Б”, калі ў тым жа часе вёска, горад ці мястэчка, вуліца і школа не мае беларускай назвы? А калі мае, то напісана на польскай мове. Трэба ад гэтага пачаць, можа тады беларускія настаўнікі будуць навучаць беларусаў беларускай мове а вучні ахватней вучыцца. Таксама ахватней будуць яе вувучаць , калі навука беларускай мовы не будзе дабравольнай.

Паказванне гісторыі (так як “Ніва” гэта робіць) Беларусі, паказыванне прысутнаці беларусаў у развіцці польскай і беларускай культуры ў Польшчы гэта добрая дарога да таго, каб беларус не выракаўся сябе. Прыемна было б паслухаць беларускую мову па радыё, прыдалося б такое штосці і палякам, то ж яны пакуль што думаюць, што ў Польшчы няма іншага насельніцтва, чым польскае. Думаю, што не толькі я спатыкаўся з пытаннем-здзіўленнем: “То ў Польшчы жывуць Беларусы?”

5 студзеня 1982 г.

# НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ МЯНЯІЬ НЕЛЬГА І НЕМАГЧЫМА

Мая дарога падобная да дарог большасці беларускай інтэлігенцыі, рассыпанай па ўсёй Польшчы. Нарадзіўя я ў Махнатым (там і жыве мая радня). Потым педагагічны ліцэй у Вельску Падляшскім, далей адзін год настаўнічаў у Трывежы, потым Вышэйшая педагагічная школа ў Гданьску і астаўся там, дзе вучыўся.

Чым займюся? Перакладам “нармальай” мовы на мову машын (матэматычных) і наадварот.

Алесь Барскі ў сваіх “Амерыканскіх былях” крануў тонкія струны нацыянальнай прыналежнасьці. Думаю, што беларус, паляк, рускі, француз ці іншы – кожны павінен астацца такім, якім нарадзіўся. Мяняць нацыянальнасьць нельга і немагчыма.

Паўстаў цэлы ланцуг прычын таго, што беларусы выракаюцца сваёй нацыянальнасці. А галоўная тая, што ад першага класа яшчэ малы беларус прысвойвае ў школе лацінскую культуру ў шырокім яе сэнсе. Даходзяць да таго недахопы ў навучанні беларускай мовы, адсутнасць беларускай гісторыі ў праграмах школы, адсутнасць беларускай мовы ў назвах сёл, гарадоў, вуліц ці ва ўстановах. Не хапае і настаўнікаў да навучання яе. Аб прявах беларускага рэнегацтва трэба гаварыць і грымець, але гэта нічога не дасць, калі мы не ўглыбімся ў прычыны такой сітуацыі.

Дагэтуль няма ў Польшчы беларускага інстытута ў якім сабралася б і навука, і культура, і на канец – беларуская інтэлігенцыя. Беларуская філалогія ў Варшаўскім універсітэце – гэта замала і задалёка ад Беласточчыны. А так па праўдзе, то ўсё ляжыць адлогам: і музыка і мастацтва, і асвета, і культура і этнаграфія. За ўсё трэба ўзяцца і ёсць каму. Можа няма дзе, але думаю, што беларусы самі пабудавалі б свой беларускі дом у Беластоку, а не толькі новую царкву.

Ад. рэд. Дарагі чытач, вы пішаце што прыдаўся б слоўнік. Выслалі вам „Тлумачальны слоўнік беларускай мовы” вельмі добры, ён выясняе ўсе моўныя сумненні.

27 сакавік 1983 г.

# ВЕЛАРУСКАЯ МОВА

Ці патрэбна беларусам, жывучым у Польшчы, беларуская мова? Пытанне наіўнае? А мо не?

Беларус хоча чытаць беларускую кніжку і яму для гэтага патрэбна ўмеласць чытання на гэтай мове. А ці можа беларус чытаць па беларуску? Можа, калі вельмі пастараецца калі мае доступ да кнігарні, у якой прадаюцца беларускія кніжкі. 3 выбарам ужо справа не такая простая. У Бельску Падляшскім летам 1982 года на паліцы кнігарні стаяла некалькі дзесяткаў беларускіх кніг. Знаёмы аўтар яшчэ са школы, Пятрусь Броўка, два тамы выбраных твораў, кімсьці заказаны і адложаны. Купіў кніжку незнаёмага аўтара, не расчараваўся, але гэтага было за мала.

А ці гавораць беларусы па-беларуску? Так, гавораць. А дзе яны гавораць пабеларуску? Дома. Гэта многа і гэта мала. Многа, бо беларуская мова пераходзіць з пакалення ў пакаленне і таму яна не знікае. А мала таму, што яна бедная – хатняя мова. Невялікі састаў у яе слоў, тнога слоў прысвоеных. Гэта нядрэнна, але ёсць жа і адпаведнікі іх у беларускай мове.

‘Гролькі як яны могуць да беларусаў трапіць? Праз кніжку не могуць па прычыне вышэй сказанага. А можа яны трапяць праз радыё або праз тэлевізар? Прабачце мне гэты жарт. А можа Беласточчына, як піша А. Барскі вечная і незалежная (цікава як) можа зафундаваць беларусам беларускую мову па радыё? Так на пачатак гадзінку ў дзень?

А можа так яшчэ памарым. Напрыклад, каб у другой агульнапольскай праграме радыя маглі беларусы, рассеяны па Польшчыб паслухаць беларускай мовы.

Тагды М. Лук’янюк („Ніва” 16.01.1983) у “Маёй званіцы” не будзе ўстыдаць дзяцей Матроны за тое, што не прызнаюцца да сваёй вясковай маці. Іх трэба ўстыдаць за тое што яны за мала апранаюць сваю маці па модзе і таму надзявае яна шапачку толькі ў Беластоку, а не ходзіць у ёй каля кароў.

Вернемся, аднак, да пачатковага пытання. Пытаем далей, ці патрэбная беларуская мова, напрыклад, у краме? – Так, тут патрэбная. Абслугоўваюць нас у той краме беларусы. А ў гміне? Тут не ведаю, не быў. А можа патрэбна яна, каб напісаць на ёй якую-нябудзь заяву, паданне? Для гэтага беларуская мова непатрэбная. Усё пішацца на польскай мове. Колькі, помню, мой бацька тых паданняў напісаў тады яшчэ калі быў адзіным адукаваным чалавекам у вёсцы – не пералічыш. І ніводнага па-беларуску! Аказываецца, што так па праўдзе, беларуская мова астаецца рэліктам мінулага , патрэбная – ну каму?

Зусім забыў – патрэбная яна тым, хто будзе чытаць, калі рэдакцыя надрукуе, маё пісьмо. Так, напэўна , каб чытаць “Ніву”, трэба ведаць беларускую мову.

15 мая 1983 г

# МУЗЕЙ – ЭЛЕМЕНТ ЖЫВОЙ КУЛЬТУРЫ

Драўляны будынак зусім не надаецца на музей, калі б нават меў бы гэта быць і беларускі музей („Вельмі важнае” Івана Кірызюка, „Ніва” ад 30.01.83 г.). Не трэба казаць, чаму. Забеспячэнне перад пажарам (і не толькі) каштавала б больш, чым вартасць самога будынка.

Будаванне музея ў Белавежы – гэта таксама не найлепшае рашэнне. У прыезджых будзе ствараецца ўражанне, што беларусы жылі недзе каля Белавежы, у пушчы, зусім даўно і асталося па іх некалькі экспанатаў у гэтым музеі.

Думаю, што трэба каб музей паўстаў, але як жывы элемент беларускай культуры ў Польшчы. Існаванне музея – гэта толькі збор экспанатаў мінулага. гэта таксама сведак непарыўнасці гісторыі народа. Такі музей павінен паўстаць у Беластоку і нават не таму што ў ім жыве вялікі працэнт беларусаў, але таму, што Беласток ёсць і будзе важным цэнтрам культуры. Ці музей трэба будаваць ужо цяпер, заўтра? -Так, трэба, але ці напэўна заўтра? Не лепшай справай на цяпер было б, каб забяспечыць і зрабіць даступным, напрыклад царкоўнае будаўніцтва, мастацтва і т.д.? – Не ведаю, ці зроблена поўная інвентарызацыя ўсяго каштоўнага для культуры, што знаходзіцца ў цэрквах? Бо чаму можна купіць старыя іконы і крыжы за цяжкія грошы ў гандляроў на “перскім таргу” ў Гданьску?

А так папраўдзе, то на першы агонь павінна ісці справа стварэння ў Беластоку Беларускага інстытута культуры і гаспадаркі, вакол якога і ў якім быў бы і музей, і можа, беларускі тэатр – чаму не? і друкарня, ў якой складалася б беларускае друкаванае слова, і настаўніцкая школа, рыхтуючая настаўнікаў беларускай мовы (малазрочныя былі кіраўнікі беларускай асветы, што дазволілі ліквідаваць адзіную ў Польшчы такую школу ў Бельску Падляшскім), і ўсё, што звязана з беларускай культурай.

12 чэрвень 1983 г.

# „МАЕ ДУМКІ ПРА НАС”
# (П. Байко, „Ніва” № 20)

Колькі ж можна пісаць аб тым самым і які будзе эфект ад гэтага пісання? Хоць, думаю, якісь там след у памяці застаецца. А так хацелася б, каб апрача словаў пісанне было як чарадзейсная палачка – датыкаеш і слова ў рэчаіснасць пераходзіць.

Так, так, Ул. Сідарук, – вы пагневаліся на ўвесь свет („На раздарожжы” – „Ніва”, № 21 ад 15.05.83) і якія канкрэтныя прычыны, якія не дазваляюць вам пісаць – а пісаць трэба і не толькі пісаць, а крычаць! – Чаму не?! Бо хто будзе гэта рабіць, калі ўсе зашнуруюць свае раты.

Пабываў я на Беласточчыне не так даўно, некалькі тыдняў таму назад.

Прыглядаўся, у чым праяўляецца „беларускасць” на маёй бацькаўшчыны. Так на першы погляд – ва ўсім! І ў нічым!

У нічым таму, што гэта краіна падобная на ўсе іншыя, якіх многа на свеце, дзе жывуць людзі, працуюць, кахаюцца. адпачываюць.

Ва ўсім, бо Беласточчына гэта краіна цудоўная сваёй манатоннай раўнінай і, як пісаў А. Барскі, няма другой такой на свеце!

Цікава, што тую іншасць ствараюць людзі, а не прырода, і сімбіёз людзей з прыродай тут споўніўся поўнасцю. Тут беларускасць на працягу стагоддзяў адціснула свой след. Але цяпер?

Не эфект злой волі быў прычынай ліквідацыі беларускай эстраднай групы “Лявоніха” ў Беластоку (“Патрэбныя дзеянні”, „Ніва” № 18. 1983 Ал. Баршчэўскага). То быў эфект погляду, што Польшча з’яўляецца дзяржавай адной нацыянальнасці. Думаю, што погляд такі (палітыка) не многа змяніўся ў перыяд 1980-83 г. і пакуль не зменіцца, намаганні беларусаў, напрыклад, на пашырэнне навучання беларускай мовы ў школах ці іншыя справы, нічога не дадуць. Гэта будуць намаганні для ўспакаення свайго сумлення – й толькі.

А. Баршчэўскі пастулуе рэактываваць этнаграфічны музей у Белавежы. Пісаў я аб тэтым (адрасатам майго пісьма не была „Ніва” а ГП БГКТ). што стварэнне ад падстаў музея ў Белавежы – гэта не добрая думка. Трэба пабудаваць будынак адпаведны, бо ў ім мае быць музей! Само забеспячэнне ад пажару і зладзеяў будзе шмат каштаваць, не кажучы ўжо аб коштах будынка і іншых справах. Не ведаю, чаму ўсе так пры тым упіраюцца.

Музей – гэта не толькі музейныя экспанаты, гэта навуковае месца, жывое, яно павінна ўносіць новае ў беларускую культуру.

Не разумею, чаму не стварыць , бы цэнтр беларускай культуры ў Беластоку? Ніякая вёска ніко лі не была такім цэнтрам, я такой не ведаю, хіба што пад увагу возьмем племянную грамадскасць. А беларусы выйшлі ўжо з гэтай формы арганізацыі, хоць некаторыя яго прадстаўнкі думкаю сваей сядзяць у даўнемшым.

10 ліпень 1983 г.

# ПРА СТУДЭНЦКІ РУХ

Сэрца расце, калі студэнцкая моладзь не забываецца пра сваё беларускае паходжанне („У беларускім студэнцкім руху” – „Ніва” 12.VI.1983 г.) і хоча „дзейнічаць у духу братэрства і пашаны культурных дасягненняў нацыянальнасцей і этнічных групаў. якія пражываюць на тэрыторыі ПНР”. Так трымаць – а не будзем толькі наракаць. Добра здарылася, што беларускія студэнты маюць сваю форму арганізацыі, калі нават будзе гэта і ЗСП. Гэта ўжо і так шмат, але хацелася б, каб было лепш і больш.

Чаму беларуская моладзь, не толькі студэнцкая, не можа мець сваёй арганізацыі ў Польшчы? Не ведаю, можа быць, ў БГКТ ёсць маладзёжная .секцыя – і то была б задача для яе: разварушыць маладзёжны рух на месцах. Моладзі не можна пакінуць самой сабе – студэнты неяк з тупіка выйшлі, а што з рэштай?

Рада культуры студэнтаў беларускай нацыянальнасці будзе мець свой орган друку „Сустрэчы”. Гэта бадай добра, але не зусім. Так на добрую справу то „Сустрэчы” сустракалі б невялікую колькасць беларускіх студэнтаў. І чаму гэтая газета не мела б быць газетай моладзі не толькі студэнцкай? З інфармацыі, змешчанай ў „Ніве” ад 12 чэрвеня 1983 года вынікае, што студэнты маюць ужо ўсё „заклепанэ” – значыць, газетную паперу, друкарню і г.д. Калі так, то ці не далучыць „Сустрэчы” да „Нівы”, як аўтаномны дадатак?

І яшчэ некалькі словаў да рэдакцыі. У „Ніве” не заўважаецца літаратурных (і не толькі) рэцэнзій. Можа таму, што слабы выдавеці рух, і што беларуская кніжка чакае 10 год свайго другога нараджэння (першае, то калі ствараўся рукапіс). Друкуюцца, кароткія то кароткія, але друкуюцца. вершы, апапяданні – і ніводнага слова каментарыя.

Думаю, што “Ніва” павінна змяшчаць усялякія інфармацыі аб культурным жыцці беластоцкага асяроддзя: што варта ўбачыць, паслухаць, прачытаць, куды і калі пайсці, каго наведаць? Тэрэса Кжэмень піша ў „Ту і Тэраз”, што ў Беластоку з культурным жыццём не найгорш. а ў „Ніве” на тую тэму нічога няма, як бы „Ніва” была адарвана ад зямлі, на якой існуе. Ведаю. што на некалькіх старонках „Нівы” цяжка ўсё змясціць, але калі ёсць што змяшчаць, то гэта і ёсць ужо аргумент за павелічэнне колькасці яе старонак.

24 ліпеня 1983 г.

# АДГАЛОСКІ НА АДГАЛОСКІ

Нельга не дакінуць да таго, аб чым пішуць іншыя. І так выходзяць мае „Адгалоскі”. Цешыць, што хтосьці іх чытае, хоць па адгалосках на адгалоскі, можна сказаць, што такіх нямнога.

Возьмем карэспандэнта „Нівы”, белавежца П.Байко, які піша, што ён „...нязгодны з М. Куптэлем, каб цэнтралізаваць нашыя культурныя аб’екты ў адным месцы, г.зн. у Беластоку”. Аб’екты – „павінны быць рассеяны па ўсёй той тэрыторыі, дзе жывуць беларусы.”

На пачатак трэба дагаварыцца, аб якіх аб’ектах гаварым. -Калі аб тых, якія ўжо існуюць, то я не пісаў, каб іх перанесці ў Беласток, — гэта фактычна было б смешна. Але калі гаворым аб тых, якія маюць быць пабудаваны, я думаю, што беларусы, павінны мець свой беларускі дом (ці адзін і ці толькі ў Беластоку? — гэта іншая праблема), то П. Байко мабыць згодны са мною, што ён павінен быць пабудаваны ў Беластоку і то як найхутчэй трэба за будову ўзяцца!

Будуюць у Беластоку праваслаўную царкву. Ці беларусы не могуць сфінансаваць пабудову беларускага дому? Хтосьці скажа, што беларусы і праваслаўныя гэта адно. Я згодны з тым, але дом, у якім знайшлося б месца для „Інстытуту культуры і гаспадаркі “,– так, „і гаспадаркі” – сельскай, усё ж на Беласточынне такога няма), гэта тое, об чым я якраз пісаў.

П. Байко піша, што аб’екты павінны паўставаць там, дзе жывуць беларусы. У Беластоку, значыць, яны не жывуць? Усе зрабіліся палякамі? Як жа ж гэта? Можа фактычна я памыляюся. Тады і рэдакцыю „Нівы” трэба перанесці недзе, можа ў Махнатае, менш слаўнае сяло, чым Беловежа, але ўсё ж такі вялікае і нябрыдкае, і Г. Марозу будзе блізка!

Цэнтралізацыя, дарагі сябра, нічога не спустошыць. Цэнтралізацыя – гэта пачатак чагосці большага, як паказвае гісторыя кожнага народа. Ці Варшава не ёсць цэнтрам культуры для ўсяе Польшчы? Ёсць! А ці няма культуры ў іншых месцах. Ёсць!

28 жніўня 1983 г.

# ЯКАЯ „НІВА”

Вартасць матэрыялаў, якія змяшчаюцца на 11 старонцы „Нівы”, можа і не вялікая („Адвечнае пытанне як пісаць?” – „Ніва” № 32). але ці вялікую вартасць мае „адгалоска”, падпісаная „Крыніца”? Па-першае, напісана без логікі. „Крыніца” піша: „Некаторыя пішуць г.зв. палемікі, распісваюцца, каб стаць на свечніку гадовага карэспандэнта” (што такое гадавы карэспандэнт – не ведаю)..

„Крыніца” павінна ведаць, што няма праблемаў зусім адназначных. Павінна ведаць, што там дзе сціраюцца погляды, там узнікае новае – гэтакае права дыялектычнага развіцця як народаў, так і прыроды. Шкода, што трацім час і энергію на прыпаміннане таго, што і так яснае, замест заняцца чымсьці карыснейшым.

Можна было б цэлую прэтэнзію „Крыніцы” патрактаваць коратка: за якасць змешчаных у газеце матэрыялаў адказывае, калі не памыляюся, галоўны рэдактар. Можна заўважыць, што „Ніва” ў немалым працэнце складаецца з заметак карэспандэнтаў. А што не ўсе бываюць Маўчунамі і Байко, то маем такі вобраз, які маем.

Ці не трэба клапаціцца пра якасць газеты? Трэба. І не толькі газеты. Рэдакцыя „Нівы” звяртаецца да чытачоў, каб напісалі, якую хацелі б бачыць „Ніву”. Карыстаючыся гэтым запрашэннем, хацеў бы і я дакінуць сваіх некалькі скромных слоў. „Ніва” не змяшчае аб’яў – не ведаю, але ведаючы клопаты з самафінансаваннем, думаю, што магла б дафінансоўваць сваю дзейнасць, зарабляючы на аб’явах.

Першая старонка павінна мець нейкі важны (так думаю) артыкул, які гаварыў бы аб праблемах „функцыянавання” беларусаў у Польшчы як у сваёй дзяржаве, які прадстаўляў бы галоўныя ідэі БГКТ. Значыць. была б, кідалася б у вочы галоўная вядучая старонка „Нівы”.

Другая старонка можа быць такая, як ёсць, з той увагай, каб у спартыўнай „Ніве” змяшчаць спартыўныя інфармацыі з Беласточчыны - здаецца мне, што ніхто не падае вынікаў футбольных змаганняў класа Б і Ц.

Трэцяя старонка была б прадаўжэннем першай, а ў нізе – пастаянные фельетоны – каментарый усяго, што дзеецца ў дзяржаве, а найбольш на Беласточчыне. Апошнія старонкі ў такой форме, як ёсць. Трэба было б выкрыіць месца на аб’явы і на інфармацыю: што найважнейшае на культурнай ніве ў Беластоку (і што можна паслухаць у беларускай перадачы польскага радыё). Інакш кажучы, інфармацыйную частку перанясці на апошнія дзьве старонкі, прытым скарачаючы старонку гумару.

Ці многа змен прапаную? На мой погляд, не, а за гэтыя змены гатоў я плаціць не восем, а можа дзесяць ці пятнаццаць злотых за адзін нумар.

25 верысня 1983 г.

# ЯКІЯ МЫ ЛЮДЗІ

Махнатае – гэта вёска вялікая, знаходзіцца недалёка ад чыгункі і ў дзесяці кіламетрах ад Гайнаўкі. Землі тут добрыя, з праведзенай дрэнацыяй і меліярацыяй. А як землі добрыя і людзі рабочыя, то яны і багата жывуць. Відаць гэта па мураваных хатах, жалезных платах, ці па колькасці гаспадарчых машын.

Махнацкая моладзь часткова працуе і вучыцца ў Гайнаўцы, вялікім у тым раёне прамысловым горадзе, часткова гаспадарыць разам з бацькамі на гаспадарцы. Рослая яна, добра (як на крызіс) апранута і адкормлена. Можна сказаць, што крызіс не крануў вёскі. Думаю, што гэта правільна, што людзі бароняцца перад крызісам.

Ёсць і некалькі некарысных рысаў у вобразе вёскі, прадстаўленай вышэй. Багацце стала амаль адзінай мэтай жыцця і захадаў, ды гэта не толькі ў беларусаў. Бо як растлумачыць факт, што немагчыма купіць кубка малака для дзіцяці, малака свежага ад каровы. Людзі і самі яго не п'юць – усё малако носяць у злеўню.

Ёсць на вёсцы многа людзей на пенсіі, якія не трымаюць кароў, а малако для іх жыцця важнае. Ёсць у Махнатым і клуб селяніна, у якім прадаюцца розныя прадукты, патрэбныя сялянам, акрамя малака. З гэтага месца ад імя ўсіх „безмалочных" махнацкіх пенсіянераў кланяюся гайнаўскаму прэзасу ГС, каб аднак споўніў просьбу людзей і накіраваў малако ў махнацкі клуб.

Шкада, што клуб, пабудаваны махнацкай моладдзю, вядзе толькі гандлёвую дзейнасць. Дзе знаходзіцца махнацкі гурток БГКТ? Моладзі ў Махнатым многа і няма каму накіраваць яе на культурную дзейнасць. Калісь школа і настаўнікі выконвалі цэнтральную ролю ў ажыццяўленні культурнага жыцця на вёсцы. Цяпер школа занялася толькі навучаннем і аказваецца, што людзі акрамя багацця не маюць іншай мэты ў жыцці. Хтось можа скажа, што не туды кірую стрэлы, але штось у гэтым ёсць, што кожны цяпер толькі да сябе грабе.

2 кастрычніка 1983 г.

# ЯКІЯ ВЫ ПАЭТЫ

Такія паэты як Якуб Колас ці Янка Купала паяўяюцца ў жыцці народа адзін раз. А хацелася б, каб паявіліся цяпер, ды сярод беларусаў у Польшчы. Патрэбен нам паэт, які завяяваў бы беларускіх людзей сваімі вершамі, думкамі, ідэяй жыцця ў сацыялістычнай краіне.

Хацелася б, каб быў гэта чалавек з гарачым сэрцам, які згуртаваў бы вакол сябе найлепшыя сілы народа. Які ўсё ведаў бы. З якім можна было б параіцца ў тых ці іншых справах, важных для нас, беларусаў.

Можа хтось сказаць, што мы такіх маем. Толькі ж я пытаю чаму іх сэрцы такія астуджаныя? Чаму ў тых маладых „белавежцаў", якія друкуюцца на літаратурнай старонцы, такая ніякасць, што стаіць „на магілах сонцаў і не дыхае"?

Эх, белавежцы вы, белавежцы!. Дзе ваш аптымізм? Якуб Колас сваім аптымізмам дзяліўся з цэлым народам, ды народам не малым! Раздаваў яго на лева і на права каб маглі беларусамі звацца. Што ж з вас за паэты, якія ўцякаюць ад "шаўкавістых шэптаў старых дрэў?" І баяцца „выразнасці сваяго партрэту"?

Падумайце хоць хвіліну – вось ён, духоўны прадстаўнік народа баіцца выразнасці сваяго партрэту. Толькі шукай вяроўкі і разглядайся за гакам.

На шчасьце, заўсёды можна падтрымацца аптымізмам Коласа ці Купалы.

Ідзіце паэты ў народ, а не ўцякайце ад яго. Усё ж там знаходзіцца невычэрпаная крыніца вашай творчасці. Ідэйнай праграмай, між іншым з'яўляецца прынцыпы, прадстаўленыя А. Баршчэўскім у "Нашаніўскай пары".

Можа тады і „Ніва" будзе чытацца. Тыраж у 3800 экземпляраўраў падскочыць да 10.000 найменш. 3800 экзэмляраў на 250 тысяч беларусаў?! Анальфабэтаў ці што?

16 кастрычніка 1983 г.

# ШТО ДОБРА. ШТО КЕПСКА

Паязды, якія курсуюць на трохвугольнай чыгунцы з прадаўжэннем аднаго адрэзка да Беластока, з’яўляюцца жыццёва важным сродкам спалучэння для ўсіх людзей у трохвугольніку Гайнаўка-Бельск-Чаромха. Ёсць магчымасць пад’ехаць у Гайнаўку ці ў Бельск, прадаць, купіць і вярнуцца спакойна на абед дадому. Дзякуючы чыгунцы і блізкасці прыпынку Старога Беразова з дзвюх вёсак зрабілася адна. якой і назву трэба было б прыдумаць новую (?).

Алв не на гэта хачу звярнуць увагу чытачоў, у тым ліку і адпаведных чыгуначных улад. Людзі, пэўна, прывыклі да бруду вагонаў, якімі ездзяць. Сядаеш у такі вагон і, калі не будзеш асцерагацца, будзь пэўны, што касцюм трэба будзе аддаць у чыстку. Нават паглядзець на слаўную бельскую раўніну не можаш: вокны не прапускаюць зроку — так залеплены брудам. Цікава, што нехта бярэ грошы за парадак і чысціню на чыгунцы і ў вагонах! Пытаю: за што? Не мае ніякага сораму, беручы за нязробленую працу! А дзе начальнікі, якіх на чыгунцы не бракуе? А можа, як і ў выпадку разваленых станцый у Бельску і Гайнаўцы, чысціня ў вагонах з’яўляецца для іх чыстай фанабэрыяй?

23 кастрычніка 1983 г.

# АБ РАНАХ ДУШЫ

Некалькі разоў чытаў я „Аб ранах душы” – Алеся Барскага („Ніва” № 35). Нібы ўсё ў парадку, ва ўсім, аб чым піша А. Барскі, ён праў. Які ж беларус не падпішацца дзвюма рукамі пад сказамі: „Без захавання жывой роднай мовы не можа быць гутаркі аб захаванні беларускай нацыянальнасці і свядомасці”. Аднак жа затрымаемся над адным словам гэтага сказа – “жывой”. Алесь Барскі закладае што беларуская мова беларусаў Беласточчыны ёсць жывая. Гэта не зусім праўдзівае і таму лякарства, якое прапануе Варскі, не тое.

Мне здаецца, што мова з’яўляецца жывой, калі ад маленства мы патрабуем яе, каб выказаць свае думкі, каб чытаць, гутарыць, пісаць, слухаць на сваёй роднай мове. Яна з’яўлясцпа жывой, калі багацее, змяняецца, калі на ёй паэт апісвае „родны кут”, калі я яе бачу ў назвах вёсак, гарадоў, лясоў, рэк і г.д.

Ці ўсе гэтыя элементы „жывой” мовы ў нас выступаюць? На жаль, толькі некаторыя і таму яна занікае.

Што можна купіць у кіёску на Беласточчыне акрамя „Нівы” што было б напісана на беларускай мове? Беларускія кніжкі пісаныя аўтарамі. жывучымі ў Польшчы, можна купіць у ГП БГКТ у Беластоку. Падумайце – кніжка, газета сама павінна ўлазіць чытачу ў рукі.

Далей. Дзе і калі можна пачуць беларускую мову? Усе навокал карыстаюцца польскай, нават на вясковых сходах (хоць цяпёр яны зусім заніклі), ці дажынках. Прыслухоўваўся я ўсім выступленням розных прадстаўнікоў на дажынках у Махнатым, апісаных рэдактарам Рудчыкам у „Ніве”. І што? Не чуў аднаго беларускага слова. А на трыбуне стаялі ўсе беларусы, апрача можа некалькіх асоб. Узяўся М. Гайдук апісваць беларускую гісторыю Беласточчыны — гэта вельмі добра.Толькі на той Беласточчыне няма ніводнай беларускай назвы, напісанай беларускай мовай, акрамя табліцы на будынку БГКТ у Беластоку. Пытаў я ўжо аб тым, чаму не можа паявіцца больш такіх табліц? Паявіліся б можа тады і людзі, якія праз тэлефон пачалі б гаварыць адзін з другім на сваёй роднай мове. Няма ніякіх перашкод, каб дырэктары белліцэяў у Гайнаўцы і Бельску на пачатак павесілі таблііцы, напісаныя пабеларуску.

Дагаварыцца ва ўсіх гэтых справах бадай можна, як беларус з беларусам.

Ініцыятыву павінна мець БГКТ і не толькі ініцыятыву – праграму дзеяння таксама, а за сабой цэлую армію маладых дзеячоў.

20 лістапада 1983 г.

# НЯМА БЛАГОГА БЕЗ ДОБРАГА

Добра, што прыпамінае беларусам некаторыя факты Юрка Латышонак („Ніва”. № 22). З тваяго адгалоска не вынікае, ці ты чалавеча, ужо пажылы ці маладзенькі. Але калі ты сягнуў так далёка ў гісторыю (XVI стагоддзе) то думаю, нават бачу сядзіш ты на лавачцы перад хатай і грэешся на летнім сонейку ды ўспамінаш з жалем мінулае. І хочаш, каб мінулае, як ты называеш факты, было мэтай для маладых, для іх жыцця, зместам будучыні. Думаю я, а ты аб гэтым ведаеш, што мінулае проста мінула і ніколі не вернецца. Аднак таму мы аб ім не забываем, каб не адкрываць свету ад пачатку ў кожным чалавечым жыцці. Пэўна, што многае са спрэчках Дзядзькі Кваса з Маўчуном не вынікае, але хопіць для свядомасці і тая маленькая крушынка. Пісаў я ўжо аб тым, што новае паўстае, кялі змагаюцца два процістаўныя погляды. Гэта ж падстава дыялектыкі.

Есць і факты іншыя. Беларускую мову вывучае ў школах тры разы менш дзяцей цяпер, як 15 год таму назад, — гэта факт першы. Вучні беларускіх ліцэяў беларускай мове вучацца па гэтых жа падручніках, на якіх і я вучыўся, а гэта было больш за дваццаць годоў таму назад, – факт другі. Карыстацца канстытуцыяй і з яе правоў трэба ўмець. Наштодзень, дзякуючы тэлебачанню, радыё, газетам, зносінам з гарадскімі, наша беларуская вёска змяняецца, тое відаць голым вокам, і гэта факт наступны. Як весці раз’ясняльную працу, пра тое ў кніжках не напісана. Таму і добра, што пра гэта спрачаемся, скачам нават адзін другому да вачэй. Беларускай справе гэта не пашкодзіць, а дапаможа ёй, дарагі чытач. Шкада, што надта мала або зусім не вядуць палемікі на старонках „Нівы” ці іншых часопісаў нашыя інтэлектуалісты або дзеячы ці паэты. Мы ж маем іх не мала. Няхай скачуць, сабе да вачэй, мо справы рушаць наперад. А можа яны патрапяць толькі складаці вершы? Праўда, гэта многа, але наша справа патрабуе большага. Думаю, што ад такога прыбытку галава будзе зусім лёгкай. Прыбытку ідэй ніколі не замнога.

Добра, што „Ніва” змясціла састаў новага Галоўнага праўлення БГКТ. Складаецца яно з 45 чалавек. Калі за два тыдні ніхто з іх не адклікнецца, то буду выцягваць адзін іхні нумар з шапкі і выклікаць да дошкі. Не, не да дошкі, а ў „Ніву” —кажы, брат, што думаеш, як бачыш праграму X з’езда ў практычнай рэалізацыі, чым займаешся ў сваім гуртку, перадай іншым свой вопыт, дасягненні, папярэдзь аб памылках і г.д.

Я заўсёды, паўтараю; нямя благога без добрага.. Нават такія адгалоскі, якія замыкаюць рот палемістам, таксама патрэбныя, бо адкрываюць злосць у іншых.

1 ліпеня 1984 г.

# БОЖА БАРАНІ ПЕТРУЧУКА!

Нешта тут Васіль Петручук паблытаў („З маёй званіцы” – 5.08-1984 г.) пішучы, што без філасофіі, так памужыцку, зыходзячы з „крыўды бліжняга” хоча знайсці праўду.

Кожны хоча знайсці праўду. А так, па-мужыцку – гэта новы шлях да яе?! Вядома, – чытаем далей, – што тым бліжнім з’яўляецца крыўджаны чалавек, і то крыўджаны лайдакамі, што працаваць не хочуць. А тых лайдакоў сто пяцьдзесят тысяч усяго. Васіль Петручук знерваваўся праз іх, гледзячы тэлевізію, і ставіць два пытанні. Паўтараць іх не буду, але справа ў тым чаму народ корміць добраахвотна лайдакоў і хто ім дае так многа мяса?

З вывадаў В. Петручука вынікае, што лайдакоў дарма народ не павінен карміць. Іх (лайдакоў), як відаць, у народ не ўключае.

Даўным-даўно таксама быў народ і нявольнік. Трохі пазней – народ і мужык, народ і негр. А цяпер народ і лайдакі. Можна і так падзяліць чалавечы род, чаму не. Не хочаш працаваць, значыць „лайдачыцца табе хочацца” – іншай альтэрнатывы няма. В. Петручук, пэўна памятае пядзесятыя гады і агітатараў, якія схілялі сялянскі народ да новага, да калектывізацыі візіяй лёгкага жыцця:

– Нічога не будзеш брат рабіць, – гаварылі. – Многа будзеш есці, а кожны дзень будзе табе святам.

Цяпер В. Петручук громіць тых, хто паверыў у гэта і называе іх лайдакамі. У В. Петручука лайдаком з’яўляецца і той, хто не хацеў хадзіць пяшком, і выдумаў кола са спіцамі, ровар, самаход, самалёт, тэлефон (замест голуба), трактар (замест каня), малацілку (замест цэпа) і г.д.

Усе яны павінны працаваць ад світання да ночы, а не лайдачыцца. Філасофія ім толькі ў галаве, калі народ, цяжка то цяжка, але выходзіць з крызісу.

Чаму В. Петручук не чапляецца да тых, якія раненка спяшаюцца да работы, падпісваюць гэтак званую „лісту” і нічога (нічагуткі) усе восем гадзін не робяць. Няхай В. Петручук гляне трохі далей тэлевізара, дзе ў белы божы дзень спяць спакойненька „працаўнікі”. Яны таксама свае 10 дэкаў мяса з’ядаюць. А такі філосаф – сядзіць і толькі думае – не прадукуе, напрыклад, цвікоў, а думае. Яго таксама трэба пазбавіць мяса. Ён проста злодзей. Каб яшчэ сядзеў у бочцы, як Дыяген, а то не – яму патрэбны блок, выгады, электрычнасць, машына і прыгажуня побач.

Чалавек у сваёй гісторыі перарабляў і мужыцкую філасофію ў найгоршай постаці, калі проста “дармаедаў” ліквідаваў фізычна (не сягаючы далёка

— Пол-Пот у Камбоджы). Пакуль што В. Петручук людзей, якім не хочацца рабіць, называе лайдакамі, не ўключае ў народ, ганяе іх да лапаты. Пакуль што. А калі нехта, вось так для жарту, скажа некаму, нейкай супрацьлайдацкай брыгадзе, што сёння грамадзянін, які піша „З мае званіцы" гультайнічае, то барані Божа В. Петручука і яго мужыцкую філасофію.

16 верасень 1984 г.

# ПУСТЫНЯ

Васіль Петручук піша, што прычынай паўставання пустыні на месцы былых зялёных лугоў і лясоў з’яўляецца цывілізацыя. А я думаю, што наадварот – адсутнасць яе.

Прыпомнім: у пяцідзесятыя гады – панаваў магутны лозунг поўнай меліярацыі. Дзе быў які лужок, уваходзілі меліяраны, капалі равы – вада сцякала у далёкае мора.

Як піша Васіль Петручук, паспяхова працягваюць тую ж лінію і цяперашнія „навукоўцы”. Дзе не глянь, усюды крызіс, толькі ў галіне меліярацыі працвітанне.

Старэйшыя жыхары Махнатага, Старога Корніна, Сямівалок, а нават Гайнаўкі, помняць вялікае (каля тысячы гектараў) балота, якое называлася альсом. Цяпер у тым месцы лугі. Калісь гэта быў рай для птушак, рэзервуар вады для цэлай аколіцы. Вада тут ніколі не высыхала. Летам вільготнасць паветра вялікая. Можна было ўвесь дзень без перапынку працаваць і чалавек не адчуваў цяжару спякоты. Асаблівы мікраклімат ствараў карысныя ўмовы для развіцця расліннага свету.

Безразумнасць усё гэта знішчыла. Цяпер здараюцца такія гады, калі дождж ідзе толькі ранняй вясной і позняй восенню, і што назбіраецца то сцячэ равамі ў мора.

Пішу аб гэтым махнацкім альсе каб перадаць будучым пакаленням вестку аб тым, якая была калісь прырода на Беласточчыне. Бо без вады „пустыня” настае вельмі хутка. Гэта зусім рэальнае, як піша Петручук.

А можа ўласнымі сіламі далося б крыху тых равоў засыпаць? Капіталаўкладанні невялікія, а карысць вялікая вельмі.

23 верасень 1984 г.

# НЕ ТОЕ ЛЯКАРСТВА, НЕ ТОЕ ЛЯЧЭННЕ

На воплескі трэба заслужыць, але іх пакуль што не будзе. Трэба прызнаць, аднак, Івану Максымюку („Сустрэчы” – 1984 г.), што ён мае рацыю, сцвярджаючы, што „ідзе новая маладая змена”. Трэба цешыцца, што маладые возьмуць у свае рукі БГКТ. БГКТ і іншыя арганізацыі патрабуюць маладых, адукаваных і ахвотных да працы людэей.

Але дарагія, таму, што шчырага сэрца жадаю вам вялікіх поспехаў у гэтай працы, хачу вас папярэдзіць і паставіць вам некалькі пытанняў, якія трэба паставіць, калі дзейнасць ваша мае прыносіць карысць справе.

Пытанне першае. Чаму з такой упэўненасцю пішаце што „будучыня беларускага грамадска – культурнага руху ў Польшчы вырашаецца сёння па-за рамкамі гэтае карціны, а менавіта ў студэнцкім асяроддзі?”

У студэнцкім асяроддзі можаце развіваць культурны рух, толькі што гэта мае супольнага з грамадствам? Ці некалькі дзесяткаў беларускіх студэнтаў гэта ўжо беларускае грамадства? А беларускае грамадства фактычна патрабуе соцень і тысяч адданых справе дзеячоў і інструктараў. Рамантызм маладых здзіўляе, але нічога новага ў ім няма — дзевятнаццатое стагоддзе мінула даўно, перад намі трэцяя тысяча гадоў. І не кажу. што рамантызм непатрэбны. Патрэбны, але ці толькі ён адзін?

Не здзіўляе вас факт, што грамадства, у лік якога і я ўваходжу, у кастрычніку гэтага года (не ведаю, калі вышаў першы нумар „Сустрэч” з 1984 года) першы раз сустрэлася з “Сустрэчамі”. Не пішаце, які тыраж „Сустрэч”, але як будзеце даходзіць да грамадства, калі адракаецеся ад „Нівы” і структур створаных БГКТ?

Жывеце вы, студэнты, у ізаляваным асяроддзі, далёкім ад штодзённай рэчаіснасці. Так, так! А каб весці дзейнасць, дык самой ахвоты мала, патрэбныя матэрыяльныя сродкі. А іх нам (вам) ніхто не дасць, трэба намагацца, каб пад эгідай БГКТ, стварыць гэтую матэрыяльную базу, выкарыстоўваючы магчымасці права. Бо хто ж сфінансуе дзейнасць у шырокім сэнсе, калі не самі беларусы і пры дапамозе дзяржавы – а тады не згіне наша культура.

Аб усім гэтым пісаў я свайго часу ў „Ніве”, дзесь там (не вядома, дзе) мае думкі трапілі да кагось там (каго?). І што? І нічога. А вы аднова адкрываеце Амерыку.

Наша справа не залежыць толькі ад нас, беларусаў. Залежыць ад агульнай палітычнай сітуацыі ў Польшчы, ад спрыяючага нам клімату.

Пытанне другое, якое трэба абавязкова паставіць. Якія факты гавораць

аб тым, што „беларуская нацыянальная меншасць наогул адчувае сябе духоўна адчужанай ў сваёй краіне”?

Беларуская нацыянальная меншасць жыве спакойна на вёсках і нават не думае такімі катэгорыямі. Беларускае асяроддзе ў горадзе, быць можа адчувае сябе “духоўна адчужаным”. І калі так, то чаму не шукае падтрымкі ў “Ніве”, БГКТ і чорт толькі ведае , дзе яшчэ? А можа скажаце, што шукае, то чаму беларускія клубы наогул свецяць пустэчай, а праўду кажучы, то калі да іх заглядаць, калі жыццё складаецца з працы і штодзённай мітусні. Колькі часу астаецца на “культуру”? Пэўна, што “Ніва” духоўнай падтрымкі не дае, але ці напэўна не дае, калі чалавек (значыць чытач як і я) чакае з нецярплівасцю панядзелка, у які яна даходзіць да яго. “Ніва” мае праблему з запаўненнем зместам і тых старонак, з якіх складаецца. Не пішуць нашы інтэлектуалісты, а ўжо тэкстаў студэнтаў я, мусіць і не чытаў. Ці не трэба павышаць яе якасць – трэба, бо праз якасць можа яна, значыць “Ніва”, пашырыць колькасць сваіх чытачоў.

Пытанне трэцяе. Чаму існаванне адной культуры звязана з барацьбой гэтай культуры з другой? Мне здаецца, што культуры наогул барацьбы між сабой не вядуць, так як вядуць яе, напрыклад спартыўныя каманды. Барацьбой займаецца палітыка, а культура з’яўляецца толькі яе вытворнай. Культура не мае нацыянальнага характару, культура ў шырокім сэнсе. Гэта значыць, ёсць нацыянальная культура, у тым ліку і беларуская, але яна ёсць настолькі беларускай культурай, наколькі мае вартасць агульначалавечую і гуманныя корані.

Адным словам, калі б на Боласточчыне з’явіўся наш беларускі Гарцыя Маркэс, то, верце, дзякуючы яму і яго творчасці, і добрым перакладам беларуская культура была б вядома ў свеце, а не была б вядучай таму, што перамагла іншую.

Высакамернасці вы, маладыя людзі, маеце многа, але трэба многа вучыцца і ўмець. каб звяргаць існуючую рэчаіснасць. Можна на развалінах старога будаваць новае, але хто будзс чакаць так доўга эфектаў новага. Скінуць з сябе дамінацыю польскай культуры можам тады, калі будзе існаваць беларуская культура. Асіміляцыя культур гэта адзінае, што можа нас чакаць, калі не праявім у кожнай галіне жыцця своеасаблівых кораняў, вынікаючых з традыцый і мінулага. Асіміляцыя культур чакае нас, калі беларуская культура не будзе раўнапраўна развівацца – беларуская культура, якая мае агульналюдскія корані.

Дарагія чытачы, прачытайце ўважліва сказ праграмы дзеяння з „Сустрэч”:

„Сваёй агульнаграмадскай актыўнасцю, накіраванай ці то на стварэнне

ўмоў для належнага развіцця новай беларускай культуры ці то на захаванне існуючай спадчыны, студэнты не толькі прадаўжаюць існаванне свайго народу, але – і гэта цяпер самае галоўнае – як яго лепшы, адукаваны слой, у працы ствараюць гурт душэўна незнявечаных беларусаў, якія на справу сваёй нацыянальнай прыналежнасці не глядзяць як на грэх ці божую кару".

Спрабуем перакласці на больш зразумелую мову змест гэтага сказа і пабачыць, якую мудрую думку ён мае. Студэнты сваёй актыўнасцю створаць умовы развіцця новай беларускай культуры, або лепш – створаць умовы для захавання існуючай спадчыны. Гэтае стварэнне ўмоў служыць прадаўжэнню свайго народа, а таму што з'яўляюцца яны адукаваным слоем (цікава ці поўны, ці пусты – пэўна поўны, бо адукаваны). А як адукаваны слой і малады, то на нацыянальную прыналежнасць не глядзіць як на грэх, ці божую кару. Усё гэта то „мова-трава", як кажуць палякі. Цэлая ваша праграма, мілыя студэнты, сведчыць аб тым, што вы „душэўна знявечаныя беларусы". Многа мелеце аб гонары беларуса, а не аб умовах яго існавання, а з тэксту відаць, што ўмоў яго існавання проста не ведаеце. Студэнты пасля некалькіх гадоў вучобы перастаюць быць студэнтамі і тады што, ужо не будуць „прадаўжаць існавання свайго народа". А яго прадаўжэннем зоймуцца іншыя студэнты і так будзе круціцца да поўнага адраджэння беларусаў. 0, маладая наіўнасць! Каб так было, як пішаце, то палякі сваёй дзяржавы не чакалі б сто пяцьдзесят год, а беларусы не існавалі б ад добрай сотні год. Аднак існуюць, хоць адукаваныя слаі былі не заўсёды. Справа існавання нацыянальнай свядомасці гэта складаная справа і не так проста гэта растлумачыць. Дык і не такога патрабуе лякарства і лячэння, якое прапануе нам студэнцкае аб'яднанне „Сустрэчы".

30 снежня 1984 г.

# ГЛЕДЗЯЧЫ З БОКУ

Не запішаш думкі, то ўцячэ, прападзе, бы маладыя гады. Не дагоніш. А як запісаць, калі тых думак мноства?!

Аднойчы восенню, едучы дадому, склаў я цэлы сюжэт апавядання. І што? Нічога. Апавяданне дагэтуль пішацца, а да вясны так блізка, як да суседкі за сцяною. Прычым тут суседка? Непрычым. Не ведаў бы, што жыве за сцяной, каб суседка ў любую пару дня і вечара не наведвала маю кватэру. Дзякуючы прыроднай ветлівасці жонкі, суседка ў нас амаль член нашай немалой сям'і.

Захацелася мне напісаць апавяданне аб вялікім каханні. Не ведаю чаму, але хто толькі бярэцца за пісанне, то піша аб каханні. А аб каханні напісана ўжо мора слоў. Не мора – акіян слоў. Што я магу даліць да гэтай стыхіі? Якою кашай запаскуджу густую ваду акіяна літаратуры аб каханні?

Як пісаць аб каханні чыстымі, крынічнымі радкамі? Ці так як піша Ян Чыквін:

"– Ты – цаца!

– І ты – цаца!

– Будзем кахацца?

– Давай, Каця!"

А можа звярнуцца па кансультацыю да творчай групы „Белавежа"? Па прозе, здаецца, кансультант Сакрат Яновіч.

Цяпер усе кансультанты. Усе. Як прайду праз школу пісання апавяданняў, тады паеду з групай на літаратурны пленер, буду „ўмацоўваць сяброўскія сувязі і паглыбляць кантакты", больш менш так, як робіць гэта Ян Чыквін з Кацяй (шчаслівчык!). Я за тым. каб паглыбляць! Пэўна, тады маё апавяданне выльецца ў раман. Раман аднак не трэба пісаць, бо хто мне яго надрукуе.

А можа ўзяць кансультацыю па паэзіі і

*"появітісь – втопітісь настояшчо встріэтітісь"*

(З. Сачко)

Тады не буду пытаць, чаму „замерла кроў у жылах", не будзем „аддаляцца ад сябе, як бяздомныя людзі" (Жэня Мартынюк). І ў кожнай „Ніве" будуць мае творы, як В. Шведа. Можа тады ўдасца мне выгрызці яго з літаратуры і самому ўзабрацца на Парнас?

14 красавіка 1985 г.

# НЕ МОДА

Чаму не хапае часу на рэфлексію? Як разабрацца, ці то жыццё так хутка ўцякае, ці час? Калі я чытаў апошнюю кніжку? „Полымя”, якое прынёс з клуба тры тыдні таму, ляжыць някранута. А колькі іншага залеглага чытання? І работы той хатняй, з-за якой, калі не зробіш, жонка пагражае разводам, а за прыклад ставіць суседа, які пастаянна нешта робіць, стукоча, грукоча.

А з другога боку спрабуйце нешта купіць, не пастаяўшы ў чарзе (хацеў напісаць у „калейцы”, але цяпер магу напісаць правільна: у чарзе, бо мне ўдалося пазычыць польска - беларускі слоўнік, які ў свой час быў перацэнены з 70 да 20 зл.)

Думаю, што гэта не мода на беларускасць сталася прычынай, што пішам пабеларуску і ганяемся ў пошуках слоўніка, каб правільна пісаць. Недзе чытаў, што чалавек думае „без’язычна” — значыць у думцы не карыстаецца канкрэтнай мовай. Можа гэта і праўда. Але я, едучы гадзіну часу з працы, чытаў з цыкла Слаеўскага „Шчуравіска” нарыс п.з. „Задух”. І якраз тады нарадзілася ў думцы вось гэтая рэфлексія, якую пішу. І усё гэта ў думцы складаў па-беларуску.

Адносна ж Слаеўскага. Калі аўтар, якога люблю чытаць (але і маю прэтэнзію да яго), пішучы многа пра Міцкевіча, не ўспомніў аніводным сказам, што нарадзіўся той на Беларусі – гэта несумленна. Гэта так, як бы хто пісаў пра Джозэфа Конрада – слаўнага англійскага пісьменніка – і не ўспомніў бы, што ён радзіўся ў Польшчы.

На шчасце, і мы з-пад хваста не ўпалі, – маем свайго Міцкевіча (Якуб Колас). Каб кола гісторыі інакш павярнулася, магло б быць двое беларускіх Міцкевічаў, або двое польскіх Міцкевічаў. Аб другой мажлівасці аж страшна падумаць!

21 красавікв 1985 г.

# ЗАЙЗДРАСЦЬ – БРЫДКАЯ РЫСА...

...Але што зрабіць, калі чытаю рэпартаж Веры Леўчук „Тыневічанкі на вялікай дарозе” („Ніва” ад 12.1.1986 года) аб хрысцінах тыневіцкага калектыву і зайздросны я, што гэтыя хрысціны не адбываліся ў Махнатым, што не быў хрышчаны харавы, ці танцавальны, ці нейкі іншы мастацкі калектыў з Махпатага!

Пісаў я аб Махнатым некалькі разоў і, пэўна, буду пісаць яшчэ не раз. Пісаў, што Махнатае не хіліцца да заняпаду, як, не вытыкаючы пальцам, Мастаўля-ны, аб чым піша В. Рудчык у той жа „Ніве”. У Махнатым моладзі многа. Моладзі таленавітай, прыгожай, вясёлай і адукаванай.

Калядныя песні на апошнія Каляды спявалі ўмела і прыемна было іх слухаць. Адным словам, ёсць база для стварэння калектыву ў Махнатым. Ёсць моладзь, пэўна, далучыліся б і старэйшыя, ёсць беларускія песні, ёсць клуб, месца, дзе можна спяваць. Пэўна, ахвота таксама ёсць, а не хапае проста арганізатара, які павёў бы звычайную культурную работу. Прыгледзьцеся затым адзін да другога, маладыя людзі з Махнатага, — якогась арганізатара напэўна знойдзеце.

А, можа, махнацкія настаўнікі памаглі б стварыць беларускі калектыў у Махнатым? І не таму гэты калектыў трэба стварыць, каб былы махнач зайздросціў тыневічанам, а проста трэба б стварыць яго для сабе і для іншых жыхароў Махнатага. Махнатае калісьці мела маладзёжныя калектывы. Думаю, што культурную традыцыю трэба аднавіць. Вы са мной згодны?

23 сакавіка 1986 г.

# ПРАЎДА

Героі апавяданняў Міры Лукшы расказваюць ёй, а за ею і нам сваю праўду аб жыцці. Інакш кажучы, апрача таго, што ўсё сказанае героямі, як сказаў бы логік: з'яўляецца праўдзівым, то героі расказваюць нейкую сваю праўду.

Не бывае гэтак добра, каб было добра ўсім. Тое ж самае і з праўдай. Для адных, напрыклад, жыццё ёсць праўдай, а для іншых тое ж самае жыццё праўдай ужо не ёсць.

Не думаю пісаць філасофскага доследу аб праўдзе. Задумаў я толькі крануць праўду, якую выказвае аб творчасці С. Яновіча Надзя Артымовіч („Ніва" з 7.X.1986 г.). Думкі Надзі Артымовіч прозай, чытаю бадай што ўпершыню. Трэба адзначыць, што паэтэса добра перадала свае думкі. Але кінулася мне, і то не адразу, а праз нейкі час, што не толькі С. Яновіч мяшае з балотам усіх „новабагацкіх" беларусаў, якія кінулі свае гаспадаркі ды перайшлі жыць у горад, але, Надзя Артымовіч таксама топча іх, пішучы, што „Гэты „аванс" ёсць трывяльны, часта з вульгарным сэнсам у ім (і пагардліва: „жытло, пасада, аўтамашына і што далей?")", дзе слова „аванс" адносіцца да пераходу беларусаў з вёскі ў горад.

Праўду піша А. Барскі, калі сцвярджае, што „кожны з пісьменнікаў мае сваіх літаратурных бацькоў". Мае іх С. Яновіч, і Н. Артымовіч, каб далёка не сягаць. У той пагардзе да авансу беларусаў, няхай сабе і ў дужках напісанай, чуецца рэха мінулага часу, калі беларус, пераходзячы ў горад, рабіўся „панскі", выракаўся нацыянальнасці, свае мовы, нярэдка і веры. Раней для беларусаў, якія жылі ў вёсках адрэзаных ад асветы і ад свету, было ўсё роўна, хто пануе: паляк, беларус ці рускі. І парадаксальна аднак, што, тое абмежаванне было захавальнікам усяго таго, што нацыянальнае. Доўгія стагоддзі беларускасць вясковага насельніцтва пратрывала ў непарушнай форме, хоць бы ў мове. Так, так наша мова – гэта чыстая старадаўняя беларуская мова.

І, пэўна, „белавежцы", таму баяцца, каб народ не кінуў вёсак, бо тагды загіне нават свядомасць нашай адасобленасьці. На той канве створаны сюжэты большасці іх апавяданняў: быць верным роднаму – гэта быць верным вёсцы, ў якой чалавек нарадзіўся і пражыў нейкую там частку свайго жыцця. Але на самай справе наша беларуская вёска змянілася як змянілася гарадское жыццё. Памаленьку новае выпірае старое з жыцця вёскі. Цяперашні селянін – гэта ўжо не абы які гаспадар. Праз яго рукі праходзяць сотні тысяч, калі не мільёны злотых грошай. Прадукуе ён на зямлі многа збожа, мяса, малака,

гародніны і іншага дабра. Яго асноўныя памочнікі – машыны, без іх няма работы.

Пэўна сельскагаспадарчая прадукцыя не ўсюды па новаму, але яна разгортываецца, ды што будзе праз некалькі гадоў?

І таму вёска пусцее. Пяць працэнтаў сялян прадукуе харчы ўАнгліі, у іншых дзяржавах тое ж самае. Гэта таксама чакае і нас.

Дык думаю не трэба плакаць і наракаць, што частка людзей ідзе жыць у гарады. Нам толькі трэба зрабіць з гэтага адпаведныя вывады, і то ўсё роўна дзе : у дзейнасці БГКТ, публіцыстыцы, літаратуры, не кажучы ўжо аб гаспадарцы. А што гэты вясковы чалавек не ведае, як паводзіць сябе ў горадзе – гэта ўжо іншая іншасць.

2 лістапада 1986 г.

# НЕ МАГУ ЗРАЗУМЕЦЬ

Я не магу зразумець тае недарэчнасці ў некаторых нашых грамадзян таксама, як не можа зразумець яе Алссь Барскі, пішучы „Аб нігілізме" ў сорак другім нумары „Нівы". Бо выходзць так: з аднаго боку, усенька, што добрае, звязана з народам, а з другога боку, усё што дрэннае, звязана з дзяржаваю, ад дзяржавы паходзіць. Часта пытаюся я ў знаёмых і калег, чаму яны так безразумпа адносяцца да сваёй дзяржавы. І аж сорамна слухаць, як яны пачынаюць тады сабак вешаць на дзяржаве – і за крызіс той,. і за чэргі пад крамамі, і за недахоп машын, і за  тое нават, што польскія футбалісты прайграюць. Я цалкам згодны з Барскім, калі ён гаворыць пра праявы „безразумнага нігілізму сярод мяшчан". З другога боку ёсць шмат  праяў зла ў галіне вытворчасці, напрыклад, ў выпуску кніжак, якія распадаюцца ў руках яшчэ пры куплі іх, у вырабе алоўкаў, якімі ні пісаць ні рысаваць. Нават маленькія школьнікі ўжо ведаюць пра тое, што не польскія школьныя вырабы лепшыя, а кітайскія або англійскія. Англійскімі цацкамі можна пагуляць, польскімі доўга не пагуляеш параспадаюцца яны.

А мне здаецца што няма нічога даражэйшага ў свеце, чым свая дзяржава, самастойная, з свімі парадкамі, урадам, нашымі праблемамі, асветай, культурай, дэмакраыяй, калі нацыянальнасць развіваецца, а не занікае, і калі людзі не саромяцца сваяго паходжання.

Незразумела мне не толькі тое, чаму людзі выракаюцца сваёй дзяржавы, але і тое, чаму род чалавечы падзяліўся ўсюды на дзяржавы? Думаю што таму кожны народ, марыць пра сваю самастойнасць, бо няма ў свеце роўнасці, пашаны да праўды і адна нацыя імкнецца падпарадкаваць сабе іншую.

16 лістапада 1986 г.

# НАЦЫЯНАЛІЗМ ПЕРАШКАДЖАЕ ПАТРЫЯТЫЗМУ

Чытаючы чыесьці, заўсёды знаходжу некалькі слоў, якія не даюць мне спакою. У артыкуле А. Баршчэўкага „Голас беларускага адраджэння” (пра 80-годдзе „Нашай нівы”) напаткаў я словы, якія гавораць пра абвінавачанне „Нашай нівы” ў нацыяналізьме, сеянні варожасьці паміж нацыямі, і пра служэнне эксплуататарскім класам. Такія галасы чуліся ад пачатку нарадзінаў сучаснай беларускай нацыянальнай сьвядомасьці – у дзевятнаццатым стагоддзі і пасля ў час Грамады, потым у 1956 годзе і зусім нядаўна ў 1980 - 1981 гадах. Некаторыя з нашых суседзяў лічаць, што патрыятызм ёсць тады, калі ніштожыцца беларуская культура і нацыя. А калі беларусы не хочуць перастаць быць беларусамі, тады абзываюць іх нацыяналістамі. Словам – працібеларускае лічыцца патрыятычным.. І ў нашай “Ніве” друкаваліся лісты пра нянавісць да нас беларусаў, у якіх найменшая праява нацыянальнай уласнай свядомасці кваліфікуецца як нацыяналізм або і шавінізм.

Думаю, што маўчаць нам пра гэта не трэба, і што добра калі А. Баршчэўскі піша якраз пра гэта. Тым болей, што спакайнейшага і згодлівейшага за беларусаў народа ў свеце можа і няма. Некаторыя з беларусаў ужо да таго згодлівыя і баяцца абразіць каго-колечы, што нават выракаюцца сваяго беларускага паходжання, для святога спакою перастаюць быць, беларусамі, перастаюць быць сабою, каб толькі крыўды на сябе ці злосці чыёй не наклікаць. Праз такую дабрыню, то мы і наогул прападзем!

А. Баршчэўскі піша, што „найбольш балючае, аднак, тое, што самыя знішчальныя, нігілістычныя і бязлітасныя нападкі на “Нашу ніву” выйшлі з колаў беларускіх публіцыстаў...” Ну, балючае. але калі ўспомнім артыкул таго ж Баршчэўскага пра паэта Міхася Чарота, які ў час культу асобы выракся сваіх калегаў і сяброў, каб толькі выратаваць сваю галаву, то думаю. што ў некаторай меры можна зразумець тых публіцыстаў. Перад смерцю многа герояў няма, каб адкрыта на гэтую смерць глядзець. Вельмі жаль, што крытыцызм у той „час буры і напору”, як піша Баршчэўскі не дазваляў глядзець на справы таксама інакш. З другога ж боку, той „час буры і напору” надоўга стрымаў далейшае адраджэнне і развіццё беларускай нацыянальнай свядомасці.

Трэба падзякаваць А. Баршчэўскаму за наближэнне чытачам „Нівы” мінулых падзей, вельмі важных для зразумення сённяшніх з’яў. А рэдакцыі „Нівы” трэба падзякаваць за апублікаванне артыкула А. Баршчэўскага.

Цікава, як іншыя чытачы „Нівы” думаюць пра гэтыя мае рэфлексіі, пару слоў маіх, пра патрыятызм і пра нацыяналізм, і што нацыяналізм не спрыяе патрыятызму, ён яму нават варожы, бо нацыяналізм – гэта варожасць да іншых нацый, а патрьтятызм – гэта любоў да сваёй і шанаванне ўсіх.

11 студзеня 1987 г.

# ЮЗВЮК НЕ ДАДУМАЎ ПРАБЛЕМУ

Вывады Ўладзіміра Юзвюка ў яго артыкуле „Аб моладзі шырэй” змешчаным у першым лютаўскім нумары „Нівы”, не зусім лагічныя. Піша ён, што ў беларускіх вёсках мала маладых, усяго дзесяць працэнтаў, і адначасна наракае, што Галоўнае праўленне БГКТ займалася на сваім пленуме праблемамі беларускай моладзі ў гарадах. Я лічу што гэта лагічна, калі ГП БГКТ цікавіцца большай часткай нашай моладзі. Грамадскі вопыт беларускай гарадской моладзі прыдатны вясковай. Вельмі ж шмат вяскоўцаў вучыцца па гарадах, здабывае адукацыю прафесію, і калі гэтыя маладыя потым не вяртаюцца ў свае вёскі, бо не знаходзяць там работы сабе паводле вывучанай спецыяльнасці, дык не іхняя ў тым віна. І не наша ўсіх, хоць мы і трывожымся паміраннем вёскі.

На нашых вачах адбываецца цывілізацыйны працэс, вынік якога залежыць ад культурнага ўзроўню людзей наогул. Я не здзіўляюся, што малады чалавек хоча жыць палюдску. І, ўрэшце рэшт, якая яму можа быць карысць ад вялікіх грошай. якія заробіць у вёсцы. калі няма яму там перспектыў на людскі быт, няма з кім нават ажаніцца (хлопцаў трохі эастаецца ў вёсках, але дзяўчат ужо зусім няма). Таму, пане Юзвюк. тут і „універсальныя формы” не дапамогуць, калі сітуацыя склалася  проста ненатуральная. А яшчэ і ўраднiцтва тутэйшае не пазбылося псіхалогіі мінулага, царскага ці санацыйнага, веку і фанабэрыць, што аж гідка глядзець ды слухаць. Зашмат яшчэ якойсьці „афрыкі” ў нашым краі, начальнікі нашы занадта часта паночкамі выглядаць хочуць, ад мужыцтва свайго не адчапіўшыся, усё кланяйся яму бы пану дабрадзею даўняму. А ці ведае Юзвюк, колькі тэлефонаў хаця б тых у гаспадароў? А тэлефон – гэта вялікая справа ў добрым і нястратным у сэнсе часу вядзенні ўласнай гаспадаркі. І таму, як я думаю, добра што БГКТ не пакінула аблагом справы гарадской моладзі, хаця гэта не значыць, што мае зусім пакінуць працу з моладдзю ў вёсцы.

12 красавіка 1987 г.

# РАБІЦЬ НА ГУЛЬТАЁЎ

У нашым беларускім чэрапе поўзае адвечная думка, што навука – гэта не работа, хадзіць у школу – гэта гультаіць. Работа ў нашым паняцці тады толькі, калі ты гной трасеш у полі, ці рыдлёўкаю зямлю варочаеш, ну, плугам або чым іншым. Пот вочы нашы мужыцкія мусіць заліваць, тады і прызнаем мы, што чалавек напраўду робіць, працуе. Янка Брыль неяк пісаў з крыўдаваннем: калі я чытаю кніжку, дык падумайце хоць. што я малюся да слова. Брыль ведае, што яго чытанне ніхто, нават блізкія не палічаць за работу, працу. Гэта драма наша, такія анахранічныя, сярэдневяковыя мазгі!

Ці не таму мы – жабракі Еўропы, валачэмся ў хвасце за цэлым развітым светам? У Еўропе самыя вялікія грошы даюць за работу мазгамі, а не за натугу потную! У іх яе, гэтай натугі, дарэчы сказаць, амаль і няма, тэхніка за іх робіць – трактар арэ, землекапалка равы патрэбныя капае, нават гузікі прышываюць да адзення аўтаматы. А ў нас усё: пакуль мазалёў не намуляеш сабе, то і работы тваей ніхто не заўважыць. Чаму гэта нам так падабаецца цяжка жыць? Як толькі лягчэй нам робіцца, дык мы якасьці горш пачынаем сябе адчуваць: нам мусіць быць цяжка і цяжка.

Гаворым, што людзей вучоных зашмат у нас, інжынераў усякіх. Выяўляецца, няпраўда! У Нямеччыне ў некалькі разоў больш тых інжынераў, чымсьці ў нас, не кажучы пра Японію, ў якой усе з сярэдняй адукацыяй, а большасць народу і з вышэйшай. І Японія ўжо пераганяе Амерыку! Пераганяе, а чаму не, багаццем, бо багацце і культура – гэта як дзеці аднае маці. Цёмны не можа быць багатым, як сляпы не можа бачыць, а кульгавы – бегаць.

Выяўляецца і вось што яшчэ: колькасць інтэлігенцыі ў Польшчы аказваецца ўжо шмат меншай, чым у Еўропе.

Прагрэс – гэта тэхніка, без тэхнікі лепей жыць немагчыма. А хто ж будзе у нас рабіць тую тэхніку, калі быць тэхнікам усё роўна, як курам на смех?! Чорнарабочы больш зарабляе за інжынера, але чорнарабочы не пабудуе новую машыну, не зробіць адкрыццё, не выпрацуе новую тэхналогію, новы спосаб прадукцыі. Калі не аплачваецца вучыцца, не аплачваецца канчаць школы, то куды зойдзем з такой філасофіяй? Нават у пачатковых школах ужо бракуе падрыхтаваных настаўнікаў, часта навучае ў іх абы-хто і абы-як. Бо быць настаўнікам у нас – гэта быць вельмі бедным чалавекам. А каму ахвота быць вельмі бедным, а яшчэ маючы розум у галаве? Шафёр зарабляе цяпер больш, чым мая жонка пасля дваццаці гадоў настаўніцкай работы. Шафёр, які ледзь пачатковую школу сяк-так „прабэкаў”!

Анахранізм думкі здараецца ў публікацыях “Нівы” нашай. Нядаўна чытаю я ў дзядзькі Віктара Рудчыка такую вось “жамжучынку неразумнасці”: “...

у нас ніхто не падумаў, каб нашых ліцэалістаў хаця раз у тыдзень заахвоціць да карыснай і павучальнай працы". Гэта ў дзясятым нумары за гэты год.

Ой, дзядзька ты, Рудчык! А можа і добра што ніхто яшчэ не падумаў, што навука ў ліцэі – гэта некарысная праца.

Той жа Рудчык цікава пісаў пра партызанаў, але калі бярэцца ён за дыдактыку, дык бяда і годзе! Ідучы далей за думкамі Рудчыка можна дагаварыцца і да такога, што школы, ліцэі тыя, – гэта нейкія тлумы гультаёў, дармаедаў, якіх невядома нашто трымае дзяржава, бацькі. Яшчэ трохі, і скажам: на хваробу нам тая „Ніва", хлеба-мяса яна не дае, плаціць за яе трэба, замест таго, каб задарма раздавалі па пошце ці ў кіёсках. Так думаючы, мы апынімся на прасцюткай дарозе да непісьмейнасці, цемры і забабонаў, вернемся да часоў нашых прадзедаў, на самы ўспамін лёсу якіх у холад кідае! Кожны, хто ў полі не робіць ці малатком не грукае, – гэта паразіт і дармаед, непатрэбшчына людская? Такія адчуванні часам скоўваюць і мяне самога, заўважаючы, як адносіцца да мяне мой сусед, мускулісты столяр. І таму, калі Мікалай Панфілюк надалей будзе пісаць у „Ніве" пра „малаадукаваных інжынераў", якія не ведаюць, што гэта такое хадзіць за плугам, або пацець з рыдлёўкаю ў мазолістых далонях, я перастану чытаць яго тыя артыкулы! Панфілюк хоча, каб свет пакаціўся назад, і каб паламаў машыны і паліў кніжкі, ці як? Не буду чытаць Панфілюка, так як перастаў я чытаць Аўрору, якая да таго ж разбэсцілася на старонках „Нівы", што бярэцца павучаць мяне, з кім я павін спаць, што я павінен піць, каго я павінен любіць, а каго не любіць, і гэтак далей. Гэта ж, выбачайце, дыктатура нейкая, ураўнілаўка пад адзін гэбель.

Не працай прымітыўнаю мы вылезем з крызісу, але новымі тэхналогіямі. Гляньце самі: нашы прашчуры сотні гадоў, тысячагоддзі гаравалі пабыдлячаму і што яны мелі за тое? Ад голаду паміралі! А за апошнія сто гадоў свет як жа хутка змяніўся на лепшае, дзякуючы навуцы і тэхніцы. Сёння нават смешным сталася гаварыць пра галодную смерць. Без навукі няма лепшага жыцця і таму вельмі непакоіць мяне тое, што навука ў такой непашане ды пагардзе. Цаніць вучоных – гэта не тое самае, што рабіць на гультаёў!

24 мая 1987 г.

# МАСТАЦТВА – СУРЁЗНАЯ СПРАВА

Музыку трэба і разумець і адчуваць. Трэба знацца на ўсякіх фугах, гармоніцы, „дур” гэта ці „моль” мелодыі, каб магчы задумацца над жыццём, яго сэнсам. А можа і не трэба? Дапамагае музыка чалавеку, як, прыкладна кажучы, паэзія Надзеі Артымовіч, каб быць лепшым, глыбейшым, разумнейшым, ці перашкаджае, як той вячэрні камар?

Калі разумеем музыку ды адчуваем яе, пачынаем любіць яе, хочацца бываць у філармоніі, набываць пласцінкі, магнітафонныя стужкі з канцэртамі, з песнямі нашых „Васілёчкаў” або „Дубіноў”.

Музыка подзяляецца на лёгкую і сур’ёзную. Лёгкую можна слухаць ўсюды, нават працуючы. Для сур’ёзнай музыкі патрэбны ўмовы. Каб яе слухаць, трэба ўжо культурнасці, разумення свету.

Не думайце, дарагія, што іначай з іншай творчасцю чалавека. Лёгкую кніжку можна чытаць абы-дзе, але вялікую літаратуру абы-дзе не будзеш чытаць, трэба спецыяльна чытаць, сканцэнтраваўшыся. Чытанне добрай кніжкі гэта таксама праца, а не толькі адпачынак.

Вось гэтых некалькі думак прыйшлі мне ў галаву пры нагодзе нашых некаторых дыскусій у „Ніве”, у якіх часам можна пачуць дзіўнае пра творчасць і мастацтва. Мастацтва гэта не бубен на маладзёжнай забаве і не вылежванне жыватом дагары. Гэта памылка прымітыва лічыць мастацтва ажыўленай гульнёю, гармонікам на вяселлі?..

20 верасьня 1987 г.

# БЕЛАРУСЫ І “ПОЖНЯ”

„Пожня” Васіля Петручука трапіла да нас, у Гданьск, неяк у пачатку года. Петручука ведаю я па „Ніве”. Чытаў яго кароткія ўспаміны, у якіх пісаў ён пра сваё былое жыццё. Пра Грабавец. Цяпер мне цяжка ўспомніць, што адштурхоўвала мяне ад ягоных тэкстаў: самі ўспаміны, ці іхняя форма? Вядома, што да вайны жылося надта цяжка, галотна. І тое, што гараваў і Васіль, нічога асаблівага і дзіўнага. Пад літаратуру мне гэта не падыходзіла.

Некалі чытаў я „Сто гадоў адзіноты” Гарсіі Маркеса.

У Маркеса і ў Петручука тая ж аддаленасць да падзей, якія здарыліся як быццам не ў нашым свеце, а ў нерэальнай краіне. Цяжкі лёс Васіля не кранае маіх струнау спачування. Зашмат у гэтай кніжцы аптымізму. Усё ж такі Васіль стаў афіцэрам, а потым нават і пісьменнікам з уражлівым сэрцам, і хадзіў у дзяцінстве за каровамі.

У дзяцей на вёсцы наогул нялёгкае жыццё. Яны нават слабейшыя здароўем і ніжэйшыя ростам за гарадскіх. Акружаючы вялікі свет і цывілізацыя. гістарычная свядомасць – былі недаступныя грабаўлянам. Думаю, што вобраз вёскі ў „Пожні” не змяняўся стагоддзямі. Змяняліся толькі поры года: пасля зімы прыходзіла вясна, а пасля вясны – лета і г.д. Калі параўнаць жыццё на старажытнагрэцкім востраве Крыт некалькі тысяч гадоў назад з жыццём беларусаў пасярэдзіне дваццатага стагоддзя, у дзве тысячы гадоў пасля Хрыста, дык можна крыху зразумець, чаму беларусы, седзячы амаль у цэнтры Еўропы, так трагічна жылі. Іх скублі і скубуць з усіх бакоў, а не так даўно яшчэ і правоў чалавекам звацца адмаўлялі ім, быццам неграм на плантацыях Афрыкі даўняе.

3 красавіка 1988 г.

# ЧАС УСЯМУ СУДДЗЯ

А я, наіўна, спадзяваўся, што сваімі карэспандэнцыямі ўзбагачаю старонкі „Нівы”, паддаю пешта новае застойнаму беларускаму грамадству. І што ў імя праўды не пагаджаюся з некаторымі думкамі нашых публіцыстаў. Цяпер яны надта ж баявымі парабіліся! Аж падумаецца іншы раз: а дзе яны былі, калі пры іх гэта памяці і прысутнасці духа ўхвалялі Статут Беларускага грамадска - культурнага таварыства, дзіўны статут беларускай арганізацыі, у якім ані слова пра будаванне нацыянальнай свядомасці беларусаў у Польшчы...?! Мне няма чаго саромецца за тое, што нямала маіх думак у тых карэспандэнцыях узнікла „дзякуючы іншым”, як гэта падтыкае нам Алесь Барскі ў „Ніве” ад дваццатага сакавіка. А ці і творчасць Барскага не носіць у сабе слядоў нечай іншай? Барскі мае жаль і прэтэнзіі да тых карэспандэнтаў, якія кажуць „не” нейкаму публіцысту. Я таксама не сцярплю, калі наткнуся на дурноту. І зусім не таму пішу я ў „Ніву”, каб пaглядзець, як зак’расуецца надрукаванае ў ей маё імя і прозвішча.

Лічу, што ўсяму суддзя час. Час дасць ацэнку і рацыям Алеся Бярскага: застанецца ад іх што-небудзь, ці анічога, толькі пажоўклы кавалак зудрукаванай паперы. З гэтым трохі так, як з тым пісьмом Галоўнага праўлення БГКТ ад 1971 г. у Міністэрства асветы. Падпісалі яго тадышні старшыня ГП мгр Міхась Хмялеўскі і сакратар -ГП мгр Янка Зенюк. Ну, падпісалі. Магло ж так здарыцца. Націскі былі на іх, відаць, ці што іншае, магчыма. Але чаму яны абгрунтавалі яе „культурна-цывілізацыным працэсам”?

Вось так час, бы той пракурор, кваліфікуе кожнага. Узяўшы да сэрца словы Барскага, можна сказаць сабе: мая хата скрай, няхай, яны, разумнейшыя, чаўпуць, што хочуць, і бяруць на сумленне свае. Дзялянку “Адгалоскі” прапаную ліквідаваць наогул дзеля „перастройкі” ў „Ніве” і БГКТ. Або, можа, лепей прыкінуцца, што словы Барскага пра карэспандэнтаў акурат не датьгчаць мяне. І што са мною ўсё, як трэба. Але ж. выбачайце, запахла тут даўнімі пяцідзесятымі гадамі. У Барскага „нядобрасумленных карэспандэнтах” пачулася рэторыка часоў, якія дзецям нашым здаюцца ўжо панурым жартам.

Ну, вось так, на гарачую руку і галаву.

22 мая 1988 г.

# НОВЫ ЧАС

Аўрора сумуе, што ў краіне і ва ўсім свеце мяняецца. Я сумаваў бы, каб быў застой.

Як відаць, між Аўрорай і мной ёсць разыходжанні ў падыходзе да змен: я за змены, у іх я бачу надзею на лепшае, Аўрора – наадварот. Яна іх проста баіцца і страшыць іншых людзей. Паколькі яе погляды з’яўляюцца публічнымі, я публічна ацэньваю іх як балбатню, таму што ў гэтым допісе ўсё паблытана.

Балбатнёй з’яўляецца сцвярджэнне Аўроры, што „сацыялістычныя краіны перайшлі ў капіталізм”. Відаць, пра капіталізм Аўрора ведае тое, што аб ім у прапагандысцкіх кніжках напісана, дзе капіталізмам карыстаюцца толькі фабрыканты і памешчыкі. А вось Аўрора, пэўна, прапусціла інфармацыю з вялікай сацыялістычнай краіны, дзе дзяржава хоча проста перадаць зямлю ў прыватныя рукі, таму што нават у Маскве бракуе хлеба. Хлеба! Не гаворачы пра мяса, масла ці малако.

У нас, у Польшчы, ёсць уласнікі зямлі і зямля служыць не толькі ім, нашым капіталістам, якіх многа па беларускіх вёсках, а ўсяму грамадству. Пакуль што хлеба, бульбы, малака нам не бракуе.

Не ведаю, адкуль у Аўроры ўзялася такая вось фраза: „крыўда працуючых мас”. Яна ж як маладая асоба не памятае тых вясковых сходаў, на якіх той жа фразеалогіяй заахвочваліі ўступаць у сацыялістычныя калгасы. Людзі паверылі, што пры камунізме шчасце само прыйдзе, што не трэба будзе рабіць, старацца, намагацца, думаць. Бядняк быў узорам для ўсяе вёскі, а клапатлівы, багацейшы і разумнейшы аказваўся кулаком, якога трэба было раскулачваць або вывезці з сям’ёй на захад, на „Адзысканыя землі”. Аўрора падлізваецца чалавеку працы, пішучы. што „цяпер зноў чалавек працы — гэта нішто”. Значыць, як. перад вайной. А трэба сказаць, што чалавек працы перад вайной не меў бяды, бедняком быў беспрацоўны. Цікава, каго лічыць Аўрора „чалавекам працы”? Ці таго, які належыць да „працуючай масы”, ці ўсіх. якія атрымліваюць штомесячную зарплату, ці тых, якія не маюць вольнай хвіліны з-за працы. А трэба сказаць, што мець сваю „фірму”, быць проста капіталістам, цяпер у Польшчы вельмі цяжкая праца. Прыкладаў на гэта ў мяне многа.

Аўрора піша далей, што „народная ўлада столькі зрабіла, каб, усе мелі працу, каб усе былі адукаванымі, а цяпер зноў вяртаемся да тых змрочных часоў?!”

Чаму народная ўлада перастала быць народнай, чаму народ яе адкінуў? Добра было б, каб некалькі такіх пытанняў Аўрора паставіла сабе.

Далей, у Аўроры важна, каб усе мелі працу, не важна, што рабілі, як рабілі, важна, каб мелі яе. І фактычна, усе мелі працу, усе мелі грошы, толькі магазіны былі пустыя. Ці ж гэтага не было відаць?! Праблема не ў тым, ці ўсе працуюць, праблема ў тым, якія вынікі іх працы. Народная ўлада адвучыла людзей працаваць і вельмі пільнавала, каб усе прыходзілі да працы, нават увяла спецыяльныя законы супраць абібокаў. Народная ўлада адукавала многіх, але ўсё рабіла, каб адчулі яны сябе горшымі. На прадпрыемствах многія гады кіраўніікамі былі заслужаныя, наогул мала адукаваныя людзі. Так было і ва ўладах, на усіх яе ўзроўнях. Веды цаніліся і цэняцца за граніцай.

Тут проста з цябе смяяліся, што, закончыўшы універсітэт, не ездзіш на сваёй машыне, не жывеш у сваім доме. Нашто, казалі, табе навука, калі і пасля сямі класаў можна зарабляць мільёны.

Ведаў да гаспадарання на зямлі вялікіх не трэба было мець, хапіла толькі ахвота. Зараз, калі аказалася, што сельская прадукцыя ў нас дарагая, калі можна купіць танней у капіталістаў, калі трэба сялянам думаць, як эфектыўта гаспадарыць, каб выйсці на сваё, калі патрэбна адукацыя, падняўся крык і плач за народнай уладай.

Думаю, добра сталася, што рэлігія вярнулася ў школы. Я сам вывучаў рэлігію ў школе і ў педагагічным ліцэі пад канец пяцідзесятых гадоў. Навука запамяталася мне на ўсё жыццё. Можна сказаць, што рэлігія навучыла мяне быць гуманістам і беларусам. Думаю, што царква можа дапамагчы вярнуць нацыянальную свядомасць беларусам, свядомасць безупыннасці праваслаўна-беларускай культуры.

4 лістапада 1990 г.

# ДУХ СТАЛІНІЗМУ

Адкрый міфалагічную скрынку Пандоры, а ўсё злое распаўзецца па свеце. Пятро Байко ўспамінаў пра колішніх карэспандэнтаў „Нівы" і адзін з іх адазваўся „Духам сталінізму, пагарды і хлусні" („Ніва" ад 21.Х, 1990 года). Старэйшыя чытачы „Нівы" прыпамінаюць ваюючага Мікалая Панфілюка – карэспандэнта „Нівы" з Дубічаў-Царкоўных. Цяпер Палфілюк ваюе з Басілём Петручуком і вініць яго за ўсе злачыствы сталінізму. Не чытаю „Голасу Радзімы" замнога было ў ім хлусні і таннай прапаганды, але калі Васіль Петручук там публікуе сваю, "нататку", як піша Понфілюк, значыць хоча ен звярнуць увагу на тое, што „нове" ў Польшчы, не зусім адпавядае беларусам.

Пакаленне Васіля Петручука (а думаю, што і маё ) паверыла ў ілюзію, што людзям характэрна дабро, што людзі самі па сабе павінны быць добрымі, што сацыялізм гэта такі лад, які прыносіць людзям, толькі шчасце.

Панфілюк, відаць не чытаў „Пожні" Пётручука, бо калі. б чытаў, зразумеў бы яго пратэст супроць новага ладу ў Польшчы. А наогул, дык Панфілюк не разумее нічога з таго, што цяпер робіцца ў Польшчы. Мала таго, што не разумее, то яшчэ і шукае апраўдання варожасці палякаў да беларусаў. Можа не ўсіх палякаў, а толькі тых, што згуртаваліся ў беластоцкай „Салідарнасці"?

Чытаючы „Мой пункт гледжаняя" М. Панфілюка, хочацца запытаць: ці варта кранаць суадносіны беларусаў і палякаў у саракавыя гады нашага стагоддзя? Ці можна будаваць будучыню на нацыянальнай варожасці? Ці хацеў бы гэтага Панфілюк?

Панфілюк піша, што „В. Петручук не мае ніякіх маральных правоў, каб свае нацыянальныя погляды і думкі прэзентаваць ад імя нашага (? – М.К.) бела-рускага народа Беласточчыны, які нібы „ахвотны быў застацца за мяжою БССР тады, зараз пасля вайны". Пакуль што, то Панфілюку таксама ніхто не даў правоў, каб адмаўляцца ад сваёй нацыі і беларускага народа і называць „савецкай акупацыяй" перыяд ад „вераснёвага світання" 1939 года да 22 чэрвеня 1941 года. Тое чым аказаліся саветы ў 1940 годзе для беларусаў, не было вядома ў 1939 годзе. Праўда пра „рай", як з пагардай і няінавісцю піша Панфілюк, выйшла тады, калі „нашы" беларусы сутыкнуліся з „савецікімі" беларусаміі. Тады толькі даведаліся пра страшэнную бяду там за мяжой;

Калі В. Петручук, аднак, такі „сталінскі фанатык", то за якога фанатыка трэба лічыць М. Панфілюка, калі адмаўляе ён іншым мецць права на погляды іншыя, чым афіцыйныя? Цікава, што добранадзейнаму Панфілюку не хапае талерантнасці ў адносінах да іншых людзей і іх поглядаў.

Мару, каб беларускй народ меў сваю вольную і незалежную Беларусь, і думаю, што такая Беларусь будзе. М. Панфілюк жа хоча беларусаў на Беласточчытне звязаць з Польшчай на векі вякоў і тут вылазіць яго скамунізаванае мысленне. Ён не ўяўляе сабе, што народы могуць жыць там, дзе жывуць, не трацячы сваю нацыянальнасць і не адгароджваючыся ніякімі „занавесамі" і межамі. Я лічу, што мяжа між дзяржавамі павінна быць умоўнай лініяй на зямлі, якая аддзяляе дзве адміністрацыйна аддзеленыя дзяржавы, а не народы, культуры і цывілізацыі

25 лістапада 1990 г.

# ЖЫЦЦЁ ГОДНАЕ

На мой погляд, думка, якую Алесь Барскі выказаў у фельетоне з цыкла „На мяжы” ў „Ніве” ад 18.XI.1990 г., няправільная.

Не так даўно Алесь Барскі заахвочваў беларусаў ствараць розныя партыі. У разнастайнасці ідэй бачыў ён ратунак для беларусаў Беласточчыны. Добра, што яны не паслухаліся добразычлівага паэта і стварылі толькі БДА. Добра таму, што кішэнных беларускіх партый ніхто б і не заўважыў на палітычнай карце Польшчы.

Цяпер Алесь Барскі асцерагае беларусаў з Беларусі перад незалежнасцю ад суседзяў, а перш за ўсё перад незалежнасцю ад Савецкага Саюза. Піша: „Уявіце сабе, што ўжо сёння Беларусь сарвала з сябе ўсе абмежаванні, накінутыя ёй Савецкім Саюзам, і сталася краінай незалежнай. Ну, і пачнуцца страшэнныя рэчы”. Не паспела Беларусь і падумаць аб незалежнасці, як фельетаніст ужо палохае, што незалежнасць гэта страшная рэч. Калі Беларусь будзе незалежнай, то каму беларусы будуць веласіпеды прадаваць яны такія ж (веласіпеды – не беларусы) няўдалыя. А мусяць іх прадукаваць, калі „амаль уся сыравіна і паўпрадукты, неабходныя для выпуску веласіпедаў, пастаўляюцца з Расіі або з іншых рэспублік”. Калі гэта праўда, то няхай расейцы самі іх складаюць.

Ці цяжка ўявіць, што залежнасць гэта першая і апошняя прычына таго, што беларусы робяць не тое, што хочуць рабіць і не так як трэба. Незалежнасць не праяўляецца ў тым, што не-залежная нацыя прадукуе ўсё, што патрэбнае ёй для жыцця. Незалежнасць народа і дзяржавы праяўляецца ў тым, што эканамічныя, палітычныя і гаспадарчыя кантакты з іншымі залежаць толькі ад гэтага народа і бываюць яны такія, якія народ лічыць для сябе найкарыснейшымі.

Гляньма на справу незалежнасці і з другога боку. З фельетона А. Барскага вынікае, што беларусы прадаюць толькі халадзільнікі „Мінск”, веласшеды і... льняныя вырабы. Выходзіць на тое што на Беларусі няма і не было ніякай індустрыі і не адбыліся дэмакратызацыйныя працэсы, што калі будзе незалежнай, то сама (чаму сама?) не дабяжыць да Еўропы?! А з Саюзам дабяжыць? Пэўна, так як і цяпер дабегла.

Я ўяўляю Беларусь як дэмакратычную дзяржаву, у якой сам нарюд вырашае аб усіх сваіх справах. Ці ж Барскаму невядома гісторыя Беларусі? З гісторыі вынікае, што суседзі дбалі толькі пра сябе, а з цягам часу каланізавалі беларускія землі і беларускі народ, а культуру зводзілі да фальклору. I яшчэ хачу сказаць, што годнае жыццё бывае тады, калі яно незалежнае, калі чалавек мае вольны выбар, а народ – ён жа як і чалавек.

16 снежня 1990 г

# НЕВЯДОМЫЯ ЛІТАРАТУРЫ

Ян Макоімюк па просьбе даследчыцы польскай літаратуры прафесар Яланты Брах-Чаіны склаў „нешта на кшталт спіску пазіцый з беларускай літаратуры, якія маглі б увайсці ў праграму навучання літаратуры пачатковых школ і ліцэяў у Польшчы”. Зрабіў гэта як мага найлепш, паводле сваіх магчымасцяў. Аднак, глянуўшы на гэты спісак, узнікла ў мяне пытанне: чаму ў іх няма Якуба Коласа, Віктара Шпеда ці Алеся Барскага? Адказ выасоўваецца сам па сабе: Ян Максімюк паслужыўся тут палітычным крытэрыем, адкінуўшы мастацкіі. Бо ці ж фактычна „Беларусь, Беларусь” С. Яновіча з’яўляецца тым творам, які павінна засвоіць моладзь перад усімі іншымі ў беларускай літаратуры? І ці ж няма ў Польшчы спецыялістаў па беларускай літаратуры, яікія больш сур’ёзна і прафесійна падыйшлі б да просьбы праф. Я. Брах-Чаіны?

**7** красавіка 1991 г.

# У ЧЫМ СПРАВА

Можна падрабязна разабраць допісы абаронцаў А. Баршчэўскага і БГКТ і даказаць, што аўтары іх (У. Юзвюк -„Ніва” ад 9.06.91 г. і Янка Жамойцін -„Ніва” ад 7.07.91 г.) памыляюцца, абвінавачваючы Яна Максімюка і БДА ў тым, што яны з’яўляюцца далакопамі БГКТ.

Для мяне справа простая. Калі заняпад дзейнасці ў БГКТ сягаў дна, калі трэба было штосьці рабіць для беларусаў у Польшчы, самыя актыўныя іх прадстаўнікі стварылі Беларускае дэмакратычнае аб’яднанне палітычную партыю беларусаў у Польшчы. Ці БДА супраць БГКТ і А. Баршчэўскага? Чытаючы У. Юзвюка і Я. Жамойціна, можна меркаваць, што Сакрат Яновіч са сваімі „хлопцамі” хоча знішчыць БГКТ і Баршчэўскага.

Для справы беларусаў патрэбны розныя формы дзейнасці. Трэба нешта рабіць, а не толькі існаваць, як існавала спакойна БГКТ на працягу некалькіх апошніх гадоў. Існавала з датацыі дзяржавы.

Тое, што Баршчэўскі – чалавек, адданы справе беларусаў, усе мы ведаем, і Я. Жамойцін тут Амерыкі не адкрывае; што ён вялікі эрудыт – таксама вядома, і што кепскі арганізатар – то пэўна ведаюць толькі чарговыя сакратары ГП БГКТ. Калі хтосьці хоць крышку займаўся арганізацыйнай працай, ведае, колькі часу, нерваў і грошай трэба, каб аформіць адну справу, а іх жа пры Варшаўскай 11 у Беластоку дзесяткі, як не сотні.

Пэўна, не было б столькі крыку, каб беларусы з іншых беларускіх арганізацый не дамагаліся датацыі дзяржавы, якую невядома чаму атрымоўвае БГКТ і з’яўляецца яе адзіным дыспанентам.Думаю, што тут з’яўляецца ядро сваркі.

18 жніўня 1991 г.

# ПРА БАНК І ІНШЫЯ СПРАВЫ

Ці трэба пераконваць, што банкі – крывяносная сістэма ўсяго эканамічнага арганізму дзяржавы” – кажа Я. Купчын (адзін з распрацоўшчыкаў „Закона аб нацыянальным банку” і „Закона аб банках і банкаўскай дзейнасці”) у атыкуле Кастуся Шалястовіча . Аўчынка вырабу вартая” ў „Голасе Радзімы” (н-р 44 ад 31 кастрычніка 1991 г.). Са зместам гэтай публікацыі заахвочваю пазнаёміцца беларускіх бізнесменаў з Беласточчыны. Ёсць там канрэтныя прапановы і для суайчыннікау з-за мяжы Беларусі.

Думку пра стварэнне беларускага банка ў Беластоку выказаў я на старонках „Нівы” добрых некалькі гадоў таму назад, калі нікому ў Польшчы яшчэ і не снілася рыначная гаспадарка, а „Салідарнасць” знаходзілася ў глыбокім падполлі. Тады не было ўмоў і грошай для стварэння такога банка і нават рэдактар Г. Валкавыцкі (вельмі прыхільны маім думкам) гаварыў, што ідэі Куптэля мала рэальныя, але чаму ж іх не кідаць у народ.

Прайшло некалькі гадоў і інтуіцыя мяне не падвяла. Чытаю „Голас Радзімы” і так як бы адкрываў сябе. Але вяртаймася да справы. Ёсць ужо на Беласточчыне (і не толькі) некалькі багацейшых беларусаў, якія калі б спалучылі свой капітал, маглі б без клопатаў стварыць беларускі банк у Беластоку. Не ў Гайнаўцы як бы некаторыя хацелі. Там можна адкрыць яго філію, або ашчадпую касу для абслугоўвання навакольных малых прадпрыемстваў або проста сялян. У Беластоку можна знайсці людзей да працы ў такім банку і фірмы. якія карысталіся б яго паслугамі. З Беластока да Гародні толькі некалькі дзесяткаў кіламетраў, а і да Менска таксама недалёка.

Чым займаўся б беларускі беластоцкі банк? Перш за ўсё ўкладамі ад насельніцтва, крэдытамі, захаваннем каштоўнасцей.

Як можна рабіць бізнес з беларусамі з Рэспублікі Беларусь, калі да гэтага трэба проста многа крэдытных грошай, на некалькі, часамі, тыдняў?

Каб уявіць праблему, прапапую на разгляд такі вось прыклад. Маю тут у Польшчы заказ на тысячу кубічных метраў дошак на паддоны. У Польшчы гэтых дошак купіць танна нельга. Звяртаюся тады да фірмы ў Беларусі, дамаўляемся і каб здзейсніць кантракт мне трэба 500 мільёнаў (старых) злотых. За грашыма іду ў банк, бяру крэдыт, плачу за дошкі беларусам з Беларусі і прадаю іх у нас. Заўважце, што чатыры бакі гэтай здзслкі задаволены. Вытворчае прадпрыемстна ў Польшчы не спыніла прадукцыі паддопаў, я зарабіў грошы на гэтай здзелцы, банк атрымаў свае працэнты ад крэдыту, а прадпрыемства з Беларусі прадало свой тавар.

Пачатак усім здзелкам банкавы капітал. Калі ён ёсць, можна развіваць інвестыцыі, спачатку невялікія, такія, якія даюць магчымасць хутка вярнуць уложаны капітал і даюць нават невялікі зыск. Ці ведаеце, што на Гайнаў-

шчыне, у Махнатым, сярэдпяй вёсцы, ёсць два магазіны і не чуў я, каб іх закрывалі, значыць яны даходныя. Летам па вёсцы хтосьці ездзіў грузавіком, купляў яблыкі, многа яблык, і ўсім было выгадна – і прадаўцам, і купцу! На вёсцы можна простым спосабам квасіць агуркі і іншую гародніну, якая тут у горадзе каштуе тысячы злотых, можна кансерваваць садавіну і прадаваць. На вёсках многа будынкаў, якія пустуюць, ёсць вада, і людзі да працы. Проста трэба знайсці арганізатараў малых і зусім маленькіх прадарыемстваў. І патрэбны капітал на пачатак. Сяляне наракаюць, што не аплачваецца ім апрацоўваць зямлю і дамагаюцца павышэння і забеспячэння мінімальных цэн на свае прадукты. Нядаўпа прачытау я ў „Ніве” нараканні жыхараў вёскі, „прадуцэнтаў” жыта, мяса, малака, на цяперашнюю рыначную гаспадарку і хвальбу часоў камуны. Прыпомню, што тады ў гарадах стаялі велізарныя чэргі за абыякім таварам. Ці хочаце, каб далей так было? Далей будзеце смяяцца з тых з горада, якія ездзяць да бедных бацькоў на вёску за

прадуктамі?! Ці такая гаспадарка гэта нармальпая гаспадарка? Дарагія сяляпе, нельга наракаць і чакаць на ўрад, Амерыку, рускіх. Трэба варушыць мазгамі, думаць, што і як рабіць, каб выжыць. Калі маеш брат два-тры гектары зямлі і каб яе апрацаваць трэба табе да ўсяго наняць машыны, то лепш прадай гэтую зямлю, а сабе пакінь столькі, колькі можна абрабіць лапатай, каб пасадзіць моркву і займіся тым, што дасць грошы. Зямлю купіць той, каму будзе аплачвацца яе абрабляць, які купіць камбайн і іншыя машыны.

Арганізатарам гаспадарчай дзейнасці сярод беларусаў на беларускіх вёсках Беласточчыны можа стаць БДА. І калі яно зоймецца гэтым, дык у наступных выбарах у Сейм здабудзе столькі галасоў, што без праблемы перагоніць В. Цімашэвіча ці іншага „прадстаўніка” беларусаў. БДА ўжо гэтым занялося, але пакуль што не стае вопыту, няма ахвотных і кампетэнтных людзей да працы, якія апрача грамадскай справы бачылі б у гэтай дзейнасці свой інтарэс. Хачу сказаць, што ў гаспадарчай дзейнасці не бачу БГКТ. Тапарыства створана для спраў культурпа-асветніцкіх і няма ў ім менеджэраў. Не ў тым справа, каб працаваць на таварыства. Трэба працаваці для таварыства таму, што яно існуе для духа: мовы, свядомасці, літаратуры, музыкі, танцаў, асветы...

22 снежня 1991 г.

# ЯК ЖЫЦЬ?

Пры капіталізме трэба спадзявацца толькі на сябе. Можна яшчэ і на сям'ю, але і то не заўсёды. На дзяржаву і суседзяў разлічваць нельга. Можа, толькі за выключэннем суседзяў з вёскі. Там увесь час быў каніталізм і там кожны ў першую чаргу разлічваў на сябе, а потым на суседзяў. Суседу з блока дапамагчы цяжка, калі і самому не хапае, ну, мо не на хлеб, але на масла, мяса, школу, газеты, тэлебачанне.

Калі чалавек прыйдзе да вываду, што можа разлічваць толькі на сябе, то гэта ўжо само па сабе з'яўляецца вялікім крокам у будучыню рыначнай гаспадаркі. Галоўнае – гэта свядомасць, што можна рабіць тое, што ўмееш і патрапіш. Капіталізм дазваляе рабіць усё, аднак магчымасці працы трэба самому шукаць, ніхто іх пад нос не падсуне. Мы быццам бы ведаем, што ўмеем і можам рабіць, мы ж людзі разумныя. Трэба толькі гэтым розумам разважліва карыстацца.

Калісь, успамінаюць старыя людзі, пасля першай сусветнай вайны, у час вяртання з бежанства людзі на сваіх сядзібах не знаходзілі амаль нічога. Елі лебяду, жылі ў зямлянках, а паглядзіце, як за некалькі пакаленняў людзі разжыліся. Цяпер жа бяда, бо няма каму прадаць збожжа, мяса, бульбу, бо не хапае грошай на паліва для машын.

Калісьці, пасля першай сусветнай вайны, людзі думалі, як пабудаваць хату, каб не жыць у зямлянцы. Цяпер трэба думаць, як прадаць вырошчанае, як жыць, каб пражыць, сабе і сям'і. Хтосьці сказаў, што яшчэ так не было, каб якасьці не было. І гэтай аптымістычнай заўвагай канчаю некалькі асабістых рэфлексій пра сучаснасць.

19 красавік 1992 г

# АГІТАЦЫЯ З ДАПАМОГАЙ КАПІТАЛІСТАЎ

Барскі пачаў перадвыбарную агітацыю цыклам фельетонаў „Беларускія капіталісты”– глядзі „Ніва” ад 12 ліпеня г.г. Цікава, ці пераможа Валодзю Цімашэвіча? Пераможа – не пераможа, а ваду з мазгоў людзям робіць! І так, быццам не ён сам выкладае думкі пра капіталізм і капіталістаў, а ўкладае іх у вусны то „прыблізна саракагадовага селяніна”, то ў „жанчыны гадоў шасцідзесяці”, то зноў „шасцідзесяцігадовы беларускі селянін” паясняе нам красамоўна істоту капіталізму. Што такое капіталізм кажуць нам беларусы з вёсак і мястэчак. З гэтай, быццам сацыялагічнай, анкеты вынікае, што, нам, беларусам, ніякага капіталізму не трэба.

Шасцідзесяцігодак кажа: „А чы твой (значыць А.Б. – М.К.) капіталіст, зарабіўшы на мне, будзе ўсё гэта рабіць? Ні халеры (адказвае апытваны – М.К.). Пакажы ты мне тыя шпіталі, школы, дамы культуры або дарогі, каторы збудавалі нашы капіталісты. А як жэ, я ўжэ чуў, то будут будаваць дарогі і калі схочэш па іх ездзіць, то мусіш заплаціць за кажды кіламетр, от як гэто выглядае”.

Ой „выглядае, выглядае!” А выглядае на тое, што А. Барскі паставіў фальшывы тэзіс, што на Беласточчыне ёсць ужо капіталізм і што ёсць капіталісты. Капіталісты то можа і ёсць, але капіталізму – ані крышынку. Ёсць зачатак рыначнай гаспадаркі, ёсць свабода адкрываць прыватныя прадпрыемствы, і але капіталу то зусім мала. Там ёсць капіталізм, дзе ёсць капітал. Капіталам адзіным у селяніна з’яўляецца зямля – значыць, што адзіныя капіталісты гэта сяляне Гайнаўшчыны і Бельшчыны.

Мала таго, што фальшывы тэзіс, то яшчэ фальшывае слова ў кантэксце сучаснай рэчаіснасці. Слова, ад якога вее пагрозай для нашых шасцідзесяцігодкаў, якія пра капіталізм ведаюць тое, што прачыталі ў кніжках або ведаюць ад бацькоў. Няма ў насі капіталізму, а не было і сацыялізму.

Можна сказаць, што цяпер існуе безгалоўе, няма нічога ўстаткаванага, пачынаючы ад „малой канстытуцыі”, а канчаючы на самаўрадах гмін ці вёсак. Найважнейшае, каб тое, што робіць чалавек мела сякі-такі сэнс, і каб паліцэйскі не заглядаў чалавеку пад чэрап; каб свабода не была толькі мёртвай літарай у Канстытуцыі; каб, калі чалавек будзе патрабаваць дапамогі, то не адвернуцца ад яго суседзі, царква ці дзяржава; каб чалавечы талент быў нашым супольным скарбам, а наваколле з лясамі, рэкамі, палеткамі найдаражэйшым з дарагіх; каб не было межаў і дурных абмежаванняў; каб наперадзе быў розум. Адным словам, я хачу сказаць, што жыццё – гэта вельмі складаная справа і што кожны чалавечы лёс будуе наогул сам чалавех.

А перадвыбарчую агітацыю можна весці, але ці якраз цяпер, карыстаючыся мяжой у „Ніве”?

1 верасня 1992 г.

# „КРУГ ПАРАНОІ, АЛЕ ДЗЕ?”

М. Панфілюк мяшае з балотам людзей, якія маюць акрэсленыя погляды, калі не дай Бог не супадаюць яны з Панфілюковымі. Што М. Панфілюк не ваюе з поглядамі А. Барскага, В. Петручука і іншымі, а толькі з імі самімі, можна зразумець, бо да ваявання з поглядамі патрэбны аргументы і якія-небудзь веды аб рэчаіснасці. А чытаўшы „артыкулы” М. Панфілюка можна вырабіць погляд, каго прадстаўляе сабой аўтар. Як можна пісаць раз што „На Беларусі камунізм закараніўся таму, што людзі не шануюць сваёй гаспадарчай спадчыны, сваёй роднай мовы (падкр. М.К.)...”, а другі раз, праз тыдзень бадай, што „... ці такая чыстая мова аж так вельмі нам патпатрэбная?”. Разумею, што наш прэзідэнт у адным сказе выказвае супярэчлівыя фразы тыпу: „Jestem za, a nawet przeciw”, але Панфілюк – не Валэнса.

„А ці такая (значыць беларуская літаратурная – М.К.) мова АЖ (вылучэнне – М.К) так вельмі нам патрэбная?” – пытае Мікалай Панфілюк у „Ніве” ад 31 студзеня 1993 года. Не выясняе М.П., хто за ім стаіць, калі піша „нам непатрэбна”. Ад імя каго піша М. Панфілюк сваю балбатню ў „Ніву”? Што дурната вылазіць з усякага яго „артыкула”, відаць гэта кожнаму, і думаю, што рэдакцыя змяшчае „творчасць” М.П. з Дубіч, каб паказаць, што блытае па галовах некаторых беларусаў, якія, па-іхняму, з’елі ўсе розумы. Каб гэта даказаць, трэба проста разабраць ягоныя сказы на часткі, хоць гэта работа не вельмі цяжкая, але марудная, бо трэба даказваць, што для жыцця патрэбнае паветра, сонца, вада і гэтаму падобнае, хаця ўсім гэта вядома. Махнуў бы я рукой на выказванні М.П. – для мяне ўсё ясна, але камусьці, хто пачынае чытаць „Ніву”, у большасці маладым людзям, дэмагогія карэспандэнта з Дубіч можа паблытаць не толькі думкі, але і змуціць рэчаіснасць. Так больш-менш ад некалькіх гадоў М. Панфілюк лічыць сябе пакрыўджаным у тым, што быццам бы ён ваяваў з камуністамі і камунізмам, і з той прычыны праследавала яго дубіцкая ўлада: „Я СССР не крытыкаваў, але крытыкаваў нашу камуністычную бюракратыю тут, на месцы. За гэта мяне, вядома, як „любілі” ў гміне, у партыі: так „любілі”, што многа разоў клікалі на „споведзь” у камітэт партыі ў Дубічах-Царкоўных, а нават аднойчы мой дом наведаў нейкі маёр з беластоцкай бяспекі”. Да М. Панфілюка, да важнай персоны ў дубіцкай апазіцыі, беластоцкая бяспека высылала маёра, бо сяржант не мог справіцца. Адным словам, зараз М. Панфілюк дарабляе сабе катаржнае мінулае пры сацыялізме і хоча прыкідвацца (перад кім?) мучанікам старой сістэмы. Добра было б, толькі не ведаю, ці ў выпадку карэспандэнта з Дубіч

гэта прынясло б які-небудзь эфект, каб адгрэбці ў архіве не надрукаваныя лісты, і паказаць, з якой прычыны не пайшлі яны ў друк.

Сваім розумам М. Панфілюк не можа абняць таго, што робіцца навокал. Гляньма, якую простую інтэрпрэтацыю дае М.П. заняпаду ўсяго на Беларусі (хоць не ведаю, ці ён тую Беларусь бачыў). Піша так: „На Беларусі камунізм закараніўся таму, што людзі не ...”. Калі сягнеш да літаратуры, да гісторыі, да розных публікацый пра пачаткі дваццатых гадоў, то выходзіць наадварот, што калі запанаваў камунізм. можа бальшавізм, які ўсю беларускую інтэлігенцыю паслаў у зямлю і на Сібір, то ён укараніўся, і не беларусы, як народ, тут вінаваты. Як можна пісаць такія глупствы, калі маем нейкую арыентацыю ў рэчаіснасці, не гаворачы пра элементарную адукацыю. Дзе быў М. Панфілюк, калі мы ўсе хадзілі ў школы? Няхай сабе і сацыялістычныя, але аднак чаго-небудзь можна было навучыцца. Няўжо М.П. пагневаўся на такое навучанне і закончыў на „двухкласным вучылішчы”?

Можна пісаць у „Ніву”, і калі ў гэтым пісанні няма думкі, то няхай хоць будзе інфармацыя. Але не! М.П. хоча быць філосафам, дзеячом беларускай справы, хоць калі чытаю „Круг параноі, але дзе?”, то сумняваюся і ў апошнім сцвярджэнні. Хоча быць суддзёю, пракурорам і выканаўцам сваіх прыгавораў.

Нічога не рабіўшы, не пабрудзіш ні рук, ні сумлення. Цяпер крычыць М.П., што БГКТ гэта была (ёсць) камуністычная арганізацыя, з камуністычным праўленнем. Я думаю, што БГКТ за ўсе гады як і цяпер, гуртавала многа шчырых і адданых справе беларусаў, і перш за ўсё сумленных. Часы змяніліся, цяпер можна вылівацъ на іх вёдры гною, але гэта не абазначае, што М. Панфілюк можа гэта рабіць публічна і пры дапамозе „Нівы”. Не ўсё, што ўнясла БГКТ у беларускае жыццё на Беласточчыне было добрае, але многа, вельмі многа зрабіла добрага! Думаю, што з часам гісторыя аб’ектыўна разбярэцца ў тым, чаму напрыклад І. Кірызюк адышоў ад беларусаў.

А так пры нагодзе хачу сказаць новаму (?) аўтару, нейкаму А. Вярбіцкаму, які ў агромністым артыкуле, як я зразумеў, дамагаецца ад БГКТ вярнуць камп’ютэры ў рэдакцыю „Нівы” (слушна!; на якіх варунках гэта іншая справа, можна ж дагаварыцца пры добрай волі з боку ўладаў БГКТ), а пры нагодзе закідае К. Майсеню брыдкую думку, што „... можа спадар Майсеня дайшоў да вываду, што зрабіў ён за-надта многа і цяпер, як тая Хвядора – то шые, то пора”. Няхай лепей А. Вярбіцкі не пора спадара Майсеню, бо хто гэта К. Майсеня вядома, а хто гэта А. Вярбіцкі, што пароць пробуе, невядома. Але можа фактычна трэба было б заняцца апісаннем спачатку фактаў, звязаных з мінулым БГКТ і яго дзеячоў, а потым праз сон нешта мармытаць, як А. Вярбіцкі ў артыкуле „Стог саломы беларускіх капіталістаў”?

14 сакавіка 1993 г.

Маеце рацыю, К. Майсеня нічога не пора. ‚»Пора” хто іншы. А другія бачаць гэта і не супрацьдзейнічаюць. А тое, што яны не памагаюць „пароць” не абазначае, што хтось іншы не распора. Прывёў я ў згаданым артыкуле два прозвішчы найбольш аўтарытэтных людзей у беларускім асяроддзі, якія маглі б эфектыўна супрацьставіцца марнатраўству. Яны, здаецца, маўчаць. Маўчанне – знак згоды. І дазволу. Яшчэ год таму назад я, так як і Вы, верыў у „добрую волю ўлад БГКТ”. Калі аднак знайшоўся блізка спорных камп’ютэраў і захацеў да гэтай „добрай волі” дакрануцца, аказалася, што яе там няма.

А. ВЯРБІЦКІ

# ЯШЧЭ ПРА ВЫБАРЫ

Праўду піша С. Іванюк („Czasopis, № 10/34), што выбар таго ці іншага пасла – гэта выбар той ці іншай палітычнай арыентацыі, а не стаўленне да беларускага кандыдата. „Што можа мне, канкрэтна, даць Антон Мірановіч, невядомы выбаршчыкам гісторык? – кажа саракагадовы селянін з Махнатага. – Беларусы паствaралі суполкі, і замест каб неяк аблегчыць гаспадараванне на зямлі, толькі самі багацеюць. Што іншае Цімашэвіч, ён можа мець уплыў на палітыку, а беларус, каб нават і быў выбраны ў Сейм якімсьці там спосабам то ніякага ўплыву на дзяржаўную палітыку мець не будзе”.

Маем затым вытлумачэнне пройгрышу Беларускага выбарчага камітэта. Палітык, які хоча быцы выбраны беларусамі, мусіць што дзень быць пры іх, клапаціцца пра іх справы, турбавацца станоўча і пастаянна, шчыра і ўважна ўслухоўвацца ў іх галасы. Фэстыны, святкаванні і фестывалі – гэта не спосаб, каб прыцягнуць, людзей да сябе. Святкаваць можна, але пасля цяжкай і плённай працы.

Кандыдаты ад Выбарчага камітэта Беларускага саюза – гэта або працаўнікі культуры і навукі, або бізнесмены. Многа зраблі для беларускай культуры Сяргей Лукашук (847 галасоў) Мікалай Бушко (1096 галасоў), шмат – Антон Мірановіч (5679 галасоў) для гісторыі Праваслаўнай царквы. Але што гэтыя ці іншыя кандыдаты зрабілі для жыхароў Беластока, Гайнаўкі, Бельска ці сялян Гайнаўшчыны? Якія прынялі яны меры каб без праблемаў мой субяседнік мог прадаць 20 тон бульбы ці здаць дзесяць свіней ў бойню, купіць мінеральные ўгнаенні за такія грошы, каб гаспадарыць аплачывалася? З гандлю з Беларуссю карысць маюць „Амега” з Бельска і „Пронар” з Нарвы. А што мае з гэтага беларус з Беласточчыны?

З таго факту, што існуюць беларускія арганізацыі, палітычную карысць павінны мець жыхары беларускіх вёсах і мястэчак Гайнаўшчыны або Бельшчыны, а не толькі беларускія бізнесмены, аб якіх так многа і доўга пісаў А. Барскі. Што яны карысць маюць – гэта вядома, але ніхто ніколі іх не будзе пхаць у Сейм, каб мелі яшчэ большую карысць. У рыначнай гаспадарцы, у дэмакратыі карысць мусіць быць узаемная.

Існуе ў асяроддзі беларускай інтэлігенцыі Беларускае дэмакратычнае аб’яднанне – партыя, якая паставіла перад сабой такія мэты, што аж невядома якія. Невядомыя яны шырэйшаму грамадсву. Адзін ці два дзеячы не створаць палітыкі. Да маіх канкрэтных прапаноў стварыць матэрыяльную базу для палітычнага і культурнага руху на Беласточчыне дзеячы аднесліся зусім абыякава, быццам не разумелі аб чым я гавару. Распрацаваны мною

праект дзецьці прапаў. А было на чым гаспадарыць, у кожнай гміне былі аддзелы БГКТ з памяшканнямі і тэлефонамі, але цяпер усё гэта дзесьці знікла. Хтосьці скарыстаў, а арганізацыі далей жабруюць, кланяюцца і просяць ва ўлад міласціну.

Беластоцкі раён павінен карыстацца гандлем з Беларуссю. Гэта вельмі вялікая крыніца дабрабыту. Зараз карыстаюцца гэтым паасобныя прадпрымальнікі, а не грамадства. Да гэтай справы трэба пераканаць ваяводскія ўлады, трэба пры гэтым ведаць як гэта зрабіць, але так, каб развіваліся не толькі адна ці дзве фірмы.

Добрай ідэяй быў Саюз гмін. Думаю, што ідэя не састарэла, трэба яе аднавіць. Набліжаюцца муніцыпальныя выбары, ужо цяпер трэба рыхтавацца да іх, весці палітычную працу.

Адным словам, калі падыход кандыдатаў на паслоў, і не толькі іх, але і іх арганізацый да праблем грамадства будзе шчыры, сур’ёзны і адчувальны, у Сейме будзем мець не аднаго пасла, а цэлы Беларускі клуб і нават Пятро Прышчэпка збярэ больш галасоў, чым два гады таму ў Гданьску.

14 лістапад 1993 г.

# Да палемікі праф. Вандала Арлян-скага і Барыса Штотыднёвага з Гле-бам Штодзённым у „Ніве” ад 21 жніўня 1994 г.

Калі чую, як за сцяной сварацца суседкі – гэта справа іх і іншых суседзяў. Ніколі такая сварка не цікавшь грамадскасці ўсяго жыллёвага блока, тым болей пасёлка або цэлага горада. Але калі ,сварацца” інтэлектуалы, хай сабе і беластоцкія, гэта прыкмета пазітыўная, тым болей, што нарэшце сварыцца эліта, самыя прафесары, як не кажы. Шкада, што скрываюцца яны за псеўданімамі.

Не найважнейшае тут, хто трапіць у анталогію „белавежскай” літаратуры (глядзі „Ніва” ад 31 ліпеня г.г. – „Багатая анталогія ці багаты даведнік?”): ці прафесіяналы, ці журналісты і карэспандэнты „Нівы”. Куды важнейшай справай з’яўляецца пачатак у нас літаратурнай і прафесіянальнай крытыкі. Бо цяпер я, бедны чытач творчасці „белавежцаў”, вельмі разгублены. Люблю чытаць вершы В. Шведа, М. Багдановіча, Я Коласа, Я. Чыквіна, А. Барскага, крыху менш Надзеі Артымовіч, Зосі Сачко, Міхася Шаховіча, а зусім не чытаю жыццёвых замалёвак „Аўроры” – Ірэны Лукшы, але не ведаю, ці не інакш трэба мне цікавіцца літаратурай. Калі бракуе крытычных публікацый, чытачу цяжка разабрацца, хто прафесіянал, а хто графаман, і ці творчасць „Аўроры” з’яўляецца „запхайдзірак” на старонках „Нівы”, ці наадварот, высакароднай мастацкай творчасцю, не гаворачы ўжо пра „публіцыстыку” М. Панфілюка. У каго шукаць думак як жыць, хто нас панясе па цудоўным Беластоцкім краі, адкрываючы краявіды, якія можа заўважыць толькі вока паэта і мастака, хто ўзбагачае душу чалавечую – гэта пытанні, на якіх адказ трэба шукаць у „белавежцаў”, але недай Божа ў графаманаў, бо ніхто не хоча асмяшыцца.

Асяроддзе „белавежцаў” вельмі сціплае, і сяброўскае, затым як можна крытыкаваць сябра. Гэта ж нават немаральна падкладаць свінню сябрам. Так наогул творцы ўспрымаюць крытыку. І таму на пальцах адной рукі можна палічыць крытычныя артыкулы ў „Ніве” ці ў календарах. З апошняй „Нівы” даведаўся я, што Васіль Петручук страціў асабістага крытыка з Дубіч-Царкоўных. Сумаваць не трэба, паявіўся другі прынцыповы крытык, Сцяпан Абух, які абухом б’е між вочы „Сумленню Народу”. Цікава, на які мазоль ці хутчэй абух, наступіў пісьменнік (якога той называе Сумленнем Народу) Сцяпану Абуху. Але як я ўжо сказаў, з гэтай „сваркі” можа нарадзіцца нешта новае, прагрэсіўнае, і не толькі ў беларускай літаратуры, але і ў грамадскім

жыцці. Пры на-годзе думаю, што молатамі і абухамі ў палеміках ваяваць не трэба. Заклікаю змагацца пры дамозе аргументаў і да таго еўрапенскім узроўні. Няхай старонкі „Нівы" поўняцца высокароднай крытыкай і цікавай публіцыстыкай. Усё ж Беласточы на жыве і трэба гэтае жыццё паказваць. Інакш песімістычныя замалёўкі „Аўроры" пра Анэту або Крыштафа або іншых нешчаслівых жыхароў мястэчак і вёсак стануць эрзацам літаратуры вельмі ўспрымальным, думаю не толькі для мяне.

25 верасня 1994 г.

# БЕЛАРУСЫ Ў ЗАПАВЕДНІК?

Нейкі Ежы Трачук (як падказваюць мне сябры з Гданьска, ён – перафарбаваны беларус), адкройвае частку Беласточчыны на поўдзень ад Нарвы для ўкраінцаў (глядзі: „Wiadomości Kulturalne”, nr 16). Кажа ён, што і так ужо доўга ўкраінцы цярпелі, калі палякі і дзеячы БГКТ абеларушчвалі і апалячвалі ўкраікцаў, пражываючых на Бельшчыне і Ганнаўшчыне. Для яго, і не толькі для яго, беларусы, якія жывуць на гэтых землях ад вякоў, з’яўляюцца ўкраінцамі, бо іхняя гаворка падобная да украінскай. А ці чэшская гаворка або славенская не падобныя да польскай,а балгарская да сербскай?

Пагранічча дзяржаў з’яўляецца пагранічам культур. Мяшаюцца не толькі людзі але і мовы. Думка, што на поўдзснь ад Нарвы жывуць украінцы, узнікла не так вельмі даўно. Група беларускіх дзеячаў – натхнёных паэтау і іншых артыстаў, якіх беларускія выдаўцы не хацелі друкаваць, пагневаліся і адвярнуліся ў бок украінцаў. Украінцы ахвотна падалі ім сяброўскую руку. Выходзіць, што брак палітычнай пранікліваcці тагачасных беларускіх дзеячаў-выдаўцоў давядзе да бельска-гайнаўскай сэцэсіі.

Можна махнуць рукой на балбатню Е. Трачука, калі б такія погляды былі адасобленыя і належалі да фальклору публіцыстычнай мыслі. Аднак падаюць яны на ўрадлівую глебу нацыянальнай палітыкі Саюза ўкраінцаў у Польшчы. Беларускія вёскі на ўсходняй сцяне якраз для ўкраінцаў з’явіліся „запаветнай зямлей.

Як Е. Трачук уяўляе сабе ўкраінізацыю беларусаў, пражываючых на поўдзень ад Нарвы? Замест беларускай мовы ўвесці у школы ўкраінскую? Стварыць у Бельску ці ў Гайнаўцы цэнтр украінскай культуры? А што з беларусамі? У запаведнік? І ўсё гэта адбылося б паціхеньку, без крыку? А калі без крыку, то за якія грошы можна купіць сумленне і нацыянальнасць? Бяльмо на вочы найшло ці розум камусьці адняло, ці як? Каму мармыцца новая этнічная „чыстка” ў сярэдзіне Еўропы?

P.S. 3 нагоды слаўнага юбілею – двухтысячнага нумара „Нівы” – супрацоўнікам рэдакцыі шчырыя прывітанні і пажаданні добрага здароўя на наступныя прынамсі дзве тысячы нумароў

23 кастрычніка 1994 г.

# ЯШЧЭ ПРА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ Ў ШКОЛАХ

„Ніва” пра беларускае школьніцтва піша многа. Умешвацца ў гэтыя справы можа мне і не трэба, але калі чытаю, што „Ніва” давяла да заняпаду беларускага школьніцтва на Беласточчыне, дык нервы пусцілі і вырашыў я дакінуць свае слова да гэтай дускусіі.

Як не кажы, але галоўная роля ў навучанні беларускай мовы прыпадае школе, а можа лепш сказаць, павінна прыпадаць школе. Гэта так відавочная справа, што аж Віктар Швед мусіў аб гэтым прыпамінаць у сваёй „Неюбілейнай прамове” настаўнікам беларускага ліцэя ў Бельску - Падляшскім.

Закід на пленуме ГП БГКТ у бок „Нівы”, што „аплёўвае” яна беларускае навучанне ў школах, з’яўляецца памяшаннем прычыны з вынікам. Ніхто на штодзень не ўяўляе сабе, што паслугоўваецца логікай Арыстоцеля, але прычына і рэзультат, гэта асноўная схема высновы. Не ведаю, ці вучаць цяпер настаўнікаў логікі. Па закідах у бок „Нівы” відаць, што нават калі і вучаць, то эфект гэтага навучання невялікі. Калі Педагагічны ліцэй у Бельску-Падляшскім рыхтаваў настаўнікаў да навучання, то логіка, якую выкладаў знакаміты прафесар Лявон Карачун, была асноўным прадметам для будучага настаўніка. А так, пры нагодзе, хачу падкрэсліць, што ліцэй рыхтаваў не толькі настаўнікаў, але і місіянераў, якія мелі несці культуру ў беларускія вёскі. І гэтыя маладыя людзі не толькі навучалі дзяцей, але рабілі, або прынамсі стараліся рабіць, нешта карыснае для грамадства вёскі.

Цяпер пэўна таксама ёсць настаўнікі, якія на вёсцы не толькі працуюць, хоць па праўдзе добры настаўнік не працуе, а служыць, і не ў іх бок ідуць гэтыя разважанні.

11 снежня 1994 г.

# ШТО МАЕ ДУМАЦЬ БЕЛАРУС?

Можна махнуць рукой, як гэта заўважае рэдакцыя на „народныя ўяўленні гісторыі Беларусі" Васіля Петручука (глядзі: „Просьба да барацьбітоў за Беларусь" у „Ніве" н-р 25 ад 23 чэрвеня 1996 г. Няхай такія ўяўленні аўтар сабе мае і спакойна дажывае глыбокай старасці. Але так думае значная колькасць беларусаў Беласточчыны і трэба трошкі шырэй глянуць на такое ўяўленне.

Савецка - бальшавіцкія падручнікі, з якіх мы ўсе засвойвалі беларускую мову, пакінулі трывалы след у свядомасці. Калі так глянуць назад, у далёкія школьныя гады, дык саветчына вылазіць з кожнай амаль чытанкі. Не беларушчына, спадар Васіль Петручук, а саветчына. Цікава, чаму ў гэтых падручніках пісалася аб адзіным ворагу – немцах? Калі паявіўся нейкі здраднік, дык была гэта адзінка, проста паршывая авечка ў грамадстве. Знойдзецца такая ў кожнай чарадзе. Мы цяпер ведаем, што не была гэта адзінка, але дзесяткі тысяч беларусаў адкінулі саветчыну і абаранялі беларушчыну. Пры нямецкай акупацыі ў школах беларускія настаўнікі навучалі беларускай мове. З таго не вынікае, што акупацыя была для народа добрая. Вынікае толькі тое, што беларусы пакарысталіся нагодай для нацыянальнага адраджэння. Бальшавікі аб гэтым ведалі і чырвоная партызанка ліквідавала школы разам з настаўнікамі пад шыльдай барацьбы з нямецкімі акупантамі.

Калі я, а думаю што не толькі я, пазнаёміўся больш-менш з гістарычнымі фактамі, звязанымі з існаваннем Беларусі ў час нямецкай акупацыі, пачаў ставіць зусім простыя пытанні. Чаму тысячы маладых беларусаў добраахвотна ішлі (нават дaслоўна) у беларускія вайсковыя згуртаванні, у беларускія школы? Шкада, спадар Петручук, што такіх пытанняў вы не ставілі. Можна сабе ўявіць тамашнюю рэчаіснасць: трыццатыя гады – масавыя рэпрэсіі, ліквідацыя ўсёй інтэлігенцыі, савецкая акупацыя Заходняй Беларусі – тое ж самае. Кожны горад мае свае Курапаты. Да таго ж немцы ў 1941 годзе былі першым саюзнікам СССР. Затым пытаю спадара Петручука, што меў думаць звычайны жыхар Беларусі пра сітуацыю, у якой ён апынуўся. А што мае думаць свядомы сучасны беларус, калі на сэрцы ляжыць яму існаванне беларускай мовы, дзяржавы, нацыі. Ці трэба мець многа розуму каб, лічыўшы сябе беларусам, не бачыць да чаго вядзе палітыка Лукашэнкі? Гэта відна як на далоні, але нашым некаторым грамадскім дзеячам бяльмо вочы закрывае.

І яшчэ адна справа. Набліжаюцца выбары ў Сейм. Беларускае асяроддзе выставіць сваіх маладых кандыдатаў, затым просьба да прыхільнікаў Лука-

шэнкі: не перашкаджайце ім. Калі вашы ўнукі і дзеці будуць лепш жыць, то і вы на гэтым скарыстаеце. Вы, што трэба збудаваць, збудавалі.

Трэба, каб грамадства ўсходняй Беласточчыны мела свайго прадстаўніка (не аднаго) у Сейме. І не для гонару ён мае там быць. Ёсць многа спраў да ўлад, каб людзі нашых вёсак і мястэчак маглі дастойна жыць. Магчымасці ёсць: ураджайная зямля і працавітыя людзі. Трэба да ўсяго гэтага вопыту і розуму. Думаю, што аднаго і другога хапае, як гэта іранічна Петручук напісаў, „барацьбітам за Беларусь”.

І яшчэ адна заўвага да наватарскіх думак спадара Петручука, калі піша што „сорам быць лізунамі «Салідарнасці»”. Думаю, што сорам быць лізуном каго-небудзь, не толькі „Салідарнасці”.

1 сакавіка 1996 г.

# ПРЫСЫЛАЙЦЕ СВАЕ ПРАПАНОВЫ

Дзеячы БГКТ дэкларуюць абыякавасць да палітыкі. Інакш кажучы, яны палітыкай не займаюцца, а займаюцца толькі культурай. З гэтай дэкларацыі вынікае, што праблемы штодзённага жыцця беларускага люду Беласточчыны гэта адно, і да гэтага нічога яны не маюць, а культура другое, і яна іх цікавіць. Нічога, што культура ў іх паняцці атаясамліваецца з арганізацыяй вакальных гуртоў і фэстаў, а не ў шырокім кантэксце. Думаю, што няхай так будзе. Калі людзі хочуць пачуць час ад часу беларускія песні і пабачыць нацыянальную вопратку – калі ласка. Але па-за ўвагай астаюцца штодзённыя клопаты сялян: дзе купіць танна мінеральныя ўгнаенні, дзе з карысцю прадаць збожжа, свіней, малако, бульбу і ўсё іншае, што прадукуе натура пры вялікай помачы гаспадароў нашых людных жа вёсак. Бо то не праўда, што ўся вёска абязлюднена. Цяпер горад нічога цікавага моладзі не прапануе. Затым існуе ўраджайная глеба для палітыкі і палітыкаў. Бо ці ж не палітычнай справай ёсць стварэнне магчымасці для развіцця і гаспадаркі, і культуры нашага люду? З другой стараны, наш люд мусіць бачыць у гэтым прагрэсе асабістую справу. Чую і чытаю пра нараканні нашых гаспадароў, што яны мусяць танна прадаваць сваю прадукцыю, што цэлы прыбытак забіраюць пасрэднікі. Адказ з'яўляецца толькі адзін – самому трэба арганізаваць продаж, каб стварыць канкурэнцыю для ўсякіх масцей пасрэднікаў. Але сам гаспадар гэтага не зробіць. Трэба яму памагчы. Але ці памогуць выбраныя тым гаспадаром паслы Плева, Малахоўскі ці папулярны сярод беларусаў Цімашэвіч? То ж відно як на далоні, што яны займаюцца вялікімі справамі, дзяржаўнымі, далёкімі ад штодзённага існавання гаспадара. І таму трэба цяпер разглянуцца за кімсь, хто не толькі ў сваім інатарэсе будзе займацца на дзяржаўным форуме справамі сялян. БГКТоўскі слой дзеячаў гэта літаратары, настаўнікі і іншыя. Ёсць асоба, якая ведае як функцыяніруе гаспадарка – гэта спадар Майсеня. Але ён мае ўжо сваю дзялянку – музей. Думаю, што сярод маладога асяроддзя Беларускага саюза знойдуцца прадстаўнікі і ў Сейм, і да арганізацыі інфраструктуры абслугоўвання сялянскай вытворчасці.

Красавік 1996 г.

# ФЭСТЫ І ПАСЛЫ

Фэст у Вярхлессі – спецыяльнае прывітанне старышнёй БГКТ паслоў Станіслава Малішэўскага і Сяргея Плевы. Купалле ў Белавежы – а як?! – удзельнікам быў пасол Сяргей Плева. Цяпер пачатак лета. На колькіх яшчэ фэстах старшыня БГКТ будзе вітаць, як спецыяльных гасцей, паслоў? Парламентарыі кааліцыйнай партыі выкарыстоўваюць кожную нагоду для таго, каб будучыя выбаршчыкі ведалі, каго пакінуць на выбарчым бюлетэні. Так больш-менш ствараецца імідж палітыка.

Але штосьці тут не так. Трэба паставіць некалькі пытанняў. Фэсты з'яўляюцца культурнымі мерапрыемствамі Таварыства, якое карыстаецца фінансавай падтрымкай Міністэрства культуры і мастацтва. Інакш кажучы, паслы выкарыстоўваюць грошы падаткаплацельшчыкаў для партыйнай дзейнасці. Калі так, дык чаму ж такой нагодай не карыстаецца БДА (Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне – гэта для тых, хто забыў, або не ведае гэтай абрэвіятуры)?

Другое істотнае пытанне ўзнікае само па сабе. Чаму паслы прычапіліся да БГКТ, як мухі да мёду? А можа наадварот? Які інтарэс мае БГКТ, каб папулярызаваць паслоў СЛД? Ці гэта дзякуючы ім арганізуюцца фэсты? Гэта ж аўчынка вырабу не варта. Колькі ж трэба пры гэтым натрудзіцца, наездзіцца па вёсках, каб Плева з таварышамі ўвайшлі ў Сейм. І найважнейшае пытанне: якую канкрэтную карысць мае грамадскасць вёсак і мястэчкаў усходняй Беласточчыны ад таго, што іх прадстаўніком з'яўляецца пасол Плева і яго сябры? Ці апошнім часам паменшала колькасць беспрацоўных? Ці селянін можа беспраблемна збыць сваю прадукцыю? А можа дзякуючы ім прыбыло дарог? А што ў галіне асветы і культуры зрабіў пасол? А што з беларускай культурай? Ці намагаецца ён заснаваць Беларускі інстытут культуры? Калі хтосьці сэнсоўна адкажа на гэтыя пытанні, буду яму ўдзячны за гэта, а суседа буду намаўляць галасаваць на левых дэмакратаў, а канкрэтна на пасла Плеву і таксама на спадара Я. Сычэўскага за палітычны нюх. Буду галасаваць за праграмай, а не супроць „Салідарнасці".

1 мая 1996 г.

# ПАЛЕМІСТЫ

Міхал Гурыновіч у 30 нумары „Нівы” ад 28 ліпеня гг. піша, што „polemika wymaga kultury słowa”. Напэўна так, але, як спяваў яўрэй Тэўе-малочнік з вядомага кінафільма паводле аднайменнай аповесці Шолам-Алейхема, кожная справа мае два бакі. З аднаго боку маем культуру слова, з другога — сутнасць справы. Можна весці палеміку культурна так доўга, што поглядаў аўтараў ніяк не даведаешся. Умелыя палітыкі, каб перамагчы праціўнікаў, карыстаюцца метадам „na przetrzymanie”. У выніку доўгай і ўмелай дыскусіі, калі праціўнікам зусім паблытаюцца аргументы, прапановы прымаюцца аднадушна.

А справа, пан Міхал Гурыновіч, зусім простая: ці мае існаваць самастойная, вольная і дэмакратычная Беларусь, ці не? Калі так, то простым вокам відаць, хто хоча незалежнай Беларусі: Лукашэнка з кампаніяй, ці дэмакраты з апазіцыі.

Панясло таксама другога палеміста Юстына Пракаповіча. І хаця ён так горача палемізаваў з аўтарамі лістоў у „Ніве” н-р 24, то нікога канкрэтнага не лаяў. Але пан Міхал Гурыновіч піша, што „w tym opętańczym tańcu oskarżeń biedny w rozwagę, a bogaty w nienawiść spadar Prokapowicz zapomniał...”, а далей: „Tymczasem sam nie wiadomo, czy uczęszał do jakiejś szkoły. Tak to bywa. Jak Pan Bóg chce kogoś pokarać, to mu rozum odbiera. I unieszkodliwił szare komórki spadara Prakapowicza”. На падставе гэтых некалькіх сказаў можна канстатаваць: не смейся, гарох не лепшы за бабы. Пан Міхал Гурыновіч павінен ведаць, што ваяваць можна толькі з поглядамі палеміста, ніколі з ім самім і з яго szarymi komórkami, бо за гэта пагражае суд.

Чэрвень 1996 г.

PS. У адносінах да Міхала Гурыновіча прымяняў я форму пан, а не спадар, паколькі ён у сваёй палеміцы слова спадар ужываў з нейкай зласлівасцю і ironіяй. Значыць, выгадней яму быць панам або Міхаілам, чым проста і па-беларуску спадаром. М. К.

# ЯК ВЫЙСЦІ З КРУГА БЭГЭКАТЫЗАЦЫІ

Яўген Міранові піша („Ніва” н-р 34), што тое, „што на кожным фэсце рэкламуецца пасол Плева, для будучыні беларускасці не мае вялікага значэння”. Для будучыні так, не мае. Для сучаснасці - мае. І то яшчэ як. Добра, што Яўген Мірановіч клапоціцца пра будучыню, але беларуская „rzeczywistość skrzeczy”, не будучыня, аб чым піша ў далейшай частцы свайго артыкула галоўны рэдактар „Нівы”.

Каб даказаць уплыў улады, а паслы належаць да ўладных структур, на гаспадарчую, перад усім, рэчаіснасць Беласточчыны, не трэба шукаць моцна абгрунтаваных аргументаў. Затым, калі ўжо пры нагодзе шматлікіх фэстаў рэкламуюцца кандыдаты ў Сейм, то няхай гэта будуць кандыдаты беларусаў, якім не абыякава будучыня беларускасці. Думаю, што спадару Сычэўскаму яна таксама не абыякава. Так, так! Нагоду для папулярызацыі сярод выбаршчыкаў сваёй асобы, як кандыдата ў Сейм, спадар Сычэўскі мае добрую. Калі не ў Сейм, то ў Сенат РП.

Цікава, чаму не дагаварыўся з левымі дэмакратамі (СЛД), што гэта ён з’яўляецца найлепшым кандыдатам на пасла, і няхай беларусы выбіраюць беларуса. Калі аб такой прапанове ён нават не падумаў, то падказваю, а нюх у мяне добры, што падумаць прынамсі трэба. Нічога, што спадар Сычэўскі пакуль што палітыкай не цікавіцца. Калі ўжо ён яе робіць, то і не аглянецца, як яна ўцягне яго ў свае лапы.

Добрае слова прыдумаў Я. Мірановіч – „бэгэкатызацыя” – на акрэсленне характару дзейнасці большасці беларускіх арганізацый. Мова беларуская аказваецца так сціплая, як англійская – адно слова „задрыпанец” і ўсе ведаюць хто такі, адно слова „бэгэкатызацыя” і вядома, які характар мае дзейнасць.

Каб выйсці з круга бэгэкатызацыі ў дзейнасці, трэба інтэлектуальнага штуршка, творчасці і не толькі ў форме сацыялагічнага адлюстравання нашай рэчаіснасці. Для адлюстравання рэчаіснасці патрэбна адпаведная для таго метадалогія, ну і ахвота яшчэ, каб усё гэта апісаць. Для змянення рэчаіснасці трэба мець пакрысе рысы дзеяча, палітыка, інтэлектуала, журналіста, ну і вешчуна. Калі патрэбны вяшчун, то і аптымізм. Але, як бачым, вешчуноў і аптымістаў вецер гісторыі выдзьмуў з нашага асяроддзя!

жнівень 1996 г.

# КРЫШКУ ПРА ПАЛІТЫКУ

Некалькі рэфлексій Грышы Мароза аб палітыцы („Ніва” н-р 37), што быццам бы мужык „палітыкі і перадвыбарчых абяцанняў мае па горла”, заінспіравалі мяне глянуць на справу палітыкі і палітыкаў крыху шырэй, чым горла мужыка.

Спачатку трэба адказаць, што такое палітыка? Паводле „Słownika języka polskiego”: „polityka – działalność władzy państwowej, rządu w dziedzinie społecznej, gospodarczej, kulturalnej, wojskowej i innych, dotycząca spraw wewnętrznych państwa lub stosunków z innymi krajami jak również stosunków klas, grup społecznych”.

Па-мойму палітыка - гэта спосаб здзяйснення мэты, пастаўленай партыяй ці іншай групай грамадзян, пры дапамозе канстытуцыйнай улады. У дэмакратычнай дзяржаве, а такою з’яўляецца Польшча, выбаршчыкі маюць магчымасць уплываць актыўным удзелам у галасаванні на выбар мэты палітыкі. Мэту наогул акрэслівае партыя або іншая група. Калі грамадскасці ў большасці адпавядае пастаўленая мэта, выбірае яна сваіх прадстаўнікоў (паслоў, радных, сенатараў) для стварання законаў, каб дасягнуць пастаўленую мэту. Так больш-менш выглядае дэмакратыя ў дэмакратычнай дзяржаве. Затым, калі прымем, што фактычна мужыкі маюць палітыкі і перадвыбарчых абяцанняў па горла, то трэба разглянуць дзве гэтага прычыны. Першая, што мужыкі прызвычаіліся праз дзесяткі гадоў існавання так званай „камуны” да таго, што партыя (PZPR, ZSL) сама акрэслівала мэту (яна пастаўленая была ідэалогіяй), найлепшую паводле яе для грамадскасці, і акт галасавання быў толькі гэтага фармальным пацвярджэннем. Другая прычына – гэта проста разгубленасць. Мінула шэсць гадоў дэмакратыі. Партый маем многа. Розныя групы людзей ставяць іншыя мэты для сваіх прадстаўнікоў ва ўладныя структуры. Сяляне, і гэта зразумела, імкнуцца атрымліваць танныя крэдыты, бо працэс прадукцыі на вёсцы доўгі - ад вясны да восені, мець магчымасць танна „прадукаваць” і дарага прадаць, мець дармовага доктара і атрымліваць рэнту, калі міне ўжо адпаведны час працы на гаспадарцы. Але калі селянін хоча дарага прадаць харчовыя прадукты, то ён не выказваецца за дарагавізну, а толькі хоча найбольш карысна прадаць сваю вытворчасць. Такім чынам паўстае канфлікт т.зв. інтарэсаў.

І тут уключаецца найлепшы рэгулятар канфліктаў, слаўны і справядлівы – рынак. Ён зусім не мае сумлення. Таму лепшыя прадпрыемствы выцясняюць з рынку горшыя. У рынparam эканоміцы мужыцкая гаспадарка таксама падлягае законам рынку. Роляй палітыкаў павінна быць стварэнне магчымасці

існавання ўсім суб’ектам рынку, а перад усім людзям, якія жывуць з працы, не капіталу. Маю на ўвазе людзей, якія працуюць у так званай надбудове: асвеце, навуцы, ахове здароўя, ахове правапарадку (паліцыя), ахове дзяржавы (войска) і іншых.

Нас, значыць беларусаў, цікавяць усе галіны палітыкі, так як кожнага грамадзяніна дзяржавы. Тады выбіраем у парламент прадстаўнікоў такой партыі, якая гарантуе нам найлепшыя ўмовы жыцця. Але грамадскасць не вольная ад нацыяналізмаў у найгоршым, ксенафабічным іх варыянце. Пагражае ён не толькі нацыянальным меншасцям, але і ўсякім меншасцям, проста іх ліквідацыяй, ці то ў выніку асіміляцыі, ці то ў выніку прымусовай міграцыі, ці то фізічнай ліквідацыі (галакост яўрэяў).

Нам, беларусам, пагражае поўная асіміляцыя з польскай большасцю. Зразумелы быў бы гэты працэс, калі б была нас жменька, але беларусаў пражывае ў Польшчы некалькі соцень тысяч. Жывуць яны кампактна ва ўсходняй Беласточчыне, маюць, пакуль што, сваю мову, асвету, культуру і т.д. Маюць сваю шматтысячную інтэлігенцыю і ёсць некалькі дзесяткаў тысяч грамадзян свядомых сваёй нацыянальнасці. Затым, так як кожны народ, таксама і беларусы хочуць існаваць, развівацца і тварыць, перад усім у сваю карысць, але і ў карысць усіх жыхароў дзяржавы. Калі так, то трэба выбраць, пры нагодзе выбараў, такую партыю, такіх палітыкаў, якія гарантуюць свабоду і магчымасць існавання беларускай меншасці. Калі ўсяго гэтага маем, як піша Грыша Мароз, па горла, тады так як беларусы ў Рэспубліцы Беларусь, якія галасавалі, каб быць расейцамі, і мы загаласуем, каб быць палякамі. Потым толькі ад часу да часу прыедзе ў вёску фальклорны калектыў і прыпомніць нам нашу быль.

Верасень 1996

# ЦІ ТРЭБА ЗАВОЗІЦЬ КУЛЬТУРУ?

Нарэшце Грыша Мароз, актыўны калісь карэспандэнт „Нівы”, адазваўся публічна інфармацыяй, што „Лявоны” наведалі Старое Беразова („Ніва” н-р 37 ад 15.09.1996 г.). Цешыць, што шматгадовы карэспандэнт піша ў наш тыднёвік і можна даведацца яшчэ пра жыццё і штодзённую турботу і радасці працавітых сялян. Але не вельмі разумею аўтара, калі ён піша „што прывезлі (значыць Янка Сычэўскі і Валя Ласкевіч – М. К.) нам хаця жменьку роднай культуры”. Значыць, у Старым Беразове няма ўжо роднай культуры і трэба яе завозіць, ці як? Мне здавалася, што родная культура існуе яшчэ на вёсцы, зусім не апалячаная, і вазіць яе з горада не трэба. З карэспандэнцыі вынікае, што на ніве народнай культуры ў вёсках Беласточчыны пустыня, а яе аазісам з’яўляецца БГКТ. Не ведаю, чаму такая думка бытуе ў народзе, хаця ёсць яшчэ іншыя аазісы народнай культуры, як хаця б „Белавежа”, „Ніва”, „Czasopis”, Беларускае гістарычнае таварыства, школы з беларускай мовай навучання, гмінныя асяродкі культуры, некаторыя цэрквы са свядомымі сваёй беларускасці святарамі, беларускія – радыё- і тэлеперадачы, навуковыя ўстановы, культурныя арганізацыі беларусаў. Але няхай ужо будзе так, як прапагандуюць у народзе дзеячы БГКТ, што яны – адзіныя сейбіты народнай культуры на фэстах, хаця гэта пярэчыць фактам.

Вядома, кожны носіць свой штодзённы горб, і не так ужо лёгка пражыць цяпер з дня на дзень, але каб пісаць што „мужыку на вёсцы не хапае гумару, песняў і жартаў” – гэта надта смелы вывад, мякка кажучы. І адкуль аўтар ведае, што ў народзе самое нараканне? Калі ўважліва паглядзець навокал, то відаць, што вёскі прыгажэюць, конікаў з драбінчастымі вазамі са свечкай шукаць, пісьманосцы рэнты пастаянна прыносяць, хлеб і да хлеба прывозяць, зямля аблагом не ляжыць, абсталяванне машынамі гаспадарак поўнае. Апрача водаправода Старое Беразова і Махнатае (не ведаю як іншыя вёскі) будуць мець ачышчальню сцёкаў. Прагрэс наступае. Відаць гэта простым вокам. А што мужыкі наракаюць?! Наогул заўсёды наракалі, і пэўна будуць наракаць. Усё гэта ўзялося ад адпаведнай дзяржаўнай палітыкі. Няпраўда, што такая адпаведная палітыка, якая вядзе да прагрэсу, не залежыць ад мужыкоў на вёсцы. Аўтар сам з’яўляецца гмінным радным, то ведае, што гмінная рада мае вялікі ўплыў на гмінную палітыку. Затым пытаю, якой палітыкі і перадвыбарных абяцанняў мужык мае па горла? Той з Варшавы, Беластока, ці той з Гайнаўкі?

Скажыце, спадар Мароз, з рукой на сэрцы, чаму ў вас „цяпер адзіная разрыўка – гэта беларускі фэст”? Умовы для культурных мерапрыемстваў у

Старым Беразове маеце. Харошы, аграмадны дом культуры можа служыць не толькі раз ці два ў год для арганізацыі фэсту? Ці трэба чакаць, каб хтось прыехаў і сарганізаваў вам разрыўку? Чаму не. Можа прыехаць, але цяпер усё каштуе. Можна наладзіць нават прыезд і Майкла Джэксана, не кажучы пра Марылю Радовіч, але хто гэты прыезд сфінансуе? Хто?

Кастрычніка 1996 г.

P.S. Цікава, ці паслы Плева і Малішэўскі былі на фэсце? Нічога аб гэтым карэспандэнт чамусьці не піша.

# РАЗВАЖАННІ ПРА ДЭМАКРАТЫЮ

Такіх як Ул. Сідарук, якія не вераць „нікому і ні ў што, ні ў дэмакратыю, ні ў грамадскую справядлівасць”, многа. Яны – пакрыўджаны лёсам і жыццём, тым болей цяпер, калі самому за той лёс і жыццё трэба адказваць і... думаць. Найлепш было ў час ваеннага становішча. Пэўна, былі недахопы, але за нас тады думала і стварала нам умовы жыцця ўлада. Яна пераняла ўсе нашы клопаты. На ўсе патрэбныя для жыцця прадукты былі карткі. Вечарамі чалавек сядзеў у хаце, пры дзецях і жонцы. Усе больш-менш атрымлівалі аднолькавую зарплату: хто за працу, хто за тое, што хадзіў на працу. І так цяклі гады, людзі прызвычаіліся да такой сітуацыі. Але няма так, каб заўсёды было лёгка. Такі падыход да рэчаіснасці атрымаў паражэнне. Чалавек, аднак, такі звер, які хоча быць вольным. Вольным можна быць на розныя спосабы. Можна, напрыклад, выехаць у адлюднае месца і стаць свабодным ад іншых людзей, але можна так сарганізаваць грамадскасць, каб не перашкаджаць суседу, каб шанаваць устаноўленыя грамадствам законы, каб у турму саджаць злачынцаў, а не вальнадумцаў, каб была магчымасць працаваць і развівацца, каб была магчымасць тварыць і адпачываць стомленым, каб была магчымасць лячыцца хворым і т.д. Проста – каб была дэмакратыя. У дэмакратыі можна нават не верыць „у дэмакратыю”.

PS. Так пры нагодзе разважанняў пра дэмакратыю, дарагі сп. Сідарук, укладаеце ў мае словы свае думкі. Пра гразь і гадкія эпітэты нават я і не падумаў. З таго, што я аптыміст, не вынікае, што я сыты, а гэта не значыць, што я галодны і не пра мяне ідзе тут гаворка.

Студзень 1997 г.

# УСЕ НАРАКАЮЦЬ

Селянін з багатай вёскі Грыша Мароз, рабочы-пенсіянер Уладзімір Сідарук і інтэлігент-пенсіянер Васіль Петручук глядзяць на навакольную рэчаіснасць вачамі тэлебачання. І ўсе наракаюць. Ніякай радасці, а толькі турботы. Грыша Мароз хвалюецца таму, што „сяляне (...) ужо разбагацелі: свірны поўныя збожжа, капцы трашчаць ад бульбы”. Некалькі радкоў ніжэй піша: „Людзям жывецца штораз горш. І ў горадзе, і на вёсцы, усюды аднолькава”. Не ўсім, піша Мароз, але большасць „канцы з канцамі ледзь зводзіць”. Нараканне гэтае разумею так: брак грошай і на вёсцы, і ў горадзе. Свірны поўныя, але грошай няма. Можа непатрэбна гэта прыпамінаю, але восенню дзяржава купляла і збожжа, і бульбу, але няхай будзе па Грышаваму, што ад прыбытку галава баліць. Аб тым, як жывецца ў горадзе, Грыша Мароз ведае з тэлебачання, калі піша, што „ў горадзе, калі бяда прыпячэ, людзі маюць як ратавацца: за транспаранты і на вуліцу!” Шкада, што я аб гэтым не ведаў, можа і мне палепшылася б, калі б выйшаў на вуліцу з транспарантам.

Рабочы-пенсіянер турбуецца з-за вандалізму сучасных хуліганаў, якія разбураюць чыгуначныя прыпынкі, абліваюць фарбамі грамадскія ўстановы ці замуроўваюць жывых людзей у будынку. Праўда. Трэба аб вандалізме пісаць. Але Уладзімір Сідарук прычыны вандалізму бачыць у дэмакратыі: „На маю думку, цяперашняя дэмакратыя ні ў чым не розніцца ад камуны”. Значыць, за камуны таксама быў „вандалізм і анархія”? Не разумею. З аднаго боку, у час камуны будаваліся „дарогі, школы, святліцы...”, і гэта добра, з другога боку – дэмакратыя не розніцца ад камуны, значыць, таксама будуюць „дарогі, школы, святліцы”? Толькі вандалізм дакучае, ці як? Адным словам, усё паблытана ў карэспандэнцыі. Так як у тэлебачанні. У ім ёсць усё і аб усім таксама і ў допісе Уладзіміра Сідарука.

Васілю Петручуку немагчыма забыцца пра сваё дзяцінства. Праўда, кожны меў якоесьці дзяцінства – горшае, лепшае. Але ці аб гэтым трэба пры кожнай нагодзе прыпамінаць? Можа і так, але можа і не.

Грыша Мароз крануў вельмі важную справу збыту сялянскай прадукцыі. Выхадам не можа быць прапанова карэспандэнта, каб дзяржава скупляла ўсё тое, што селянін мае ў свірнах. Гэта ўжо было. Дзяржава мае ствараць умовы сельскай гаспадарцы, а збытам і прадукцыяй мае займацца селянін або залежны ад яго пасрэднік. Бульбу, збожжа, мяса можна перапрацоўваць на прадукты на месцы. Трэба стварыць толькі адпаведную інфраструктуру. Але, думаю, справа ў адным слове „толькі”. Каб гэта стварыць на месцы, вёсцы патрэбны розум і капітал, а не нараканне. Чытаю, што мільёны долараў заграцічнай помачы на развіццё інфраструктуры ляжаць у банках нявыкарыстанымі. Чаму? Можа таму, што лепш наракаць на дэмакратыю.

Люты 1997 г.

# ФАЛЬШАВАННЕ ГІСТОРЫІ

Зацікавіў мяне адзін, даслоўна адзін, сказ у тэксце „Pierścionek Jagiełły" В. Каліцкага („Gazeta – Magazyn" nr 23/222). Аўтар піша: „Stąd wziął się pomysł wydania Jadwigi za wielkiego księcia litewskiego Jagiełłę, po uprzednim ochrzczeniu litewskiego (вылучэнне – М. К.) władcy i jego pogańskich (выл. – М. К.) poddanych". Праўда, гэта не яго сцвярджэнні, бо пры канцы артыкула падае крыніцы, якімі ён карыстаўся, але аднак аўтар не дае ніякіх абвяржэнняў. З таго, аб чым піша В. Каліцкі, вынікае, што Ягайла быў язычнікам, і што яго ахрысцілі тады, калі жаніўся з Ядвігай, каралевай Польшчы (у 1386 годзе). Чытаючы тэкст В. Каліцкага насоўваюцца самі па сабе наступныя пытанні: ці фактычна так было, як піша аўтар, ці толькі ён так думае, што так было?

Павел Ясеніца ў кніжцы „Polska Jagiellonów" піша: „12 lutego Jagiełło triumfalnie wjechał do Krakowa, 15 lutego przyjął katolicyzm". Затым „przyjął katolicyzm" абазначае тое самае, што ахрысціўся, быўшы язычнікам? Як гэта ёсць сапраўды? З аднаго боку ведаем з гісторыі Беларусі, што Ягайла быў праваслаўным, і што яго падданыя то былі хрышчаны, то ад веры хрысціянскай адказваліся. З другога боку ў каталіцкай свядомасці ў Польшчы існуе пераканане, што цывілізацыю ў Вялікае княства Літоўскае ўнесла унія з Польшчай.

Затым як яно ёсць? Думаю, што не толькі я разгублены. Аказваецца, што пункт гледжання гісторыкаў залежыць не ад аб'ектыўнай праўды, а ад таго, каму яны служаць. На шчасце, існуе ў Беластоку Беларускае гістарычнае таварыства, і спадзяюся, што згуртаваныя ў ім гісторыкі не дапусцяць да зафальшавання праўды аб нашых суадносінах з заходнім суседам, з якім тварылі мы супольную магутную дзяржаву.

Сакавік 1997 г.

# LITWO, OJCZYZNO NASZA

Чыя з’яўляецца традыцыя гістарычнай Літвы, іначай Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ)? Калі чытаю эсэ Томаса Вэнцлёвы („Gazeta Wyborcza” ад 5-6 ліпеня г.г.), а тым болей „Deklarację twórców kultury Polski i Litwy” (там жа), то мая разгубленасць у тэме гістарычнай дзяржаўнасці Беларусі паглыбляецца. У дэкларацыі чытаем: „Niemała była rola kulturotwórcza Polski i Litwy w stosunku do ziem zachodnioruskich, które wówczas wchodziły (выл. М.К.) w skład obu skonfderowanych państw. Formujące się (выл. М.К.) tam narody ukraiński i białoruski wzbogacały pod wpływem kultury łacińskiej swoją nasyconą pierwiastkami grecko-bizantyjskimi rodzimą kulturę, zbliżając się do Europy”. Чытаем там і здзіўляемся, што „ziemie zachodnioruskie (...) wchodziły w skład” ВКЛ. Не стваралі ВКЛ, толькі „wchodziły”?! Суседзі, як могуць, зафальшоўваюць гісторыю Беларусі пішучы, што народ беларускі (украінскі таксама) фармаваўся на заходнерускіх землях. Гэта як бы польскі фармаваўся на землях усходнегерманскіх, і так, як бы летувіскі народ не фармаваўся на жэмайцкіх землях, тады калі беларускі ўжо здавён-здаўна існаваў.

Цікава, што ў свядомасці сучасных сустракаецца думка, што народ як і дзяржаўнасць Беларусі сфармаваліся дзесьці пры Лукашэнку.

З другога боку Чэслаў Мілаш так піша ў той жа „Gazecie Wyborczej”: „Z wielkim zainteresowaniem czytałem w piśmie „Lithuania” rozprawę profesora Bardacha o wpływie prawa rzymskiego na Statuty Litewskie oraz profesora Lazutki o języku Statutów i Metryki Litewskiej. Przychylam się do jego tezy, że nie był to (język białoruski – był – M. K.), jak niektórzy utrzymują, język kancelaryjny, ale także mówiony (выл. М.К.), używany przez klasy wyższe Wielkiego Księstwa Litewskiego i to nawet na Żmudzi”. І далей: „formuły prawne były pisane w starym białoruskim i cyrylicą”. Затым, як было? Народ беларускі фармаваўся, і ўжо пры нагодзе, каб было ўсё ўпарадкавана (беларусы любяць парадак) стварыў пісьмовую беларускую мову, штудзіраваў рымскае права, каб добра і ўмела, згодна з заходнімі стандартамі напісаць Статут і ўпарадкаваць штодзённае жыццё сваіх грамадзян?! Статут, які стаў узорам для ўсёй Еўропы, як трэба ствараць законы?!

Красавік 1997 г.

# ТЭЛЕБАЧАННЕ І ВЫБАРЫ

Калі набліжаецца тэрмін выбараў у Сейм, немалая калатуша робіцца вакол перадвыбарчай кампаніі. Галоўным і цэнтральным месцам гэтага з'яўляюцца гэтак званыя сродкі масавай інфармацыі, а перад усім Беластоцкае тэлебачанне. Дзякуючы тэлебачанню можна зусім танна дабрацца ў хату да кожнага выбаршчыка і пераканаць яго, каб свой голас аддаў на каго трэба. А калі адзіным уласнікам дзяржаўнага ці бадай публічнага тэлебачання з'яўляецца грамадства, якое не экуменічна ставіцца да праваслаўных, і наогул да беларусаў, то думаю, што намаганні Беларускага саюза мець сваю аўтаномную рэдакцыю прыгаворany на няўдачу.

Аднак здавацца не трэба, нягледзячы на тое, што саюзнікам дырэктара Беластоцкага тэлебачання з'яўляецца сам спадар Ян Сычэўскі. Не вельмі разумею пазіцыю старшыні БГКТ на спатканні кіраўніцтва Беластоцкага тэлебачання з журналістамі, якое адбылося 12 мая г.г. („Дэбата па-беластоцку" — А. Максімюк — „Ніва" № 21). Спадар Ян Сычэўскі, паводле справаздачы А. Максімюка, гаворыць, што беларуская праблематыка і мова можа здамінаваць перадачы ў тэлебачанні, калі б праўленне тэлебачання ўзяло пад увагу пастулаты і намаганні Беларускага саюза. Клопат Сычэўскага пра польскі этнас у Беластоцкім тэлебачанні будзе зразумелы тады, калі глянем на справу з пункту гледжання барацьбы старшыні БГКТ з Беларускім саюзам. Але, ці гэта абазначае, што спадар Сычэўскі будзе мець большы доступ да перадач у тэлебачанні? Калі так, то шанц увайсці ў Сейм РП спадару Сычэўскаму пабольшваецца. Але ці хтосьці падумаў, якім гэта адбываецца коштам?

Калі пішу, што не вельмі разумею пазіцыю спадара Сычэўскага, то маю на ўвазе тое, што сваё становішча ўяўляе як старшыня БГКТ. Затым трэба спытаць, ці БГКТ адмоўна ставіцца да беларускай рэдакцыі ў Беластоцкім тэлебачанні? І гэтага не разумею, як можа беларуская арганізацыя ставіцца адмоўна да беларускай рэдакцыі?

май 1997 г.

# АБ РОЗНЫХ ПОГЛЯДАХ

Можна цешыцца і тым, што шклянка да палавіны поўная. Такая сітуацыя цешыць аптыміста. Але ж можна ад клопату захварэць, што яна ад палавіны пустая. Гэтае ўжо датычыць песіміста. Як бачым, гэта два розныя погляды на адзін і той самы факт. Так і з адносінамі да розных з’яў штодзённага жыцця. Можна глядзець на іх з розных бакоў.

Няма агульнай справядлівасці. Агульная справядлівасць гэта абсалют. А Ул. Сідарук спаць не можа, што яе няма. Так ужо той свет створаны, што характэрны ён разнастайнасцю. Але ці не трэба змагацца са штодзённай несправядлівасцю, каб дасягнуць абсалют? Вядома, што трэба. Як піша ў адгалосках шматгадовы карэспандэнт („Ніва”, № 25), ваюе ён ужо многа гадоў. Ну і добра. Значыць, нядобра, што так доўга трэба змагацца за дабро і каб было яшчэ лепш, а добра таму, што ёсць людзі, якім неабыякавая ўсялякая несправядлівасць. Дабро, аднак, гэта не раз устаноўлены абсалют, гэта працэс, так як і зло.

А цяпер другая справа, асабістая, хаця я стараюся асабістых спраў не кранаць. Спадар Сідарук, як і Грыша Мароз, на словы, нават і не крытыкі, а толькі проста сяброўскай заўвагі, што на свет глядзяць песімістычна, проста напалі на мяне з кулакамі слоў. Аж баюся ехаць на бацькаўшчыну, каб не аплявушылі мяне там сапраўднымі кулакамі.

Трэба ведаць, што вы, карэспандэнты, не звычайныя, такія сабе сяляне, як той Грышаў сусед ці іншы сябра пенсіянера Сідарука. Вы, дарагія, з’яўляецеся проста шматгадовымі публіцыстамі, якія выказваюць публічна акрэсленыя і часта рашучыя погляды. І што, хочаце быць прытым „святымі каровамі” публіцыстыкі? Ці нельга вашых поглядаў кранаць, бо лепш ведаеце, што робіцца на Гайнаўшчыне, чым якісь там задрыпанец з Сопата?! У тым і заключаецца дэмакратыя, што і я магу дакінуць некалькі слоў да таго, што пішаце і аб чым пішаце.

Пэўна. Не пішу карэспандэнцый аб тым, што тут у нас, над морам дзеецца. Але, хтосьці не піша, каб пісаць мог хтось. Калі так грунтоўна пераглянеце „Ніву” ці „Зорку”, то нашы наймалодшыя карэспандэнты апошнім часам многа пішуць пра Гданьск. І не толькі яны. Лена Глагоўская што і раз дасылае інфармацыю пра нашых тут беларусаў. То куды мне яшчэ пхацца перад такіх слаўных карэспандэнтаў. Прытым я зусім не карэспандэнт, толькі — просты чытач „Нівы”, які, як Грыша Мароз іранічна піша, „сваё гняздзечка звіў дзесьці над морам”. Кожны, як гаворыцца „orze jak może”. Адзін над морам, другі ў Старым Беразове.

Няпраўда, што я хацеў кагось вучыць як трэба гаспадарыць. Праўда, каб гаспадарку добра весці, трэба мець вопыт і розум. Праўда, што ўвосень дзяржава скупляла збожжа, пра бульбу не ведаю; можа так, можа не. Праўда, што камуна знішчыла сельскую гаспадарку (слаўныя калгасы). Няпраўда, што дзякуючы (?) камуне ўцёк я ў горад. І так можна цягнуць доўга: праўда, няпраўда. Я пісаў, што чакаць таго, што дзяржава мае заняцца сельскай прадукцыяй, гэта проста страта часу і гэтая думка выводзіцца з даўнейшых часоў. Калісь дзяржава фактычна займалася ўсім. Нават мною. Усе мелі больш-менш аднолькавыя грошы. Кожны хлам прадаваўся як цёплыя булачкі. Тавар прадаваўся па блату.

Калі нехта не зразумее таго, што я ахвотней куплю, для прыкладу, кілаграм чысценькай, у сетачку ўпакаванай бульбы за 50 гр. чым той самы кілаграм бульбы з пяском, рознага сорту і палавіну з таго яшчэ выкіну, за 25 гр., то не разумее сучаснасці. Я за бульбу плачу сваімі грашыма, не падараванымі мне, а толькі такімі, якія я зарабіў за сваю працу. Прытым, я купляю тую ж бульбу не таму, каб хтось мог яе прадаць, а таму, каб зварыць яе на абед. Вось і ўся праўда. І ні пры чым тут тое, што я, як сялянскі сын, павінен зразумець як цяжка вырасціць гэтую бульбу. Я разумею, што цяжка. Добра было б, каб нехта зразумеў, што цяжка і зарабіць грошы, каб яе купіць. Але не пра мяне ж тут ідзе гаворка, хоць Грыша Мароз невядома чаму ў той бок спіхае дыскусію. У горадзе жыве больш-менш 70% жыхароў Польшчы і кожны з іх мае такі клопат як і я, таксама жыхар горада. У тым то і праблема, як пагадзіць процілеглыя інтарэсы. Думка сялянскай партыі ПСЛ, каб закрыць граніцы для замежных прадуктаў і каб людзі куплялі нашу бульбу, і ў такой задрыпанскай яшчэ форме за 25 гр. супадае з думкамі нашых сялянскіх братоў. А калі не стане канкурэнцыі, то яе цана ўзрасце не толькі да 50 гр. Але ці гэта добры выхад, каб эканомікай кіравала палітыка? Вядома, што не. І так будзе, што паўстануць на вёсцы вялікія гаспадаркі, ужо паўстаюць. Ні пры чым тут уваход у Еўрапейскі Саюз.

Кранае Грыша Мароз вельмі важную справу для вёскі – адукацыю. Статыстыка паказвае, што на вёсцы жывуць лічаныя адзінкі з сярэдняй і вышэйшай адукацыяй. Мой погляд такі: так званую інфраструктуру, якая абслугоўвала б сялянскую „прадукцыю” не створаць людзі з падставовай адукацыяй. Проста, трэба ведаць, як умела сарганізаваць, напрыклад, продаж той жа няшчаснай бульбы, або трэба ведаць як на месцы яе перапрацаваць на фры. Сарганізаваць так, каб я яе купіў ахвотней за 49 гр. або і танней. Без падзелу работы не ўдасца дасягнуць сякога-такога паляпшэння жыцця на вёсцы. Грыша Мароз кажа, каб я вярнуўся на вёску, заняўся гаспадаркай і паказаў, як трэба гаспадарыць (так як бы ён гэтага не ведаў). Я не гавару, што калі яму так кепска, то тады няхай займаецца інфарматыкай, якой я зай-

маюся дзесяткі гадоў. Думаю, што няхай ужо так будзе, каб кожны займаўся тым, чым займаецца і любіць рабіць.

PS. 1. Маю пытанне да Ул. Сідарука. Піша ён „Толькі вы ўсё (вылучэнне – М. К.) перапуталі на свой (выл. – М. К.) спосаб, як гэта робіць журналіст Яцэк Федаровіч у ...”. Фактычна так ёсць, што ўсё путаю? І ці маю свой спосаб путання? Ну, бо калі гэта мой спосаб путання, то не Яцка. Хачу сказаць, што нічога не путаю, і не маю свайго спосабу путання, калі не путаю. Я проста хацеў звярнуць увагу, што пры камуне жылося па-marknaму і што дэмакратыя не вінавата, што дзееца зло, і што ў напрамку дэмакратыі зроблены толькі першы крок.

PS. 2. За мой „талент” дзякую Грышу Марозу. Каб яшчэ мая жонка была пераканана ў маім таленце.

PS. 3. Г. Мароз піша: „Адно астаецца прымкнуцца і другім не мяшаць”. Не трэба. Не мяшаеце. Апошнія вашы гутаркі з суседам – смакавітыя. Гутарыце далей і пішыце аб гэтым у „Ніву”.

Чэрвень 1997 г.

# АДГАЛОСКІ

Ёсць група беларусаў, думаю, што невялікая, былых дзеячаў рознай масці, нават, як пішуць, адукаваных, якім са старасці ўжо або з іншай прычыны ўсё блытаецца (Лукашэнку лічаць, напрыклад, патрыётам Беларусі!?). Рэдакцыя „Нівы” публікуе гэткую балбатню, бо як жа інакш – дэмакратыя. Інакш як балбатнёй „артыкул” Мікалая Капчука („Ніва” н-р 4 з гэтага года) назваць нельга. Маюць так званыя публіцысты многа часу, то пішуць, пішуць і пішуць, выказваючы погляды наогул на ўсе праблемы, якія хвалююць публіцыстаў з тэлебачання, бо і тэлебачанне аглядаюць ад рана да вечара. Шкада, што калі мелі магчымасць рашаць аб многіх розных справах, не рашалі так, як цяпер думаюць. Але што рабіць, калі бракуе ў „Ніве” сапраўднай публіцыстыкі, ці трэба (а можа і не трэба?) змяшчаць так званую „публіцыстыку”?

Жнівень 1997 г.

# АДЗІН У ПОЛІ – НЕ ВОІН

Не можа быць кампрамісу ў справе рэжыму Лукашэнкі. Гэта ніякае „авантурніцтва”, калі адмоўна ставяцца да дыктатуры на Беларусі. Гэта не толькі мой пункт гледжання, але ўсяго цывілізаванага свету. Пасол Сычэўскі выказванне чытачамі сваіх поглядаў на старонках „Нівы” называе авантурніцтвам. Мне здаецца, што большым авантурніцтвам з’яўляецца ўвядзенне паліцэйскага рэжыму ў дзяржаве, вяртанне да сталінскіх метадаў расправы з усялякай апазіцыяй, чым крытычныя думкі аб аўтарытарным кіраванні краінай.

У „Gazecie Wyborczej” чытаю, што сто дзеячаў беларускай культуры і навукі, палітыкаў, журналістаў, прадстаўнікоў незалежных прафсаюзаў і іншых арганізацый стварылі так званую Хартыю’97, каб ваяваць з таталітарызмам. Ці гэту ініцыятыву беларускіх патрыётаў пасол Сычэўскі таксама назаве авантурніцтвам? Шкада, што Ада Чачуга, журналістка „Нівы”, якая гутарыла з пасламо, не спытала яго як разумее ён „нармалізацыю адносін з Рэспублікай Беларусь”, каб не было ніякага авантурніцтва?

З аднаго боку знакамітыя прадстаўнікі „Хартыі ’97” хочуць зрушыць таталітарную нармалізацыю, з другога боку прадстаўнік польскіх беларусаў хоча нармалізаваць, разлічваючы „на дапамогу Беларусі ў нашай дзейнасці ... (музей, касцюмы, інструменты, студэнты)...” Штосьза штось. За падтрымку рэжыму Лукашэнкі даюць ордэны на грудзі і дапамогу ў дзейнасці. Калі б дапамога была бескарыслівай, дзяржаўныя ўстановы Беларусі не перашкаджалі б прадаваць „Ніву” ў Беларусі.

Вось і шантаж, і добрае самаадчуванне: „Калі будзе імкненне да праўды, талерантнасці...”, калі „ўсялякая крытыка будзе (будзе – М. К.) канструктыўнай і абапірацца на фактах”, то ласкава „...ніякіх перашкод у нашым (значыць з боку пасла – М. К.) супрацоўніцтве не будзе”. Калі перавядзем гэта на зразумелую мову, то гэта значыць больш-менш так: „Ніва”, падай на калені і бій паклоны адзінаслушным прадстаўнікам беларускай грамадскасці. Па-мойму, гэта мышленне з мінулай эпохі, калі адзінаслушныя погляды мелі сакратары і дзяржаўныя чыноўнікі, а адзінаслушнай крытыкай была крытыка „канструктыўная”. А ўся крытыка магла быць толькі канструктыўнай.

Калі ўжо можна было крытыкаваць, хаця неканструктыўна, розныя галіны дзейнасці Галоўнага праўлення БГКТ і то не дзеля разбівання грамадскасці, а дзеля, карацей кажучы, прагрэсу, то крытыкуючых, а гэта была ў большасці моладзь, назвалі ворагамі. Пэўна, пасол Сычэўскі забыўся, хто кідаў калоды пад ногі беларускім выбарчым камітэтам некалькі гадоў таму назад, хто ствараў розныя альтэрнатыўныя камітэты, каб яновічы ў паслы

не папалі? Што?! Выцягнуць з архіва „Нівы” і паказаць, хто мінаўся з праўдай?

А можа наадварот, спадар пасол?

Можа ваш бок (значыць, БГКТ) скажа: прабачце, тут і тут мы рабілі кепска. Чалавек блудзіць, вядома. Не ўпускалі мы фактычна моладзі ў будынак, каб маглі яны весці рэпетыцыі, фактычна прамантачылі камп’ютэры, фактычна вялі кепскую гаспадарчую дзейнасць, слухалі ва ўсім тых з ВК, фактычна душылі ўсялякую крытыку нашай дзейнасці, спрыялі ўсялякім гнілым кампрамісам (справа навучання беларускай мовы) і яшчэ, і яшчэ розныя недахопы нашай, значыць вашай дзейнасці. Калі вы, спадары, ужо так усё публічна скажаце, можа тады не будзе ніякіх перашкод у нашым супрацоўніцтве. Будзем гутарыць як беларус з беларусам.

Будзем мы глядзець на вашу, пасол Сычэўскі, дзейнасць у Сейме, будзем глядзець каму служыце і калі ваша там дзейнасць будзе нам адпавядаць, атрымаеце падтрымку на наступных выбарах не дзвюма-трыма тысячамі галасоў, а дзесяткамі, сотнямі тысяч. Тады не будзеце адзіным у полі воінам.

Кастрычнік 1997 г.

# У ЧЫМ ЗАКЛЮЧАЕЦЦА ПАЗІТЫВІСЦКАЯ ПРАЦА?

Тыдзень за тыднем праходзіць маланкава. Не так даўно былі выбары, а ўжо прэзідэнт Кваснеўскі прыняў прысягу ад новага ўрада. Спадар Вапа, кандыдат у паслы, даходзіць да вываду, што без пазітывісцкай працы ў беларускім асяроддзі „шанцаў на самастойнае ўвядзенне беларускага прадстаўніка ў парламент на сённяшні дзень няма”. Факт. Але ў чым мае праяўляцца гэта праца? Ці толькі ў арганізацыі фэстаў? А можа ў дапамозе беларусам у гаспадарчай ці асветніцкай дзейнасці? Як думае ставіцца спадар Вапа і Беларускі саюз да прапановы Мікалая Лук’янюка, каб лідэры селі за круглы стол? Пэўна ўжо такую мэблю М. Лук’янюк рыхтуе. Каб сустрэцца, трэба добра да такога спаткання прыгатавацца і пакінуць у баку ўсе прэтэнзіі да іншых. Не ведаю, ці для Яўгена Чыквіна беларускасць ляжыць на сэрцы так, як славяншчына? Пытанні, пытанні, пытанні. Папраўдзе, хто мае на іх адказаць? Не маем сапраўднага лідэра, якому на сэрцы ляжыць нашае тут існаванне, а не левым ці правым дэмакратам, якім ненавісць не засляпляла б вачэй, а эмоцыі розум адбіралі б. Каб атрымаць поспех на выбарах (вясной новыя выбары), трэба існаваць у грамадскай свядомасці. Але як можна існаваць у свядомасці, калі спадар Вапа не існаваў сваімі думкамі на старонках „Нівы”. Ніякіх тэкстаў, ні думак. Папраўдзе, каб не асабістыя кантакты, не ведаў бы я, кім з’яўляецца лідэр Беларускага саюза. А такіх, якія не ведаюць яго, тысячы і яны свае галасы аддалі на кагосьці іншага.

Чым з’яўляецца БС – саюз беларускіх арганізацый? Каго ён гуртуе? Калісь, калі па вёсках жылі настаўнікі, якіх штогод выпускаў Педагагічны ліцэй у Бельску (з беларускімі класамі), можна было пры іх дапамозе арганізавацца. І па вёсках былі гурткі БГКТ. А цяпер? Фактычна няма нават адзінак, вакол якіх гуртавалася б грамадскае жыццё ні ў вёсцы, ні ў мястэчках і гарадах. Існуюць пры гмінах асяродкі культуры, але іх дзейнасць заключаецца ў тым, каб раз у год дапамагчы сарганізаваць спадару Сычэўскаму фэст і выслаць калектыў на Фестываль беларускай песні.

Можа нехта спрабуе адазвацца, калі я ўдарыў у стол..

.

Лістапад 1997 г.

# НЯВЫКАРЫСТАНЫЯ ФОНДЫ

Можа я і з'яўляюся, як кажуць, непапраўным аптымістам, але інтуіцыя мне падказвае, што трыкутнік Бельск – Гайнаўка – Нарва дасягне большы ўзровень развіцця, чым іншыя часткі ўсходняй Беласточчыны, дзякуючы добрым землям і працавітасці яго жыхароў. І хоць Грыша Мароз сцягваў на зямлю непапраўнага аптыміста і дылетанта ў справах сялянскага гаспадарання, то аднак, думаю, не утопіяй з'яўляюцца мае думкі, звязаныя з прагрэсам гэтага трыкутніка. Тым болей, што супадаюць не толькі думкі, але і дзеянні з „пазітывісцкай працай" Беларускага саюза ў беларускім асяроддзі.

Вандруючы па мясцовасцях Гайнаўшчыны, бачыўшы вялікі кантраст сялянскага жыцця ў розных вёсках, дайшоў я да вываду, што шанцам развіцця беларускай грамадскасці з'яўляецца згаданы трыкутнік. А калі я прачытаў яшчэ, што іншыя людзі – не лепшыя гаспадары чым нашы беларусы з Беласточчыны, добра выкарыстоўваюць дзяржаўную і еўрапейскую фінансавую і арганізацыйную дапамогу для развіцця свайго рэгіёна, падумаў: чаму ж нашым гэтым не пакарыстацца. Розныя фонды аж просяцца, каб мільёны долараў выкарыстаць на актывізацыю нашых „трыкутнікаў". Для актывізацыі патрэбны тры рэчы: ахвотныя і вопытныя людзі, грошы і добрыя землі. Грошы, як я ўжо сказаў, ёсць, і не толькі ў банках, у сялян, добрыя пшанічныя землі таксама ёсць. А вось з людзьмі слабавата, асабліва вопытнымі, адкрытымі, мудрымі і маладымі. І такіх, у якіх перспектыва дзейнасці не абмежавана да ўласнага панадворка ці абы-якой пасады, на якой толькі душацца.

Я з Ленай Глагоўскай пабыў толькі адзін дзень у сталічнай Варшаве, калі мы стараліся здабыць грошы на Летнюю школу беларусістыкі, і здабыў многа інфармацый пра ўстановы, якія толькі і дзеля таго былі створаны, каб паказаць мужыкам – працоўным і беспрацоўным, адукаваным і цёмным, такім, якія нешта гадуюць і абрабляюць зямлю. Пыталі мяне, каго я рэпрэзентую. Ну як жа каго, „Хатку"! Добра, казалі, паможам збудаваць дом, выгадны, еўрапейскі. Як, у Гданьску? – Мая „Хатка" ў Гданьску. А мяне цікавяць толькі магчымасці будавання, актывізацыі ў кутку Беласточчыны, у трыкутніку. Пыталі мяне, чаму я з Гданьска цікаўлюся трыкутнікам; ці там няма зацікаўленых? – Можа і ёсць, але баяцца запытацца нават, а каб яшчэ будаваць?! Ім і так добра ў іх малых айчынах, тым болей гмінным урадзнікам, каб толькі не парушаць іх спакой. Дайшлі да пасад і больш не трэба. Інакш, трэба бегаць, ездзіць, ваяваць з бюракратыяй, актывізаваць. А ўрэшце і так ніхто добрага слова не скажа. Маем вольную гаспадарку, затым няхай тонамі бульбы, збожжа, мяса, фруктаў клапоціцца селянін, бо навошта ўсяго дабра столькі натварыў! Яго дабро, яго клопат. Каб даў яшчэ іншым зарабіць, а то скупіцца і на пасрэднікаў рабіць не будзе!

І так яно круціцца. А для гешэфту падставы ёсць – добрая зямля і куча нявыкарыстаных грошай!

Студзень 1998 г.

# ЦЯЖКІ ПАЛЕМІСТ

З Мікалаем Панфілюком весці палеміку вельмі цяжка. Калі хтось, у тым выпадку я, не згаджаецца з яго выказанымі публічна поглядамі, робіцца проста не толькі ворагам слаўнага ніўскага карэспандэнта, але і яшчэ „паскудзіць сваё славянскае гняздо” („Ніва”, № 37).

Можна махнуць рукою на балбатню гэтак званай публіцыстыкі Мікалая Панфілюка і проста не чытаць яе, але з другога боку, нельга абысці маўчаннем звычайнага прапагандавання шавінізму і пісання няпраўды. Варта для прыкладу ўсвядоміць, што не немцы выгналі беларусаў з іх сядзіб у бежанства, толькі цар сваім загадам; крыжаносцы – гэта быў манаскі ордэн, які складалі рыцары розных нацыянальнасцей, хаця пра іх нацыянальнасць у сучасным сэнсе гэтага слова цяжка гаварыць. Далей: няпраўда, што я хвалю немцаў да неба і, што гэта залаты народ, а рускія ў мяне нішто. Так толькі думае Панфілюк, што я гэтак пішу.

Польшча, як ні кажы, за некалькі гадоў аб’яднаецца з Еўропай, дзе абавязваюць цывілізаваныя стандарты суадносін між нацыянальнасцямі. Не вельмі магу сабе ўявіць у якасці нашага ворага немцаў, французаў ці англічан. Немцы прытым займаюць сярэдзіну Еўропы. Дзесяткі гадоў прайшлі ад заканчэння ІІ сусветнай вайны і еўрапейскія народы досыць бурліва перайшлі шлях варожых суадносін між сабой. Як піша Ганна Сурмач у цыкле „Еўрапейская пілігрымка” ў „Ніве”, перасякалі яны ў вандроўках па Еўропе межы дзяржаў нават не ведаючы калі і дзе, а першая праверка спаткала іх на нямецка-чэшскай граніцы. Далей яна піша, што „ні кажы, а ўсюды мы (значыць, беларусы – М. К.) адчуваем сваю лучнасць з еўрапейскаю культурай, яна ва ўсім нашым характары, у нашым светаўспрыманні”. Вось! Не ўсе гэта так бачаць.

У большасці дзяржаў Еўропы ўладу трымае сацыял-дэмакратыя, а гэта абазначае, што на першым месцы ў палітыцы ставяцца сацыяльныя ўмовы жыцця чалавека і гуманныя суадносіны між людзьмі. А што пры тым узнікаюць праблемы, дык гэта звычайная справа! Толькі ў бальшавікоў іх не было. Хто быў не з імі, той быў проціў ім.

Верасень 1998 г.

# НЕМЦЫ – ДЭМАКРАТЫЧНЫ НАРОД

Мікалай Панфілюк не любіць немцаў („Ніва” н-р 31). Піша ён: „Немцы добрыя, але толькі самім сабе, а славянскай дабрыні і сэрца спазнаць ад іх не давялося ”. Калісь былі дрэнныя, значыць у час вайны, і зараз таксама: „такая была нямецкая гасціннасць і яна сёння (падкр. – М. К.) нічуць не змянілася, хай людзі ведаюць пра гэта”. Мікалай Панфілюк ужо пра гасціннасць немцаў ведае, хоць не піша, адкуль гэта ведае, можа тады і людзі веды бралі б з гэтае крыніцы, чым мелі б паверыць публіцыстыцы карэспандэнта „Нівы”.

Можна зразумець, што канікулы, што гарачыня, але навошта боўтаць чытачу ў галаве! Карэспандэнт заўважае, што „нашы бацькі і дзяды спазналі душы чалавечай спагаду і любоў да бліжняга. Гэта рускі магутны славянскі народ мае гэтыя якасці”. Я пытаю: хто выганяў нашых з вёсак і сядзіб? Гэта была палітыка (у спаленыя вёскі людзі не вернуцца і астануцца жыць у Расіі)!

Хтось нядаўна пытаў мяне, які ёсць беларускі народ. Я спачатку адказаў, што працавіты. Але потым, калі падумаў, сказаў, што прыкметы народа ствараюць акалічнасці. Розныя. Ваяўнічасць палякаў дзевятнаццатага стагоддзя бралася з таго, што не было ў іх сваёй дзяржавы. Працавітасць беларусаў бралася з таго, што трэба было пражыць з дня на дзень. Затым прыкметы народа бяруцца з акалічнасцей, а не наадварот.

З другога боку, парадаксальна, беларускасць захавалася дзякуючы, а можа па прычыне нямецкай акупацыі. Шырока аб гэтым піша „Ніва”. Гэта таксама праўда. На прымусовыя работы ў Нямеччыну ў час вайны ехала беларуская моладзь не так ужо і прымусова. Я не апраўдваю злачынствы немцаў, але задумваюся як гэта было, што за час нямецкай акупацыі ў Беларусі існавалі беларускія школы, газеты, тэатры? Вядома, немцы вялі такую палітыку, але чаму рускія вялі іншую? Хто прыгарнуў тысячы беларусаў у пасляваенны, цяжкі час? Можна ставіць такіх пытанняў многа. Адказы на іх не бела-чорныя: рускія добрыя, немцы кепскія. Зараз нямецкі народ, як і дзяржава, зусім іншыя. Так прынамсі кажуць тыя, хто там пабываў. Дэмакратычны народ і дэмакратычная дзяржава – саюзнік Польшы і ўсіх суседзяў.

Кастрычнік 1998 г.большасці дзяржаў Еўропы ўладу трымае сацыялдэмакратыя, а гэта абазначае, што на першым месцы ў палітыцы ставяцца сацыяльныя ўмовы жыцця чалавека і гуманныя суадносіны між людзьмі. А што пры тым узнікаюць праблемы, дык гэта звычайная справа! Толькі ў бальшавікоў іх не было. Хто быў не з імі, той быў процiў ім.

Верасень 1998 г.

# НЕАБХОДНА АРГАНІЗАВАЦЬ ЗБЫТ

– Так далей гаспадарыць ужо было немагчыма, – кажа мой махнацкі сусед, сябра са школьнай парты Мікалай Далінскі. – У месяц траціў я тысячу злотых, калі замест малака экстра класа адстаўляў у малачарню малако трэцяга сорту. Затым быў я прымушаны купіць, узяўшы крэдыт у банку, аўтаматызаваны французскі 420-літровы халадзільнік. Схалоджвае ён малако да 4-6°C, мяшаючы яго мяшалкай кожныя 15 мінут.

Да Міколы Далінскага кожны другі дзень з Акруговага малочнага каапinduced з Гайнаўкі прыязджае цыстэрна і забірае малако на завод. Двойчы ў месяц даследуюць малако у лабараторыі, выяўляюць колькасць бактэрый і вызначаюць сорт малака.

– Шмат клопату каля гэтага малака, – кажа Мікалай, – а з боку кааператыва ніякага абучэння сялянам не праводзіцца. Асталося вучыцца на памылках, а такая навука – дарагая справа. Хацеў я дакупіць некалькі гектараў сенажацяў, – расказвае далей сусед, – каб забяспечыць гадоўлю пашай і для гэтага хацеў узяць так званы „танны” крэдыт у банку. Аказваецца, што на „танныя” крэдыты няма грошай. Дзяржава, хаця дэкларавала такі крэдыт, аднак яго не забяспечыла. І як тут можна што планаваць! Бо калі ўжо хто ўвайшоў у інтэнсіўную гаспадарку, іншага выхаду няма. Трэба яе толькі развіваць.

Вазьмі нашага сябру Алёшу Г. – быў шафёрам, так як і я, а цяпер на пенсіі. Можа трымаць на свае патрэбы кароўку і парсючка і жыць без клопатаў. Каб не мая жонка Надзя, і я да гэтай пары быў бы ўжо пенсіянерам – а так толькі турбот прыбывае, хоць фізічна лягчэй гаспадарыць, бо ў мяне поўная механізацыя сельскагаспадарчых работ. Праўда, машыны таксама трэба было б выслаць на пенсію і аднавіць машынны парк.

Дзякуй Богу, што пакуль ёсць здароўе, дык можна ад світання да цямна і ад студзеня да снежня таптацца каля гаспадаркі. Апрача гадоўлі кароў сею збожжа, саджу бульбу, гадую свіней. Цяжка спецыялізавацца ў гадоўлі кароў. Няхай толькі Гайнаўскі малочны каапэратыў, напрыклад, збанкрутуе, а так можа быць, то я астануся голы і босы.

Знаеш, Міша, што мне асабіста не дае спаць? Калі збяру восенню ўраджай, то мушу думаць, як яго збыць. Проста збыць, за марны грош, як кажуць, няма праблемы. Але каб прадаць і яшчэ зарабіць – гэта ўжо праблема.

Аказваецца, што праблемай для гаспадароў з'яўляецца збыт сельскагаспадарчых прадуктаў. Пры інтэнсіўнай гаспадарцы гэта немалая праблема, таму што цяжка аднаму чалавеку быць і вытворцам і гандляром. Трэба ж

перакінуць сотні тон ад гаспадара да пакупніка. Перш за ўсё трэба гэтага пакупніка знайсці. Адным словам, існуе неадкладная патрэба арганізаваць такі гандаль. Патрабуе ён іншых ведаў, чым вытворчасць малака класа экстра. Можа мець форму суполкі ці іншай арганізацыі. Такая суполка павінна існаваць на месцы, у вёсцы, блізка гаспадароў, а працаваць у ёй – сыны і дочкі гэтых жа гаспадароў. Працаваць восем гадзін, атрымліваць месячную зарплату, жыць у вёсцы, выпісваць не толькі „Ніву” і „Часопіс”, а калі трэба, ездзіць у горад ці на Мальёрку, а калі трэба заступіць бацькоў на гаспадарцы, каб яны маглі паехаць на Мальёрку адпачыць. Так больш-менш дзейнічае вёска ў Еўропе.

Хто паможа арганізаваць такія суполкі па вёсках, хто ўвогуле паможа сялянам, той будзе існаваць гадамі на палітычнай сцэне ў беларускім асяроддзі ўсходняй Беласточчыны. Гэта першы ключ да поспехаў у палітыцы і выбарчых кампаніях.

Усім апанентам, якія кажуць, што гэта наіўныя думкі, хачу сказаць, што нічога не разумеюць або не хочуць зразумець і што мінулі ўжо часы, калі дзяржава і ўраднікі клапаціліся і займаліся ўсім: ад шнурка для снапавязалкі да туалетнай паперы.

Лістапад 1998 г.

# ДОБРА, ШТО ХОЦЬ АДЗІН ЗРАЗУМЕЎ

Згодна свайму статуту БГКТ палітыкай не займалася і займацца не будзе, а толькі плённа супрацоўнічае з афіцыйнымі ўладамі Беларусі на культурна-асветніцкай ніве, – сцвярджае ў артыкуле „У гэтай справе нельга маўчаць” Канстанцін Масальскі („Ніва” н-р 13 ад 29.03.1998 г.). Аўтар палемікі намаганні беларускай апазіцыі ўчыніць Беларусь незалежнай дзяржавай са сваёй мовай, канстытуцыяй і ўладай называе гульнёй. От, такой сабе гульнёй, да якой такая сур’ёзная арганізацыя як БГКТ ўмешвацца не будзе. Міліцыя разбівае мірныя дэманстрацыі, трушчыць косці і хрыбты дэманстрантам. Няхай там. Бывае. Як у любой гульні.

Несвядомым прыкідваецца кіраўніцтва БГКТ ці фактычна не ведае, што падарункі, якія атрымоўвае ад улад Беларусі – гэта сплата палітычнага даўгу за падтрымку і маўчанне, за тое, што БГКТ не ўблытваецца ў „палітычныя гульні” на баку апазіцыі. Няхай толькі БГКТ запратэстуе супроць парушэння законаў у Рэспубліцы Беларусь, а крыніца дапамогі высахне. Трэба быць шалёным, каб сысці з такога жыватворнага шляху, – мяркуе Канстанцін Масальскі.

Нічога, што ўлада топча свабоду, што гаспадарка гіне, а людзі баяцца выказаць свае думкі. Нічога што нацыянальны бел-чырвона-белы сцяг апаганены і паліцыя дубінкамі выбівае ахвоту да чалавечай і нацыянальнай годнасці. Нічога, што ніводная дзяржава не прызнала вынікаў недэмакратычнага рэферэндуму. БГКТ прызнала.

Спадар Канстанцін Масальскі вельмі спачувае беларускаму народу, пішучы: „Пражылі яны (беларусы – М. К.) русіфікацыю, паланізацыю, перыяд уніі і ўсё-такі засталіся сабою. Не павучайма іх”. Гэта ж славяне, „іх мова, культура, абычаі падобныя на рускія. Рэлігія таксама тая ж. Ім бліжэй да расейскага народа, чым да польскага”. І тут вылазіць шыла з мяшка. Апазіцыя, і не толькі яна, хоча, каб людзям было бліжэй да сябе, да беларускага народа. Шанаваць суседа трэба, але тады, калі ён шануе нас. Маліцца можна і па-беларуску. Існуе Аўтакефальная праваслаўная царква ў Польшчы і ў іншых дзяржавах. Чаму тады не можа яна існаваць у Беларусі?

Спадар Масальскі, я разумею, што для справы трэба ладкавацца і з чортам, але каб яму яшчэ служыць? Добра, што хоць Алесь Барскі гэта зразумеў.

Снежань 1998 г.

# ГУМАННЫ ЗАКОН

Паводле Сідара Макацёра („Паводле Клінтана”, „Ніва” н-р 47) Клінтан з’яўляецца творцам клінтанізаванай цывілізацыі. Таму, што як я зразумеў вывады абаронцы югаслаўскіх сербаў, – так, так, ёсць і іншыя сербы – што Клінтан „раструшчыў бомбамі безабаронную Югаславію”, а прытым яшчэ адказнасць за ўчыненае варварства ўсклаў на Мілошавіча. Лёс сербаў мне не абыякавы, так як не абыякавы лёс пакрыўджаных і пацярпеўшых у любой вайне.

Але хацелася б пачуць, што спачувальнікі сербаў (у тым ліку і С. Макацёр) думаюць пра албанцаў, якіх косаўскія сербы выгналі вясною г.г. з Косава? Ну, бо калі глядзім гуманным вокам на „цвёрдахрыбетнага славянскага неслуха”, то якім вокам, пэўна таксама гуманным, трэба глянуць на албанцаў, калі прытым маем пачуццё неклінтанізаванай цывілізацыі. Так падказвае логіка ацэнкі сучасных працэсаў у Еўропе.

Студзень 1999 г.

# АДСУТНАСЦЬ АРГУМЕНТАЎ

Мікалай Капчук хоча дыскрэдытаваць мяне і мае „Агістарычныя вывады” сцвярджаючы, што ненавіджу Чырвоную Армію і захапляюся даваеннымі санацыйнымі парадкамі. З таго, што я не згадзіўся з ягоным поглядам на падзеі 17 верасня 1939 года, гэтага не вынікае. Такі погляд, які прэзентуе навуковец з „глыбокімі навуковымі ведамі” ў „Адказе рэпліканту” („Ніва” н-р 47), характэрны для гэтак званых „навукоўцаў”. Калі бракуе аргументаў, астаецца яшчэ закід „а ў вас неграў б’юць”.

А калі гаварыць пра факты, то Мікалай Капчук не запярэчыў у сваім „Адказе рэпліканту”, што Чырвоная Армія, дагаварыўшыся з Гітлерам (няхай сабе і без супраціву палякаў, але і без згоды іх на гэта), заняла вялікую частку Польшчы. Што было потым, гэта зусім іншая справа. І ні пры чым тут высокая ацэнка Чырвонай Арміі дадзеная Г. Гудэрыянам ці высновы С. Кірхмаера пра лёс беларусаў і ўкраінцаў пад панаваннем панскай Польшчы. Цікава, што пра лёс беларусаў і ўкраінцаў пад панаваннем саветаў „гісторыкі з глыбокімі і навуковымі ведамі” нічога не пішуць. Курапаты – гэта выдумка нацыяналіста Пазьняка ці як?

Люты 1999 г.

# ЗАЎВАГІ АБ „НІВЕ”

Не ведаю якое супадзенне прычын паўплывала на абніжэнне ўзроўню нашай адзінай, поўнасцю беларускай газеты „Нівы”. Не ведаю як іншыя чытачы, але я адчуваю нейкую раздробленасць інфармацыі і публіцыстыкі ў тыднёвіку. Вядома, што „Ніва” ўжо дзесяцігоддзямі з’яўляецца тыднёвікам, на старонках якога публікаваўся гарох з капустай – інфармацыі, думкі, палемікі, аб’явы і г.д. І інакш не можа быць. З другога боку, калі прэса становіцца рупарам улады і рэдактараў, чытач адцураецца ад усіх сентыментаў і прывычак і не сягае штотыдзень па „сваю” газету. Я асабіста адчуваю, што „Ніва” з кожным выданнем становіцца хавальнікам мінуўшчыны і рээстратарам пачынанняў гміннай ці павятовай улады.

Як не кажы, але журналіст мусіць з галавой акунацца ў жыццё грамадства. Няўжо патухла жыццё ў беларускіх вёсках і мястэчках усходняй Беласточчыны? Няўжо няма праблем, з якімі людзі змагаюцца – не толькі старэчыя і нешчаслівыя Зоські ды Крыські, але і гаспадары, якія валодаюць, ужо цяпер, дзесяткамі гектараў зямлі? З другога боку, каб на старонках тыднёвіка паказаць, ды яшчэ так паказаць, каб чытача зацікавіць, праблемы, турботы і радасці людзей, не хопіць падсунуць ім дыктафон і паставіць некальні банальных пытанняў. Журналісту трэба грунтоўна да размовы прыгатавацца. Не вучаць гэтага ў журналісцкіх школах ці як?

Пэўна, я гляджу на „Ніву” з іншай перспектывы чым рэдактары тыднёвіка. Яны жывуць і працуюць у беластоцкім асяроддзі, а гэта, вядома, што значыць. Але на прамілы Бог, тыднёвік існуе для чытачоў і не трэба пра гэта забываць, тым болей, што „Ніва” з’яўляецца газетай залежнай толькі ад Праграмнай рады і яшчэ ад дзяржаўнай датацыі. Калі не стане чытачоў, то і датацыя знікне.

Сакавік 1999 г.

# ВІНАВАТЫ ПРОСТЫЯ ЛЮДЗІ

„Насамперш было Слова,...”. Усе рэчы з яго ўзяліся. Затым калі няма беларускага слова, няма і беларусаў. Гэта вядома здаўна, толькі пасол Ян Сычэўскі аб гэтым не ведае, забіваючы свой асінавы кол на магіле нацыянальнасці (гл. „Kurier Poranny” ад 13.02.1999 г.). Так, так. Калі ўсё апалячана і няма нават беларускіх назваў вёсак, то няма і беларусаў. Помню, што мая першая карэспандэнцыя ў „Ніву” тычылася гэтай тэмы. Ян Сычэўскі гаворыць, што „akcja przywracania białoruskich nazw miejscowościom we wschodniej Białostocczyźnie (...) skończyła się fiaskiem”. І гэта толькі таму, што мясцовыя людзі гэтага не хацелі. Значыць, не ўлада тут вінаватая, а людзі так хочуць. Была ж калісь у нас дэмакратыя лепшая, бо сацыялістычная. Цяпер „за” галасуе 30%, а калісь – 99,99%. Калі каму гэта не падабалася, мог выбіраць апеку спецслужбаў або маўчанне. Мінае ўжо дзесяць гадоў дэмакратыі, а пасол Ян Сычэўскі як бы гэтага не заўважае. Тады, калі хацелі ўводзіць двухмоўныя назвы, так папраўдзе ніхто людзей не пытаў, а за ўсім гэтым сачыла міліцыя. Адміністрацыя казала, што няма законаў, якія дазвалялі б уводзіць беларускія назвы. Пра тое, што няма законаў, якія б не дазвалялі ўжо ніхто не ўспамінаў.

Цяпер маем самаўрады. Ва ўладах гэтых жа самаўрадаў дзейнічаюць свядомыя, прынамсі так сябе яны называюць, беларусы. Тады пытаю: што перашкаджае ўводзіць такія назвы? Добра было б, каб Ян Сычэўскі памог. Але не, яму гэта не патрэбнае, так як і сеймавае пасланне беларускаму народу. І так дзеецца з усім, што тычыцца спраў беларусаў. Зразумела, апрача фэстаў, на якіх прэзентуюцца некаторыя парламентарыі.

Май 1999 г.

# СУМУЮ І НЕ СУМУЮ

Дзядзька Захар у 21-ым н-ры „Нівы” піша, што па камуне ён сумуе, бо: (1) лякарствы былі бясплатнымі, (2) ніхто не плаціў за бальніцу, (3) бясплатна будавалі нам фабрыкі, гуты, школы, бальніцы.

Я па камуне сумую таму, што быў у той час малады, лякарстваў не купляў, пра бальніцу не думаў, фабрык і гутаў не патрабаваў. Верыў, што ўжо-ўжо будзе лепш, яшчэ толькі год. Між мною і жыллёвым кааператывам была фармальная дамова, што кватэру я атрымаю праз тры гады, а атрымаў яе ледзь праз восем – ашуканстваў прытым было толькі, колькі было і кватэр у г.зв. *спулдзельні*. Хто не працаваў у г.зв. вядучых сацыялістычных фабрыках і ўстановах, той шанцаў на кватэру ніякіх не меў. Адным словам – трэба было мець адпаведныя падвязкі, каб што-небудзь раздабыць: пачынаючы ад кніжкі, халадзільніка, сціральнай машыны, а канчаючы на талерках і ручніках. Пазней да ўсяго гэтага дайшлі яшчэ талоны – г.зв. *карткі*.

Не сумую па камуне таму, што немалую частку сваёй маладосці я патраціў стоячы на прыпынках ды чакаючы на г.зв. сродкі публічнага транспарту. Праедзе табун аўтобусаў, а пасля праз гадзіну нічога. На хамаватасць вадзіцеляў не было ніякага лякарства (ні дарэмнага, ні за грошы). Рабочы клас упраўляў краінай, а як упраўляў гэтак жа і працаваў. Нічога, што чалавек семнаццаць гадоў вучыўся ў школах рознага ўзроўню, многа ведаў і разумеў, а шахцёр або суднабудаўнічы і так меў зарплату ў тры разы большую за вучонага, не ўлічваючы іхніх дадатковых прывілеяў. Гэта была гістарычная справядлівасць — хто супраць яе бунтаваўся, таго саджалі па турмах і лічылі ворагам народу. Цяпер жыць цяжка, але і тады не было лёгка. Цяпер я не трачу часу ні ў кіламетравых чэргах, ні на прыпынку – ужо дзеля аднаго гэтага варта было ўвесці дэмакратыю. А па камуне сумаваць ды ўсё нанава і нанава яе перажоўваць – нявarta, бо яна не вернецца. А жыць і думаць што далей – варта і трэба. Няма і не было нічога ў свеце дармовага – ні цяпер, ні тады.

Верасень 1999 г.

# АГІСТАРЫЧНЫЯ ВЫВАДЫ

Калі чытаеш псеўдагістарычны вывад Мікалая Капчука пад загалоўкам „А было гэта...” („Ніва” н-р 39), прыпамінаюцца мне вельмі раннія школьныя гады і тадышняя інтэрпрэтацыя польска-савецкіх падзей 1939 года. Паводле яе, усё было добра. Чырвоная Армія „вызваліла” беларусаў і ўкраінцаў ад прыгнёту панскай Польшчы і, калі б саветы не занялі палавіну Польшчы, то немцы небяспечна прыблізіліся б да Расіі.

Цяжка весці палеміку з агістарычнай балбатнёй Мікалая Капчука, які піша што „ў гады халоднай вайны была прыдумана тэорыя аб тым, што Чырвоная Армія 17 верасня 1939 г. усадзіла нож у спіну Польшчы”. Гэта не была тэорыя, пан Капчук, гэта была вайна. Думаю, што ўжо калі рэдакцыя „Нівы” друкуе такія вывады, то павінна, для раўнавагі поглядаў, заказаць у іншых, згуртаваных вакол Беларускага гістарычнага таварыства, гісторыкаў артыкул, які без ідэалагічнага скрыўлення, больш-менш аб’ектыўна паказаў бы чытачам „Нівы” чым была агрэсія СССР на Польшчу ў верасні 1939 г.

Кастрычнік 1999 г.

# ГУТАРКА З КАМЕНДАНТАМ

Як не пагутарыць, калі здараецца нагода, пра розныя вясковыя справы з вельмі цікавым вясковым дзеячам, сябрам са школьнай парты Аляксеем Герасімюком – камендантам пажарнай каманды, радным Гайнаўскай гміны і солтысам Махнатага, што на Гайнаўшчыне. Такая нагода здарылася, калі пабываў я на бацькаўшчыне ў час праваслаўных Каляд.

На гутарку дамовіўся я з сябрам раніцай на трэці дзень Каляд, калі Аляксей быў больш свабодны – нягледзячы на свята каля жывёлы трэба хадзіць безупынна, жывёла не святкуе.

– Гаспадаркай яшчэ займаюся, хаця я ўжо на пенсіі. Проста не люблю сядзець без работы. Да таго займаюся яшчэ і грамадскімі справамі, – пачынае гутарку Аляксей Герасімюк.

Мяне, перш за ўсё, цікавіла рэфармаванне краіны не на вярхах улады, а ў глыбінцы: роля гміны, паветаў, новых ваяводстваў і ўдзел беларусаў у мясцовай уладзе. Як бачаць яны нацыянальныя справы, калі школьная моладзь і дзеці ад калыскі не гавораць па-свойму, а толькі на дзяржаўнай, польскай мове? Якую нацыянальную свядомасць маюць у большасці беларускія радныя і чыноўнікі? Чаму клуб у вёсцы стаіць пусты? Адказ на гэтыя пытанні хацеў я атрымаць ад вясковага дзеяча. Аднак, – кажа ён, – радным стаў не так даўно, солтысам таксама выбралі пад канец восені мінулага года. Дамовіліся мы, што аб гэтых справах пагаворым у час велікодных святаў.

Затым завялі мы гутарку аб трэцяй яго функцыі, аб кіраванні вясковай пажарнай камандай.

У Махнатым дабравольная пажарная каманда паўстала ў 1935 годзе. Пры тушэнні пажараў пажарнікі карысталіся ручной помпай і бочкай, якія трымалі ў пажарнай шопе. У ваенны перыяд і да чэрвеня 1949 года пажарнай каманды ў вёсцы не было. Потым, дзякуючы ініцыятыве сялян, пажарная каманда адрадзілася пад камандаваннем Грышы Кучко. Усе гэтыя факты запісаны ў хроніцы, якую вядзе цяперашні камендант. На гэтай пасадзе знаходзіцца ён ужо дзесяць гадоў.

– Цяпер то не тое што калісь, – кажа камендант Герасімюк. – Наша пажарная каманда ўваходзіць у састаў Краёвай выратавальнай сістэмы. Атрымліваем невялікія датацыі, пераходзім пастаяннае абучэнне. У нас пажарная аўтамашына, тры мотапомпы, дзесяткі метраў шлангаў і поўная гатоўнасць да тушыльнай акцыі. Увесь час трымаем напагатове некалькі тысяч літраў вады, нават у найбольшыя маразы.

Пажарную каманду састаўляюць сорак пажарнікаў, з якіх 26 актыўных, гатовых кінуць работу і ставіцца ля брамы дэпо ў час трывогі.

Тушым пажары ў наваколлі Махнатага, у вёсках Гайнаўскай, Чыжоўскай і Дубіцкай гмін, а калі гайнаўскія пажарнікі выязджаюць з Гайнаўкі, тады мы едзем і трымаем дзяжурства ды забяспечваем горад ад пажару, – кажа камендант.

– Ці арганізуеце, як пажарная каманда, культурныя мерапрыемствы ў вёсцы? – пытаю.

– Не. Ніхто да гэтага не мае галавы і часу. Толькі моладзь ад часу да часу арганізуе забавы ў клубе, які знаходзіцца побач нашага дэпо. Клуб вялікі, можна ў ім арганізаваць нават вяселле. Умовы да вядзення культурнай дзейнасці ёсць, горш з арганізатарамі. Калісь настаўнікі ладзілі на вёсцы розныя культурныя мерапрыемствы. Цяпер настаўнікі жывуць у горадзе і вясковай культурай не займаюцца. Астаецца тэлебачанне і нараканне, што на вёсцы нудна.

Але аб гэтых справах пагаворым вясной, бо Аляксей Герасімюк гэта не толькі камендант пажарнай каманды, але і гмінны радны ды солтыс.

Снежань 1999 г

# .ХАЛОДНЫМ ВОКАМ

Ці ж гэта не дзіўна, што не польскае міністэрства запрашае беларусаў з Польшчы на размову, а толькі Міністэрства замежных спраў Беларусі? МЗС Беларусі ў Мінск мае запрасіць „лідэраў усіх беларускіх арганізацый, кіраўнікоў беларускіх установ (ці ёсць такія ў Польшчы? – мм), дырэктараў ліцэяў, дзеячаў беларускага руху” (глядзі: „Ніва”, н-р 50, „Без грошай, але сваё робім”) і далей чытаем, што „прапануецца сустрэча з уладамі РБ, міністрамі адукацыі, культуры, старшынёй Дзяржкамітэта па справах нацыянальнасцей і рэлігіі, на якой беларускія прадстаўнікі маглі б непасрэдна і канкрэтна выказаць свае заўвагі, просьбы”. Спрабуйма глянуць на гэта запрашэнне больш халодным вокам.

Міністэрства дзяржавы, няхай сабе і суседняй, але аднак жа чужой для грамадзян Польшчы, запрашае прадстаўнікоў беларусаў да сябе, каб маглі яны „непасрэдна і канкрэтна выказаць свае заўвагі і просьбы”. Так кепска, паводле ўлад Беларусі, жывецца беларусам у Польшчы, што ўлады Беларусі з увагай і зразуменнем выслухаюць нараканні і просьбы польскіх беларусаў. Трэба быць сляпым, каб не бачыць, чаму і каму служыць такі клопат улад Беларусі. З чыстым сумленнем, калі б да такога спаткання дайшло, Лукашэнка на цэлы свет абвясціў бы, што польскія ўлады кепска дбаюць пра сваіх грамадзян, затое добры прэзідэнт не толькі дбае пра свой народ, але і клапоціцца пра сваіх суайчыннікаў за межамі Беларусі. І калі б у Беларусі быў рэжым, як кажуць польскамоўныя нацыяналісты, то іншыя не гарнуліся б пад апякунчыя крылы ўлад Беларусі. Такая мэта прэзідэнта Беларусі, калі ён думае запрасіць беларусіх актывістаў з Польшчы, а не любоў, як думае войт Гайнаўскай гміны Вольга Рыгаровіч. Спатканні беларусаў свету, можа аб гэтым не ведаюць саветызаваныя прыхільнікі Лукашэнкі, арганізуе ад добрых некалькіх гадоў ЗБС „Бацькаўшчына”, незалежная пакуль што грамадская арганізацыя.

А цяпер некалькі слоў пра дзіўную і вельмі шкодную для нас, беларусаў, пазіцыю некаторых прадстаўнікоў улады беларускага паходжання. Яны проста даюць антыбеларускія аргументы польскім шавіністам, што беларусы ў Польшчы гэта, аднак, так званая пятая калона, насаджаная калісь царамі, а не пражываючае ад вякоў, укаранелае тут беларускае насельніцтва са сваёй тоеснасцю і культурай. Ну, бо ці ж пасол Сейма не з’яўляецца прадстаўніком польскай улады, а толькі потым прадстаўніком сваёй партыі і выбаршчыкаў. Не лепшую пазіцыю ў гэтай справе займае войт гміны ці стараста павета. Як трэба разглядаць такую сітуацыю, калі прадстаўнікі ўлады едуць у Мінск, замест у Беласток ці Варшаву, па просьбе. Цэлы свет, гавару пра больш-менш

цывілізаваны свет, асуджае паводзіны ўлад „дэмакратычнай” Беларусі, якія за погляды саджаюць у турму іншадумцаў. Толькі нашым некаторым беластоцкім беларускім дзеячам Лукашэнка і яго двор з’яўляюцца зіхатлівай зоркай на фоне дэмакратыі. Не разумею, як можна быць такім сляпым, каб не бачыць простых і ясных фактаў парушання правоў чалавека ў Беларусі. А можа не сляпыя яны, а толькі бачаць нейкія свае палітычныя інтарэсы?

Студзень 2000 г.

# ЁСЦЬ ШТОСЬЦІ АПТЫМІСТЫЧНАГА Ў ІНФАРМАЦЫІ

„«Край» змагаецца за Беларусь” („Ніва” № 51 ад 19.12.1999 г. Не толькі семінарыст так думаў, што ён „адзін такі”. Таксама я думаў. Думаў, што ў беларускім народзе невялікая колькасць „такіх адзінак”, а калі так, то народ сам сябе прыгаварвае на самазнішчэнне.

На шчасце маладое пакаленне ў „такім” сэнсе адрозніваецца ад саветызаваных „старых”. Так, так. Калі хтось усё сваё жыццё падвяргаўся індактрынацыі адной ідэі, адной палітыкі, адной думкі, думкі ўлад, то такая асобіна не можа вырвацца з заклятага круга таталітарнай ідэі. Крыніца яго жыватворных сокаў была скажона толькі адной ідэалогіяй. Да шырокага свету і іншых поглядаў беларус доступу не меў.

Прыпамінаецца мне адна гісторыя, вельмі трагічная ў сваім заканчэнні, якая, аднак, аддае вобраз сітуацыі. На рыбалоўчым навуковым судне членам навуковай экспедыцыі – канец сямідзесятых гадоў дваццатага стагоддзя – быў экс-вайсковец, паляк. Вядома, што вайскоўцы асабліва падвяргаліся антыкапіталістычнай прапагандзе. Такім чынам гэты нешчаслівы чалавек, калі пабачыў як жывуць людзі ў тым „праклятым” капіталізме, проста звар’яцеў. Да канца свайго свядомага жыцця не верыў, што гэтая рэчаіснасць, якую ён бачыць, са сваімі поўнымі ўсяго дабра магазінамі і прыветлівымі людзьмі, з’яўляецца проста ілюзіяй і прапагандай капіталістаў.

Добра затым, што ў Беларусі ёсць „Край”, які змагаецца за сваю айчыну, добра што здраднікамі называе тых, хто прадае сваю мову і нацыянальнасць. Добра, што паявілася забытае слова – патрыятызм.

Люты 2000 г.

# КРУЦІЦЬ І ВЕРЦІЦЬ МАКАЦЁР

„Надта смешнае” – можна было б адказаць на пытанне ніўскага блазна, нейкага Сідара Макацёра, які пытае: „Куды віруем?” („Ніва” н-р 5 ад 30 студзеня 2000 г., гумарэска „Зямляк”).

Я ў адгалосцы „Гуманны закон” („Ніва” н-р 52 ад 1999 года) пытаю: „Хацелася б пачуць, што спачувальнікі сербаў (у тым ліку і С. Макацёр) думаюць пра албанцаў, якіх косаўскія сербы выгналі вясною мінулага года з Косава?”, а Сідар адказвае на гэта кім з’яўляецца зямляк, нейкі Махнацкі Куптэль. Ёсць метад у такіх паводзінах. Калі бракуе аргументаў, адказваюць: „а ў вас неграў б’юць”, або „табе жонка рогі прырабляе”. Ну і выходзіш на дурня, як кажа Еўрыпід: „гавары з сэнсам да дурня, а назаве цябе дурнем”. Так і выйшла.

Пэўна, не трэба было чапаць Макацёра, бо агрызнецца, як згаладнелы сабака. У тым то праблема, што я не чапаў Сідара Макацёра, толькі не мог ужо сцярпець яго балбатні. Ці ж не вучылі Сідара, што можна нават абсабачыць погляды, хоць гэта залежыць ад гэтак званай культуры слова, але не таго, хто гэтыя погляды публічна выказвае. Можна, нават у дэмакратыі гэта дапускаецца, улезці з ботамі ў прыватнае жыццё розных прэзідэнтаў, бурмістраў і іншых публіцыстаў, якія з гэтага жывуць, але прэч ад прыватнасці звычайных грамадзян ці чытачоў „Нівы”, якія час ад часу адгукнуцца на балбатню на яе старонках. Ці зямляк Махнацкі Куптэль – гэта нейкі прэзідэнт, бурмістр або начальнік? Калі ён сам аб гэтым не ведае, то напэўна не займае публічнай пасады. А можа ён вядомы грамадскі дзеяч, якому трэба дасаліць, бо замест дзеяння нічога не робіць у грамадскасці? Таксама, не. Затым, кім жа да чорта ён ёсць, што Макацёр піша пра яго „гумарэску”, і адказвае на вышэйпастаўленае пытанне, папраўдзе пытаннем, але аднак – „мо за капцёвага будзеш?”.

А можа і буду! Гэта мая прыватная справа кім я буду. Ці не магу быць „абмусульманены” ці „абкаталічаны”, хоць дагэтуль не мяняў веравызнання то і далей не змяню.

Перашкаджае Сідару, што буду „сабакаром” ці „блазнам калысніка”?

Круціць і верціць Макацёр, але не дае адказу на пастаўленае мною пытанне, што ён думае пра веснавое бежанства албанцаў у 1999 годзе.

У выхадных даных „Нівы” напісана: „Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności”. А ці за змест творчасці блазнаў тыднёвік бярэ адказнасць?

Сакавік 2000 г.

# ГАЙНАЎШЧЫНА Ў ІНТЭРНЭЦЕ

Папрабуйма ўявіць сабе такую больш-менш сітуацыю. Нейкі бізнесмен хоча сэнсоўна заінвеставаць мільён долараў. З факту, што гайнавяне прывіталі міністра яйкамі даведаўся, што існуе такі горад як Гайнаўка і знаходзіцца каля Белавежскай пушчы. Пра Белавежскую пушчу наогул бывалыя ў свеце людзі ведаюць. З тэлебачання, далей, бізнесмен даведаўся, што калі паўстане Нацыянальны парк, мясцовыя людзі не будуць мець працы. Тады віртуальны бізнесмен падумаў, што калі заінвестуе мільён долараў у той жа Гайнаўцы, то людзі будуць мець працу, пушча астанецца непарушанай, а ён будзе мець прыбытак. Аднак бізнесмен нічога пра Гайнаўку і Гайнаўшчыну не ведае. Пераглянуў ён усе сервісы ў Інтэрнэце і нічога. Знайшоў „Ніву” на старонцы www.kurier-poranny.com/niwa, а Гайнаўкі там няма. З „Нівы” толькі даведаўся (кірыліцу ведаў), што паўстае „Гайнаўская Панарама” – польска-беларускі штомесячнік.Каб заінвеставаць хоць адну залатоўку, трэба ведаць ці інвестыцыя верне тую залатоўку разам з прыбыткам. Інакш гэта будзе не інвестыцыя, а толькі падарунак. Але хто дае мільённы падарунак?Чаму я аб гэтым пішу? Менавіта таму, што цяпер не так патрэбны штомесячнік, як старонка пра Гайнаўку і Гайнаўшчыну ў Інтэрнэце. На ёй павінны быць усе патрэбныя інфармацыі, каб зацікавіць і прыцягнуць патэнцыяльных інвестараў.Уся гаспадарчая, турыстычная і культурная інфармацыя павінна быць даступная ў цэлым свеце пры дапамозе Інтэрнэту. Як зрабіць такую старонку? Сябры з „Нівы” ведаюць і падкажуць.Так, так. Куптэль ведае, а Макацёр няхай вірue далей і не сыпле пясок у трыбы прагрэсу. Ад таго віравання Сідар ужо не ведае, на якім свеце жыве. Хоць з другога боку, калі паўстане Белавежскі парк і музей, то экспанатаў не трэба будзе далёка шукаць.

Красавік 2000 г.

# БУДУЧЫНЯ Ў СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ

Лёс Гайнаўшчыны і яе жыхароў мне не абыякавы. Гляджу на яе здалёк, перад усім вачамі карэспандэнтаў „Нівы”, і сваімі, калі час ад часу пабываю на ёй. Іншыя весткі проста рэдка даходзяць. Які ў мяне атрымліваецца вобраз? Вельмі сумны: ніякай будучыні, збожжа, бульбы, мяса, малака, яблык, груш і гародніны проста нельга прадаць.

Адны такое становішча Гайнаўшчыны лічаць вынікам эканамічнай палітыкі ўрада РП, накіраванай на знішчэнне рэштак беларушчыны. Другія вінавацяць камуну, якая прызвычаіла людзей да таго, што ўсімі справамі павінна клапаціцца дзяржава (якая не купляе збожжа, малака, мяса і г.д.).

Але так папраўдзе на чорта дзяржаве збожжа, малако, мяса? Каб накарміць і адзець некалькі соцень тысяч салдат і іншых патрабуючых, многа не трэба. Збожжа, малако, мяса патрэбны людзям, не дзяржаве! Калі мне патрэбны хлеб і гэта прыўважыць уласнік магазіна, ён зробіць усё, каб мне гэты хлеб прадаць, а прытым зарабіць. Тое ж самае з пекарам, млынаром і на канец з нашым гаспадаром. І так цягнецца ланцуг узаемнага бізнесу, аб якім малыя дзеткі вучацца ў школе. Калі вырастуць, забываюць, што такі натуральны ланцуг існуе.

Пад канец 1999 года слухаў я па радыё інтэрв’ю з прэзідэнтам Кваснеўскім. І ён кажа, што на развіццё і пераўтварэнне сельскай гаспадаркі дзяржава атрымае ад Захаду 170 млн. еўра. Але атрымае іх пад умовай, што прадставіць сэнсоўныя праекты выкарыстання тых грошай. Значыць, кожны пільнуе сваіх грошай, каб не змарнаваліся, тым болей капіталісты. Узнікае пытанне: ці яны такія альтруісты, ці маюць у гэтым свой бізнес? Па-мойму, калі наша гаспадарка стане на ногі, то мы самі сябе ўтрымаем на адпаведным узроўні жыцця і заходнія грамадствы не будуць слаць нам грошай на ўспамаганне.

Чытаю ў допісе Аляксея Мароза „Аб будучыні Гайнаўскага павета” („Ніва” н-р 2 ад 9.01.2000 года), што „ў ходзе дыскусіі распрацавана была ўступная стратэгія развіцця Гайнаўскага павета. Галоўны нацiск у ёй робіцца на турызм, агратурызм, прадукцыю здаровага харчавання і машынную прамысловасць”. Калі сур’ёзна разглянем „уступную стратэгію развіцця”, то робіцца на душы вельмі сумна. Бо ці гэта стратэгія будзе прадукаваць здаровае харчаванне? І без стратэгіі вядома, што трэба прадукаваць здаровае харчаванне, бо нездаровага прадаваць нельга.

Турызм і агратурызм? Дзе ён мае здзейсніцца? У Дубічах-Царкоўных, Нараўцы, Белавежы ці ў Гайнаўцы? Колькі можа прыехаць турыстаў у гэты куток Польшчы, каб большасць жыхароў Гайнаўскага павета гэта адчула?

Пэўна гэты куток вельмі экзатычны для турыстаў. Вядома, Белавежская пушча, беларусы, чыстая вада і паветра. Дастаткова, аднак, калі па радыё ці тэлебачанні паінфармуцюь, што ў Белавежскай пушчы завяліся кляшчы і ахвотных наведаць пушчу не будзе. Не ведаю, пра якую машынную прадукцыю піша А. Мароз, але думаю, што іншыя робяць гэта лепш.

Будучыню Гайнаўшчыны бачу ў развіцці сельскай гаспадаркі і жывёлагадоўлі. Апрача прылясных пясчаных палосак зямля ў Гайнаўскай, Чыжоўскай і ў частцы Дубіцкай гмін добрая. І грэхам было б, каб ляжала аблогам. Так, хтось скажа, але і тую сельскагаспадарчую прадукцыю цяжка збыць. Пэўна. У такіх абставінах, калі паўпадалі гмінныя кааператывы, якія скуплялі калісь сельгаспрадукцыю, паўстала размеркавальная пустыня. Селянін астаўся сам са сваім збожжам, мясам, а нават з малаком. Каб збыць плён сваёй працы, трэба немалых ведаў і захаду. Другая справа: ці фактычна трэба прадаваць сыравіну? Ці не лепей перарабляць яе на месцы на прадукты, на якія ёсць запатрабаванне. Добра было б, каб гмінная і павятовая ўлады, як і мясцовыя дзеячы аб тым думалі, а не тапілі грошы ў турызм, якога ніколі ў вялікім маштабе не будзе. Каб да такога вываду дайсці, не трэба вялікіх даследаванняў і інтэлігенцыі.

Партыі, якія былі, ці цяпер знаходзяцца пры ўладзе, не зацікаўлены ў развіцці гэтага кутка Польшчы, у якім жывуць карэнныя беларусы. Не хто іншы як ПСЛ выступае проціў ухвалення закону аб нацыянальных меншасцях. Няма чаго спадзявацца, што паможа СЛД ці УВ. Як самі сабе не паможам, ніхто рукі не прыложыць да паляпшэння жыцця жыхароў усходняй Беласточчыны. Што з такой канстатацыі вынікае? Адно тое, што ёсць маладое пакаленне свядомых беларусаў, якія могуць штурхнуць справу гаспадарчай актывізацыі Гайнаўшчыны ці Бельшчыны. Ну бо хто знаецца на Інтэрнэце, як не моладзь. Хтось спытае: а пры чым тут Інтэрнэт? Аказваецца, што Інтэрнэт стварае шанц, каб з прадуктамі хутка даходзіць да купцоў у розных кутках Польшчы ці свету. Каб здзейсніць гэту ідэю, не трэба многа грошай. Затое трэба мець крышку ведаў, уяўлення і ахвоты, а прытым гэта някепскі бізнес.

Май 2000 г.

# ПАДВОЙНАЯ МАРАЛЬНАСЦЬ

Студэнты факультэта гісторыі і культуры Гродзенскага універсітэта патрабуюць, каб лекцыі вяліся на роднай ім беларускай мове. Закон Рэспублікі Беларусь дае ім такое права, бо гэта ж дзяржаўная мова. Але закону, які дазваляе кожнаму вучыцца на яго роднай мове, недастаткова. Дэкан мае свой закон, нідзе папраўдзе не публікаваны, але абавязваючы ў мурах універсітэта: трэба вучыцца на мове братняй дзяржавы. Дэкан пільнуе, каб адхілу ад дзяржаўнай палітыкі не было. Маем тут прыклад, пашыраны ў постсавецкіх грамадствах, падвойнай маральнасці. Мала таго, такая мараль з'яўляецца нормай.

Усе ўспрымаюць такую сітуацыю нармальна. Дэкан невядома ці па сваёй ініцыятыве, ідзе далей. Вядзе даследаванне, каб знайсці правадыроў, якія парушаюць яго спакой нейкімі заявамі. Ён думае, што калі выкіне правадыроў з універсітэта, то ўжо ніхто не будзе дамагацца ўвядзення роднай мовы. Калі б дэкан быў фактычна гісторыкам, а не следчым на пасадзе дэкана, то ведаў бы, што ўсялякія рэвалюцыі наогул пачыналіся студэнцкімі дэманстрацыямі на універсітэтах. Так было ў сакавіку 1968 года ў Польшчы. Дык можа і лепш, што дэкан гістарычнага факультэта мае падвойную маральнасць і не дазваляе вучыцца на роднай мове. Усё ж гэта першы крок да дэмакратыі.

Чэрвень 2000 г.

# АБ НАШЫМ ЯДНАННІ

Калі чытаю ў штодзёнцы „Gazeta Wyborcza" ад 17.10.2000 г., што паводле беларускай рэжымнай прапаганды выбары ў Беларусі „spodobały się «obserwatorowi międzynarodowemu» z Polski, działaczowi SLD z Trójmiasta Romanowi Paterowi", то думаю, што нам, польскім беларусам, трэба доўга надумацца ці яднацца пад сцягам СЛД. А да такога яднання, як я зразумеў інтэрв'ю А. Вярбіцкага, заахвочвае пасол Сейма Рэчы Паспалітай Сяргей Плева (гл. „Ніва" № 42). Што трэба яднацца беларусам пад сцягам СЛД, каб каціць каляску ў адным напрамку „нашым" паслам вядома. Але прычым тут суадносіны СЛД да рэжыму Лукашэнкі на Беларусі? – хтось спытае. Для мяне гэта першы крытэрый нашага палітыка – яго адносіны да так званай дэмакратыі ў Беларусі.

Калі хтось мяркуе, што ў Беларусі пануе поўная дэмакратыя, то з такім мне не па дарозе. Але і ў СЛД ёсць розныя палітыкі, не толькі ў асяроддзі беластоцкіх беларусаў. Калі прымем, што „нашы" паслы адназначна адмоўна ацэньваюць дэмакратыю ў Беларусі, затым можна падрабязней разгледзець прапанову пасла С. Плевы да яднання, каб цягнуць каляску ў адным напрамку. Узяў я слова нашы ў двукоссе, таму што мне здаецца, што ёсць розніца між пасламі, якія рэпрэзентуюць СЛД, а пасламі, якія рэпрэзентавалі б беларусаў самастойна. Наколькі мне вядома, нашы паслы не дасталіся да Сейма РП у 1997 годзе. І далей цягнуўшы думку пра „нашых" паслоў, трэба выразна сказаць, што нашы паслы, уваходзячы ў саюз з СЛД, павінны быць незалежнымі ў справах звязаных з існаваннем нацыянальнай меншасці ў РП.

Пасол Сяргей Плева кажа: яднаймася, каб „каціць каляску ў адным напрамку". Я пытаю: чым мае быць гэта каляска і чым мае быць той напрамак? Добра было б, каб палітыкі, якія думаюць рэпрэзентаваць нас, падляшскіх беларусаў, у Сейме, і не толькі, акрэслілі гэты напрамак. Бо, які напрамак мае СЛД, больш-менш вядома, як вядома, якую каляску будзе СЛД цягнуць у левым напрамку.

Думаю, што я з'яўляюся ўважлівым чытачом „Нівы", але не здарылася мне многа чытаць пра дасягненні нашых паслоў, ці то ў Сейме, ці ў штодзённым грамадскім жыцці падляшскіх беларусаў. Затое многа я чытаў пра ўдзел паслоў у фэстах. Вынікае з таго, што на ніве культурнага развіцця беларусаў паслы праяўлялі вялікую актыўнасць: што субота – фэст, а то нават трэба было абслужыць і два фэсты ў дзень.

PS. А. Вярбіцкі пытае пасла С. Плеву: як у тым усім Вы, спадар пасол, бачыце нашу „Ніву"? Па-мойму „Ніва" павінна быць галоўным форумам дыскусіі і палемік, не толькі пра значэнне Грунвальдскай бітвы.

Кастрычнік 2000 г.

# ЦІ ЧАКАЦЬ НАМ МАННЫ НЯБЕСНАЙ?

Вельмі шкада, што агульнапольская, аб'ектыўная і фармуючая грамадскую думку прэса недаступная некаторым ніўскім карэспандэнтам і чытачам „Нівы”. Не пішу пра журналістаў, бо іх абавязак чытаць, прынамсі, усё, што тычыцца беларусаў і Беларусі. Цэзары Галіньскі, мінскі карэспандэнт „Газеты Выбарчай” піша (Г.В., 8.06.2001 г.): „Podobnie (так як арганізатара альтэрнатыўных прэзідэнцкіх выбараў у 1999 годзе Віктара Ганчара і былога прэм'ера Міхаіла Чыгіра) potraktowano potencjalnych przeciwników Łukaszenki w tegorocznych wyborach prezydenckich. Potencjalnych, bo przed ogłoszeniem daty wyborów, nie mogli zgłosić kandydatów. Na początku roku aresztowano młodszego syna byłego premiera Czyhira — jest podejrzany o handel kradzionymi samochodami. Syna zbiegłej do Wlk. Brytanii byłej szefowej Banku Narodowego Tamary Winnikowej, która wiele wie o mechanizmach władzy na Białorusi aresztowano za posiadanie narkotyków”. Калі б Мікалай Панфілюк, прачытаў карэспандэнцыю Цэзара Галіньскага, то можа хоць крышку падумаў бы рэфлексіўна, што можа з „дэмакратыяй” Лукашэнкі не так, як хваліць яе дэпутат польскага Сейма Ян Сычэўскі, выбраны не беларусамі Беласточчыны, а толькі дзякуючы краёваму спіску СЛД.

Уважліва прачытаў я інфармацыю Міхася Хмялеўскага з пашыранага пленарнага пасяджэння Галоўнага праўлення БГКТ, якое адбылося 29 красавіка г.г. Апрача тэмы, невядома яшчэ ці актуальнай, „БГКТ у парламенцкіх выбарах 2001 г.” тэмай пасяджэння пленума была „Справаздачна-выбарная кампанія і падрыхтоўка да XIV З'езда БГКТ”. Пад якім, прынамсі мяне цікавіць, лозунгам адбудзецца кампанія? Што хоча дасягнуць БГКТ? Якія справы наладзіць у грамадскасці беларусаў Беласточчыны? Бо ў мяне складаецца ўражанне, што апрача ладжання фэстаў, БГКТ нічым станоўчым не займаецца.

А ёсць дзялянка дзейнасці для няўрадавых беларускіх арганізацый Беласточчыны, і то больш станоўчая, чым арганізацыя такіх мерапрыемстваў як Купалле ці шматлікія фестывалі і фэсты. Гэта перш за ўсё вядзенне пастаяннай асветніцкай працы сярод сялян на тэму гаспадарчай дзейнасці ў змененых капіталістычных умовах і рыначнай гаспадарцы. Нельга думаць, што вернецца эпоха падобная на лукашэнкаўскую. Трэба, спадары лідэры беларускіх арганізацый, войты і начальнікі, ісці ў народ і вучыць яго як карыстацца грошамі еўрапейскіх фондаў, як карыстацца Інтэрнэтам, каб пахваліцца сваёй прадукцыяй і каб інфармацыя аб ёй хадзіла да пакупнікоў. Каб атрымаць грант на канкрэтную дзейнасць, трэба ведаць як напісаць пераканаўчы праект выкарыстання фінансавых сродкаў. Тут не можа быць

агульнага падыходу да тэмы а дэталёвы, бо інакш ніхто і гаварыць не схоча. Думаю, што абавязкам усіх радных, войтаў і бурмістраў з'яўляецца дапамога людзям перамагаць дрэннае становішча. За тое яны бяруць грошы, а не за тое, каб грэць крэслы. Не ведаю чаму, якія рацыянальныя аргументы падпавядаюць нашым дзеячам адкідаць еўрапейскі напрамак палітыкі III Рэчы Паспалітай.

Калі Дарафей Фіёнік не бачыць карысці для нашай меншасці ад такой палітыкі, то фактычна не трэба дзівавацца Яну Сычэўскаму, які расхвальвае лукашэнкаўскую сістэму ў Беларусі. Д. Фіёнік піша, што „ «тройка» не ідзе за моднай цяпер індактрынацыяй дзяцей у еўрасаюзным напрамку і не арганізуе абсурдных «еўрапейскіх» святкаванняў. Усё гэта праўда, і ўсё гэта вельмі добра. І той школай трэба нам даражыць”. Даражыць трэба, спадар Фіёнік, усім, чым „школа цэніць і развівае ўсё што роднае, найбліжэйшае сэрцу”, але гэта не пярэчыць еўрапейскаму напрамку развіцця грамадскасці. У скансэн беларусаў зачыніць трэба, ці як. З таго, аб чым піша Фіёнік вынікае, што еўрапейскі напрамак шкодны беларусам. Разумею, што Еўропа шкодзіць лукашэнкаўскаму рэжыму, але нам, тут?!

Думаю, што трэба карыстацца ўсім, што добрае ў Еўропе. Прынамсі не будзем рабіць памылак, якія рабіла Еўропа на шляху свайго развіцця. Не ведаю, чаму з такой зацятасцю і нянавісцю нашы людзі пагардліва гавораць пра „дэмакратыю”. Што ім гэта „дэмакратыя” забрала? Шчасце? Грошы? І пры чым тут дэмакратыя? Вядома, прывыклі мы, што хтосьці за нас думаў, „даваў” кватэру, машыну, трактар. Дайшло да таго, што давалі ўжо харчовыя прадукты на талоны. А вытворчасць тады ішла поўным ходам. Даваў! Як жабраку. А атрымліваў гэтае дабро той, хто быў бліжэй карыта. Пра якую тут можна гаварыць справядлівасць, калі без хабараў нічога не можна было купіць, ані аформіць. Мільёны людзей карысталіся працай іншых, перад усім працай сялян. Вёска трымала на сваіх плячах амаль цэлы прагрэс горада. І таму зараз вёска адстае ад узроўню еўрапейскага вясковага жыцця. Але ці толькі такая прычына заняпаду жыцця? Перад усім кошт трансфармацыі з так званай размеркавальнай гаспадаркі да рыначнай адчувае агул маладукаваных людзей, прынамсі ў яе пачатковай фазе. Цяпер цяжка знайсці працу нават і высокаадукаваным маладым людзям. Але ці гэта абазначае, што трэба чакаць манны нябеснай, або таго аднаго справядлівага бацьку, які зробіць усіх шчаслівымі?

Люты 2001 г.

# МЕРАПРЫЕМСТВЫ „ХАТКІ”

Беларуская „Хатка”, якая існуе ў Трыгарадзе, перамясцілася з Гданьска ў Сопат. У красавіку пра яе загаварылі гданьскія сродкі масавай інфармацыі: радыё, тэлебачанне і прэса. А нагодай гэтаму было ўрачыстае адкрыццё (22 сакавіка) фатаграфічнай выставы „Сённяшнія людзі Палесся” і такая ж вячэра з нагоды 83-х угодкаў апавяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі (25 сакавіка). Дзякуючы спонсарам (Гданьскае інвестыцыйнае таварыства, суполка „Міртранс” з Гдыні, улады Сопата і інтэрнэтавая старонка www.trojmiasto.pl), выставу сарганізавалі БКТ „Хатка”, Таварыства сяброў Сопата і Кафедра беларускай культуры Універсітэта ў Беластоку. Экспануецца яна ў дворыку Серакоўскіх у Сопаце. Выставу ў прысутнасці шматлікіх гасцей адкрыла старшыня „Хаткі” д-р Лена Глагоўская, а з дакладам пра Палессе выступіў прафесар Анджэй Хадубскі з Гданьскага універсітэта. Аб тым, што было гэта важнае культурнае мерапрыемства ў жыцці Сопата сведчыць прысутнасць на вернісажы віцэ-прэзідэнта горада Войцеха Фулка і зацікаўленне СМІ. З тысячы фатаграфій Палесся Юзэфа Абрэмбскага з 1936 года і сотні сучасных, куратар выставы Катажына Домбэк – этнолаг Варшаўскага універсітэта выбрала некалькі дзесяткаў. Фатаграфіі паказваюць штодзённае жыццё палешукоў паўвека таму і для кантрасту – яго сучасны вобраз.

Беларускае асяроддзе Трыгарада 25 сакавіка ўрачыста адзначыла 83-я ўгодкі Беларускай Народнай Рэспублікі. У праграме было складанне кветак на магіле Лукаша Дзекуць-Малея на гарнізонным могільніку ў Гданьску, даклад д-ра Юрыя Туронка „Беларускі выдавецкі рух у ІІ Рэчы Паспалітай” і прамоцыя кнігі дакладчыка „Książka białoruska w II Rzeczypospolitej 1921-1939” у дворыку Серакоўскіх. Д-р Туронак у дакладзе гаварыў, між іншым, пра выдавецкі беларускі рух у міжваенны перыяд у кантэксце сучаснага існавання беларушчыны ў ІІІ Рэчы Паспалітай, як і ў савецка-лукашэнкаўскай Беларусі. Сёння на аднаго жыхара Беларусі прыпадае менш чым беларуская кніжка ў год, а ў Літве аж пяць. Вывад д-ра Туронка такі, што як калісь, так і цяпер колькасць выданняў залежыць ад існавання народа як нацыі.

Урачысты вечар прысутныя закончылі сяброўскім спатканнем пры гарбаце ў сядзібе „Хаткі” па вуліцы Складоўскай у Сопаце.

Сакавік 2001 г.

# НЯХАЙ ВАС НЕ ЗВОДЗЯЦЬ ПАХВАЛЬНЫЯ ЛІСТЫ

Яшчэ некалькі гадоў таму не меў бы я ніякага сумнення, каб шчыра сказаць, што на душы тое і на паперы. Цяпер кожнаму слову, кінутаму ў агародчык „Нівы”, прыглядаюся крытычна толькі таму, каб каго там фальшыва не зняважыць. І выходзіць на тое, што больш-менш кожны дзесяты нумар „Нівы” даецца чытаць. Так, так, дарагія рэдактары, няхай Вас не зводзяць пахвальныя лісты некаторых чытачоў. Не ведаю як існуюць журналісты „Нівы” ў „Ніве”! Чытаўшы іх тэксты, маю пачуццё, што замест існаваць у „Ніве”, снуюцца па ўзбярэжжах журналістыкі ці публіцыстыкі. Прыкладам можа быць рэгістрацыя заняпаду жыцця ў беларускіх вёсках усходняй Беласточчыны паводле адной схемы: прыезд рэдактара „Нівы” ў вёску цягнікам (аўтобусам), інтэрв’ю з солтысам, або іншым жыхаром, крышку статыстыкі, выезд з вёскі пад вечар. Вывад: зніканне жыцця вёскі, адной, другой, трэцяй. Пэўна так ёсць, але колькі ж можна чытаць такіх „рэпартажаў”.

Другі прыклад. Апошняя старонка з’яўляецца нібыта старонкай сатырычнай. Але Вандал Арлянскі траціць ужо жарт у сваёй творчасці. Не дзіва. Штотыдзень штосьці трэба напісаць. А каб яшчэ сатырычнае? Выходзіць чысты вандалізм. Ні то плакаць, ні смяяцца. Не мае шчасця „Ніўка” да аўтараў. Як не Макацёр, то Вандал — „boki zrywać”. Яшчэ прытым глянуўшы на здымкі, падпісаныя лозунгам „Еўрасаюз, як ты мне мілы...!”

Дарагія фотарэпартажысты, вы глядзіце на Еўрасаюз вачамі Мікалая Капчука. Не маеце сваіх вачэй, ці як? Я, як чытач „Нівы”, гляджу на гэтыя здымкі як на прапаганду антыеўрасаюза: куды нам да Еўрасаюза, калі валяцца хаты, закрываюць чыгуначныя станцыі, і т.д., і т.п. Бедная гэта краіна, поўная заняпаду і нэндзы. Калі так глядзім на фотарэпартажы У. Сідарука і чытаем рэпартажы А. Вярбіцкага, то мусім прызнаць рацыю варшаўскім уладам, што хочуць зрабіць з усходняй Беласточчыны запаведнік, скансэн беларушчыны. Ніякага прагрэсу? Нічога не змянілася на лепшае за дзесяцігоддзі нашага тут існавання? Далей жнем сярпом, косім касой? Не ведаю ці хоць адзін конь ёсць у Махнатым. Ваду ўжо не цягаем з калодзежа, маем нават дзе-нідзе каналізацыю. У кожнай хаце тэлефон, не гаворачы пра радыё ці тэлевізар. А як людзі прыгожа і дорага апрануты і не абуваюць перад царквой адзіных ботаў, як калісь. А якая механізацыя ў гаспадарцы. Хто гэтага не бачыць, фальшуе рэчаіснасць. Так, так дарагія рэдактары „Нівы”, трэба глядзець на гэтую ж рэчаіснасць усебакова. А калі хтосьці не ўмее так глядзець, або мае скрыўленыя вочы, не мусіць працаваць у „Ніве”.

Яўген Мірановіч піша, што няма водгуку на ліст 14-ці („Ніва” н-р 51). А якога водгуку ён спадзяецца? Хто будзе адказваць на пастулаты і нараканне, калі яго да гэтага не прымусім. Справа ж вельмі простая. Выслаць журналістаў „Нівы” да адрасатаў ліста, прыгатоўленых да размовы і запытаць іх, што яны думаюць пра змест ліста. І паведаміць чытачам „Нівы”, слухачам „Рацыі” і не толькі. Такая ёсць павіннасць журналістаў. Чацвёртая ўлада ў „Ніве” не выкарыстоўвае сваіх атрыбутаў. Ніхто ж не абмяжоўвае вашай, рэдактары, дзейнасці.

Яшчэ маю адно пытанне да галоўнага рэдактара „Нівы”. Ці фактычна з „Нівай” не хочуць пастаянна супрацоўнічаць інтэлектуалы з асяроддзя свядомых беларусаў, якія пісалі б не толькі пра мінулае, але і пра рэчаіснасць сённяшняга дня. Штогод выходзяць дзесяткі маладых выпускнікоў беларускіх філалогій у Польшчы і дзесьці яны існуюць. Пытанне дзе? І ці сярод іх няма вельмі таленавітых адзінак, якія сваімі здольнасцямі падмацавалі б старонкі тыднёвіка? Немагчыма, каб не было. І так можна было б многа пісаць пра недахопы і дасягненні журналістаў „Нівы”. З другога боку можна было б махнуць рукой і перастаць чытаць адзіную беларускую газету, калі б не хваравітая цяга да „Нівы”. Проста ўжо хвароба. Але як доўга можна жыць у атуманелым стане?

Добрага здароўя ўсім журналістам „Нівы” жадае „ўзалежнёны” чытач.

Ад рэдакацыі: За жаданні дзякуем, а Вашы заўвагі пастараемся ўлічыць у рэдакцыйнай працы.

Красавік 2001 г.

# НЕАДПАВЕДНАЕ ПАРАЎНАННЕ

Паводле Яўгена Мірановіча ўсё, што дрэннае на гэтым свеце дзеецца невыпадкова. Піша ён, што найбольш багатыя і магутныя гэтага свету – селі, падумалі, пагаварылі і дайшлі ў канцы да вываду, што зусім не трэба пасылаць свае войскі на тэрыторыю, якую хочацца кантраляваць. Хапае дзеля гэтага карумпаваць мясцовую эліту. Не так цяжка гэта зрабіць – разважае аўтар – калі нехта мае грошы. Пару мільярдаў долараў, заінвеставаных у сродкі масавай інфармацыі ці банкі ва Усходняй Еўропе далі на шмат лепшы палітычны вынік, чым сотні мільярдаў долараў, якія раней кожны год прызначаліся на пабудову ядзерных ракет, самалётаў (глядзі: „Ніва" №53 ад 31.12.2000 г., стар. 1 і 2). Інакш кажучы, дзякуючы карупцыі – як піша далей у артыкуле „Дачакаць XXII стагоддзя" Я. Мірановіч – багацеі з Захаду, зусім танна, заваявалі нашы тэрыторыі. Мала таго, што забіраюць банкі або сродкі масавай інфармацыі, то пры дапамозе капітала - ўкладанняў фарміруюць яшчэ свядомасць мясцовага грамадства. А мясцовае грамадства, як бязвольная, атуманеная грамада авечак, ідзе там, дзе накіруе яе заходні багаты буржуй.

Сустракаю калі-нікалі людзей, якія ва ўсім дрэнным вінавацяць яўрэяў. З імі ніякай разумнай размовы весці нельга, яны і так ведаюць, што жыды заваявалі свет. І то ад моманту, калі распялі Хрыста на крыжы. У разважаннях Я. Мірановіча бачу ўплыў мінуўшчыны на бачанне сучаснасці. Бальшавікі так сама глядзелі на свет і лічылі, што ўсё дрэннае, дзеецца невыпадкова. Ну і шукалі вінаватага, а такога заўсёды можна знайсці, меўшы ў распараджэнні апарат рэпрэсіі. Выходзіла наогул на тое, што вінаватым быў гнілы Захад.

Апрача зусім маладых жыхароў Польшчы, наогул усе астатнія ведаюць, як выглядала гаспадарка рэальнага сацыялізму. Не было ані тавараў, ані капіталаў. Ціж самі мы мелі дарабляцца гадамі капіталу, абрабляючы натуральную гаспадарку?! Але справа не толькі ў гаспадарцы. Ёсць яшчэ дэмакратыя, свабода. Гэта само па сабе складае чалавечую вартасць. Яўген Мірановіч, ставячы закід заходнім багацеям, што хочуць яны падпарадкаваць сабе народы Усходняй Еўропы, ставіць іх у адным радку з усімі грабежнікамі, якія ў XX стагоддзі хацелі падпарадкаваць сабе славян пры дапамозе ваенных заваёў.

Думаю, што такое параўнанне не на месцы. Ніхто не прымушае карыстацца дасягненнямі заходняй цывілізацыі. Далей можна быць панам і сахі, і касы. Маем жа дэмакратыю і свабодны выбар.

Май 2001 г.

Ад аўтара:Спадар Міхась, шчыра каюся, што я, асабіста, у Беластоку хацеў бы бачыць „заходнія" банкі, а не танкі. Банкі мне зусім не перашкаджаюць. І гэта, здаецца, я і напісаў у сваім артыкуле?!

Яўген МІРАНОВІЧ

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ТОЕСНАСЦЬ І ЦАРКВА

Зацікавілі мяне пажаданні Яго Блажэнства Савы, мітрапаліта Варшаўскага і ўсяе Польшчы („На зломе стагоддзяў” – „Ніва” н-р 1 ад 2001 г.), накіраваныя беларусам у наступаючым новым годзе: „А беларусам жадаю большай свядомасці сваёй нацыянальнай тоеснасці, унутранага патрыятызму, адвагі і адкрытасці, спалучанай з ліквідацыяй баязлівасці – ва ўсіх яе аспектах”. Вялікая праўда! Іншыя нацыі бачаць нас так як бачыць Яго Блажэнства Сава. Хоць з другога боку нацыя як грамадства не мае такіх сацыялагічных рысаў як, напрыклад, баязлівасць ці лянівасць. Яны, па-мойму, характэрны адзінкам, а не нацыі. Баязлівасць, ляніства, ці п’янства – гэта рысы грамадскасці абумоўлены перад усім палітычнай сітуацыяй дадзенай нацыянальнасці, а потым усімі іншымі фактарамі. А якія былі (ёсць?) палітычныя ўмовы беларускай меншасці ў Польшчы наогул усе ведаюць, не гаворачы пра палітычныя абставіны беларусаў у Рэспубліцы Беларусь.

Наша нацыянальная тоеснасць у немалой ступені залежыць ад Праваслаўнай царквы, нацыянальнай свядомасці яе святароў. Калі святар на ўроках рэлігіі гаворыць да дзяцей на іншай мове, чым мова бацькоў, калі ў царкве пропаведзь бацюшка кажа па-польску, то людзі міжвольна пачынаюць не шанаваць сваю родную мову. Калі бацюшка адмаўляецца памагчы згуртаванню праваслаўных беларусаў (прыклад гданьскай „Хаткі”), бо ён „палітыкай не займаецца”, не хоча мець клопату на галаве, а прытым Царква і хрысціянская вера не адрозніваюць нацыянальнасці, то, вядома, што ў грамадскасці паўстае разгубленасць: а можа фактычна малаважная тая беларускасць і можна быць праваслаўным палякам? Толькі не ведаю, чаму Каталіцкі касцёл так клапоціцца пра сваіх польскіх вернікаў і калі трэба памагае ім (напрыклад, у час ваеннага становішча ў васьмідзесятыя гады).

Жаданні мітрапаліта Савы, накіраваныя беларусам успрымаю так, што Царква ў сваёй Божай службе большую ўвагу зверне на нацыянальнае адраджэнне беларусаў.

18 сакавік 2001 г.

# АБ ЗАНЯПАДЗЕ БЕЛАРУСКАСЦІ

Ці фактычна заняпад беларускасці ў Беластоку гэта працэс няўхільны? Думаю, што гэтае пытанне не дае спаць усім дзеячам шматлікіх беларускіх арганізацый (ад БГКТ па Беларускі саюз), супрацоўнікам радыё, тэлебачання, рэдакцыям і навуковым установам. Гэта ўжо зусім немалая група свядомых беларусаў. Яна існуе не на правінцыі, але ў самым Беластоку. Таму не вельмі разумею песімізм Яўгена Мірановіча, які піша, „што беларускасць у гэтым горадзе не мае вялікай будучыні” („Ніва” н-р3). А можа таму так аўтар думае, што беларус з Гайнаўкі хоча, каб „Гайнаўка стала цэнтрам, сэрцам беларускасці ў Польшчы”. Затым роля Беластока, нягледзячы на тое, што жыве ў ім каля 40% (больш-менш – хоць так папраўдзе то невядома колькі) насельніцтва беларускага паходжання.

Пэўна, лёгка сказаць ці напісаць: вярнуць беларускасць у Беластоку. Але як гэта зрабіць, калі беларускае асяроддзе разам з яго арганізацыямі вельмі раздробленае. Кожны цягне ў свой бок. Больш у гэтай дзейнасці амбіцыі і індывідуальнага падыходу да справы. Задумаймася над інфармацыяй Міхася Хмялеўскага з пашыранага Пленума БГКТ („Ніва” н-р1 зг.г.), які піша: „Старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі паінфармаваў пленум аб тым, што ён падпісаў Дагавор аб супрацоўніцтве паміж Саюзам левых дэмакратаў і Беларускім грамадска-культурным таварыствам у Польшчы, у якім, між іншымі, гаворыцца: «Саюз левых дэмакратаў і БГКТ, маючы неабходнасць супольнага дзеяння ў карысць будовы лепшай, справядлівейшай Польшчы, у якой дамінуючай вартасцю з’яўляецца годнасць чалавека і грамадская справядлівасць, пастанаўляюць заключыць дагавор аб супрацоўніцтве»”. Заўважма: найсамперш старшыня падпісвае дагавор, а потым члены пленума прагаласавалі і апраўдалі гэты дагавор. Пакуль што, дэмакратыя ў БГКТ яшчэ не існуе, хоць было галасаванне, а як жа! Або інакш, больш тут „дэмакратыі” ў лукашэнкаўскім стылі. А які змест дагавора: будуць дагаворшчыкі будаваць лепшую і справядлівейшую Польшчу, каб у ёй жылося годна і справядліва. Невядома ці плакаць, ці смяяцца. Як гавораць палякі: wraca nowe. Будавалі дзесяцігоддзямі лепшую і справядлівейшую Польшчу так, што „памірае беларуская вёска, не родзяцца там дзеці, павялічваецца дэмаграфічная дэпрэсія”. Не лепш, каб узяліся за ліквідацыю гэтай дэпрэсіі?

Па-мойму, справа будучых выбараў вельмі сур’ёзная і дзіўна, што ў асяроддзі БГКТ не знайшоўся ніхто, хто падказаў бы старшыні Сычэўскаму, што такі дагавор нічога не дае беларускаму грамадству, апрача некалькіх дзеячаў.

Ліпень 2001 г.

# СТАРАЮСЯ ПАМАГЧЫ ДОБРЫМ СЛОВАМ

На мой крытычны закід у бок „Нівы”, адгукнуліся самыя важнейшыя тузы ніўскай публіцыстыкі: Яўген Мірановіч, Аляксандр Вярбіцкі, Уладзімір Сідарук. Нават Сідар Макацёр адазваўся на мой свежы норд-вест подых, хоць, пэўна, ужо ад старасці паблытаў эпохі. „У час Геркавага дрангу” я яшчэ „Нівы” не чытаў, не гаворачы пра тое, каб – „цюцелька ўцюцельку” дбайна даваць парады. Пэўна, „Ніва” ў час гамулкаўскага і геркаўскага дрангу друкавалася, але каб яе можна было чытаць, не скажу. І таму яшчэ цяпер мне хочацца пісаць крытычныя заўвагі ў бок „Нівы” і яе рэдактараў, каб „Ніву” можна было чытаць.

Усім маім палемістам вялікае дзякуй! Адгукнуліся, значыць, чытаюць мае допісы. Акалі так, то больш шчасця і не трэба для, хай сабе і нядзельнага карэспандэнта. Пакорліва выслухаю, хоць згаджацца з іх поглядамі не буду. Затым непатрэбна выдатны журналіст (не то што я – нядзельны карэспандэнт) – Аляксандр Вярбіцкі іранізуе ў сваёй палеміцы „Брытні, Джэніфер і Катажыне – не!” на маю тэму, што нібыта для мяне ён напіша „дасканалы рэпартаж”. Не дай Бог, каб толькі я чытаў вашы рэпартажы. Такога заняпаду Вашай рэпарцёрскай дзейнасці не жадаю і не спадзяюся.

Яўген Мірановіч піша, што „цяжка не прызнаць яму (значыць мне – М. К.) рацыі, але...”. Калі нават цяжка не прызнаць рацыю, то якое яшчэ ёсць „але”. І далей: „стараемся, робім усё, што ў межах нашых магчымасцей, але ніхто яшчэ вышэй сваіх плячэй не выскачыў”. Сваіх не, але іншых пэўна можна выскачыць. Трэба толькі ўсвядоміць, што журналісты тыднёвіка незалежны ад нікога, маюць вялікія магчымасці. Іншыя маюць сваіх уласнікаў, вы падлягаеце толькі закону. Чаго ж лепшага, каб крытычна адлюстроўваць беластоцкую рэчаіснасць. Баяцца ніякіх начальнікаў, а цяпер бурмістраў і войтаў не трэба. Бо яны з працы не звольняць. Яны ж на тое ўлада і бяруць за гэта немалыя грошы, каб думаць перад усім, а потым ператвараць бельскагайнаўскую рэчаіснасць, каб людзям жылося лепей чым калісь. Калі ў„Газеце выбарчай” чытаю цыкл рэпартажаў пра Члухуў, то думаю сабе, чаму так не робяць у Гайнаўцы ці ў Бельску, толькі наракаюць на рэчаіснасць, разам з ніўскімі журналістамі і карэспандэнтамі. Пэўна, ніхто не любіць, каб яму хтось даваў парады. І я далёкі ад таго. Але калі хтось публічна наракае на свой лёс, значыць, чакае дапамогі. Затым стараюся хоць добрым словам памагчы. Таму, спадар Сідарук, мае карэспандэнцыі выглядаюць на парады. А пры нагодзе, Вы пішаце, што Вашым абавязкам, як карэспандэнта, паказваць факты, і перад усім факты. І добра. І так павінна быць. Аднак я хацеў бы яшчэ ведаць, што думаеце Вы асабіста пра гэтыя факты. Якія Вашы погляды

на тыя факты. Але то ўжо неабавязкова. А якая выснова, па Вашаму, з такіх двух фактаў: у Гайнаўцы, і не толькі ў горадзе, але і ў гміне, вялікае беспрацоўе. Другі факт: літровы слоік агуркоў у магазіне ў Гданьску каштуе пяць злотых. Ці трэба быць вялікім інтэлектуалам, каб павязаць гэтыя два факты? Адзін за дзень прадасць дзве свечкі за 4 зл., другі купляе слоік агуркоў за пяць злотых. Кожны жыве па-свойму. Але ёсць і промень надзеі для беларусаў, які бачны на здымку („Ніва" н-р14). Журналістка „Нівы" ўключылася з паэзіяй у палітыку. Толькі ці суполка П. Ікановіча і А. Лепэра гэта добры адрас для вершаў? Яны ж займаюцца цвёрдай палітыкай?!

жнівень 2001 г.

# КРЫТЫЧНА ДЗЕЛЯ ПРАГРЭСУ

Пра Антосевы турботы пісаў у „Ніве” ад 2 снежня 2001 г. Мікалай Лук’янюк. Не было б у тым нічога дзіўнага, каб не вывад, што салідарнікі давялі Антося да жабрацтва. Моцны вывад. Але ці ён фактычна займаецца жабрацтвам, ці толькі так думае наш карэспандэнт? Ці так, як калісь стаіць у святочны дзень ля царквы з працягнутай рукой, ці чакае дапамогі дзяржавы, бацькоў, суседзяў ?

Фактычна, цяжка змяніць сваю жыццёвую сітуацыю, калі чалавек уладкаваўся ў гарадской кватэры, прывык да, як не кажы, лепшага чым на бацькавай гаспадарцы, жыцця. Астаецца затым настальгія па мінулым і чаканне, што нехта зменіць нам лёс.

Разумею, што Антось – гэта працаздольны мужчына, здаровы, прыгнечаны беспрацоўем. Думаю, Антось мог бы звярнуцца, напрыклад, да магутнай беларускай арганізацыі БГКТ за дапамогай. Пішу зусім не іранічна і не аплёўваючы БГКТ – магутную арганізацыю, бо калі саміх дэлегатаў на з’езд выбрала яна 90, то арганізацыя не малая, статыстыка не хлусіць.

Вельмі ўважліва прачытаў я інфармацыю М. Хмялеўскага са з’езда БГКТ і не дачытаўся чым БГКТ зоймецца ў будучыні, бо ў мінулым, вядома, жабрацкім лёсам беспрацоўных не займалася. Апрача 79 дэлегатаў у з’ездзе ўдзельнічала больш за 51 госць. Можна дадумацца, што гэта вярхушка гмінна - павятовай улады Падляшскага ваяводства. З чым яны прыбылі на з’езд? З якімі прапановамі? Ці толькі з нараканнямі ? Калі яна не ў змозе дапамагчы Антосю, то хто? Чаму ніхто на з’ездзе такіх пытанняў не ставіў ? Нагода была, каб публічна запытаць улады пра „жабрацтва” беларусаў.

На XIV з’ездзе БГКТ Ніна Цыванюк – дэлегатка з Гарадка патрабавала вярнуць „Ніву” БГКТ. Пытаю, ці БГКТ мела „Ніву”, каб цяпер трэба было яе вяртаць? „Ніву” выдае Праграмная рада тыднёвіка і мае на гэта прававое ўстанаўленне, з усімі законнымі паслядоўнасцямі і не можна, от так сабе, па бальшавіцку, „вярнуць” „Ніву”, не парушаючы законаў. Але ёсць магчымасць „вярнуць” „Ніву” шырэйшаму колу беларусаў Польшчы. Калі я пісаў свае крытычныя заўвагі пра „Ніву”, думаў, што адазвуцца чытачы, карэспандэнты, дзеячы не толькі БГКТ, але і іншых 18 беларускіх арганізацый. І не дзеля аплёўвання „Нівы” пісаў я крытычна, але дзеля прагрэсу. Дыскусіі вялікай не было, збоку БГКТ ніхто не адазваўся. А можа „Ніва” не хоча друкаваць поглядаў дзеячаў БГКТ ? Нічога аб гэтым М. Хмялеўскі ў справаздачы са з’езда не піша. Значыць, дэлегаты на гэта не наракалі.

Шкада, што члены БГКТ не пішуць у „Ніву”, не ўсеж маюць погляды згодныя з меркаваннямі А. Лепэра на рэчаіснасць, і не ўсеж думаюць як Я. Сычэўскі ці А. Лукашэнка. Усе скарысталі б з адкрыўчых думак, не толькі пастаянных і шматгадовых карэспандэнтаў „Нівы. Пішыце, братцы ў „Ніву”! Яна ж — тыднёвік беларусаў у Польшчы.

сакавік 2002 г.

# НАРАКАЦЬ КОЖНЫ МОЖА АЛЕ...

Здзіўляе мяне папулізм старшыні Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва”. Разумею тых карэспандэнтаў „Нівы”, якія бачаць дэмакратыю ў ІІІ Рэчы Паспалітай як ашуканства, але чаму журналіст і да таго прафесар так яе асуджае, калі ў сваім фельетоне („Ніва” № 22 ад 2.06.2002 г.) піша: „З лібералізмам, капіталізмам ці дэмакратыяй усё што адбываецца ў Польшчы пасля 1989 года, мае толькі сімвалічную сувязь”. Не ведаю. А так пры нагодзе, хацелася б пачытаць, як мела б выглядаць дэмакратыя паводле вучонага фельетаніста. Бо чытаю таксама, як чытачка „Нівы” Надзея М. Барт-Юрэвіч, усё што піша Мірановіч у „Ніве”, але апрача нараканняў, нічога станоўчага не магу дачытацца. Пэўна, Мірановіч адкажа, што ён не палітык. Так, я з тым згодны, але чаму ён займаецца палітыкай? – Шыкуецца да асенніх выбараў у самаўрады ці як? І піша так, як хочуць слухаць прыхільнікі Лепэра? Хоць з другога боку, як сам заяўляе, ён глыбока перакананы, што „ПНР ніколі не спыніла свайго існавання”, што далей, як у таго Карабаша, цяпер на паліцах у магазінах стаіць адзін воцат? Разумею, што Лепэр навокал бачыць карупцыю і зладзейства – ён змагаецца за ўладу і прымяняе такую сацыятэхніку, якая ў такі складаны час для грамадства найлепшая, каб тую ўладу здабыць, дзякуючы, не чаму іншаму, як дэмакратыі. Але чаму Я. Мірановіч упісваецца ў адзін голас з Лепэрам, не ведаю, хоць калі так падумаць, то можа Мірановіч хоча забяспечыць масты, цяпер. Бо калі Лепэр возьме ў свае рукі поўную ўладу, гэта будзе козыр у рукі, але я існавання „Нівы”, фінансаванай той жа ўладай, не прадбачваю. Нават тады, калі „Ніву” поўнасцю ўтрымліваць будуць чытачы.

Я. Мірановіч у сваёй публіцыстычнай дзейнасці многа піша пра паўсюдную карупцыю, прысвоеную людзьмі эліты ўлады маёмасць. Пішу, што многа піша, бо так ёсць. У кожным артыкуле, аўтарам якога з’яўляецца Мірановіч, вобраз рэчаіснасці трагічны. Няма бяспекі, людзі баяцца вечарам выходзіць з хаты, удзень падлеткі нападаюць на старэйшых, тэрарызуюць гарадскія кварталы. Адвакаты амаральныя, а суддзі і пракуроры карумпаваныя. Затым якая ж можа тут быць справядлівасць. „Карупцыя стала амаль фармальным элементам публічнага жыцця, а палітыка найбольш прыбытковай формай публічнай актыўнасці”. Мірановіч дзеліць грамадства на нас добрых і злых палітыкаў. Ага, яшчэ да злых залічае падлеткаў, якія сталіся таму злымі, што „выхоўваліся на фільмах-баевіках, прапагандуючых усялякія спосабы забойства”. На такі заняпад жыцця ў ІІІ Рэчы Паспалітай Мірановіч прапануе просты выхад: „Без змены юрыдычнага і эканамічнага становішча ў краіне немагчыма будзе дачакацца бяспекі на вуліцах гарадоў”. Далей, трэба

адсунуць ад улады лакальных „царыкаў” і карумпаваных палітыкаў, тады працоўны і беспрацоўны люд зварухнецца са стану безнадзейнасці.

Складаецца ў мяне досыць сумная рэфлексія: журналіст, прафесар Беластоцкага універсітэта не бачыць складанасцей сучаснага жыцця ў перыядзе перамен. Наракаць на карупцыю, зладзейства, заняпад можа кожны, але журналісты, публіцысты, рэпартажысты павінны пісаць канкрэтна: той і той палітык карумпаваны, да таго і таго чыноўніка не падыходзь з пустым канвертам і г.д.

Чытаю, што заснаваўся ў Беластоку Форум нацыянальных меншасцей, мэтай якога з’яўляецца перамога ў асенніх самаўрадавых выбарах. Нягледзячы на разнароднасць асяроддзя, удалося стварыць палітычную структуру, якая ідзе да ўлады. Так быць павінна! Хоць ёсць небяспека, што людзі зноў скажуць: стварылі Форум, каб „жондзіць”. Затым трэба Форуму акрэсліць супольную праграму дзейнасці, калі ўжо „возьме” ўладу, а „Ніва” адкрые свае старонкі на шырокую дыскусію, творчую і крытычную наконт існуючай улады. Немагчыма, каб дзеячы шматлікіх арганізацый не мелі нічога новага запрапанаваць выбаршчыкам. Немагчыма, каб членаў Форуму яднала толькі праваслаўе.

Сакавік 2002 г.

Ад старшыні Праграмнай рады:

Паважаны Спадар Куптэль. Па-першае, ісці на выбары не збіраюся і Вашыя падазрэнні тут зусім не на месцы. Пра карупцыю і зладзейства маю пастаянную інфармацыю, чытаючы газеты: „Rzeczpospolita”, „Wprost”, „Polityka”, „Najwyższy Czas”, слухаючы Польскае радыё і аглядаючы Польскае тэлебачанне, а асабліва трансляцыю з нарадаў Сейма. Пра ўсё гэтае гавораць і пішуць польскія палітыкі і публіцысты. Не веру, што Вы, пражываючы ў Гданьску, глядзіце толькі Шведскае тэлебачанне.

*Яўген* МІРАНОВІЧ

# ЧАМУ НЕ ПРЫЕДУЦЬ ПАГАВАРЫЦЬ З НАМІ?

Шкада, што Віктар Бура („Ніва” н-р 47, „Спявай, душа народная, спявай!”) не напісаў, хто падстаўляе ногі старшыні ГП БГКТ Яну Сычэўскаму і сакратару ГП Валянціне Ласкевіч. Бо так складваецца ўражанне, што дасягненні былі б куды большыя, калі б не перашкоды з боку ворагаў слаўных дзеячаў БГКТ.

Перад выбарамі ў самаўрады пытаў я жыхароў Махнатага, каго будуць выбіраць, пэўна нашых „хлопцаў” з Беларускіх выбарчых камітэтаў!? – Адказ быў проста шакіруючы: „На тых бандытаў-беларусаў галасаваць не будзем. Яны ж бяруць грошы ад амерыканцаў, каб нашага Лукашэнку скінуць з пасады прэзідэнта. І той, хто спатыкаецца з Новакам-Езяранскім, каб аднавіць Радыё „Рацыя”, ніколі не служыць беларускай справе”. – „А калі праводзіўся ўсеагульны перапіс насельніцтва, вы, – пытаюся, – якую нацыянальнасць упісалі ў анкету?” – „Вядома, – кажуць – беларускую”. Вось табе і на. З аднаго боку беларусы, а з другога – кандыдатаў беларускіх камітэтаў не прызнаюць за сваіх. Можна падазраваць, што агрэсіўная прапаганда, пасееная на фэстах, прыносіць немалы плён: нянавісць. А што БГКТ мае вялікі вопыт у культурна-асветнай працы – я згодны з Віктарам Бурам. Толькі чаму з такой заядлай нянавісцю выказваліся мае суразмоўцы пра сяброў Беларускага саюза, беларускіх камітэтаў, пра Радыё „Рацыя”?! Адкуль бярэцца злосць і незадавальненне? З таго, што так званая дэмакратыя прынесла самыя шкоды вёсцы? Што не могуць прадаць бульбы, збожжа і што ўсюды ашуканства? Што няма нічога добрага ў сучаснай рэчаіснасці, толькі самое зло. Толькі чаму яно, тое зло, атаясамліваецца з дзейнасцю беларускіх арганізацый розных ад БГКТ? – Ці гэта проста выпадак?

Кепска, што ў мінулым беларусы – гавару пра свядомых беларусаў – не тварылі выбарчых камітэтаў. Добра, што цяпер згуртаваліся і паказалі іншым, што існуе беларуская меншасць. А што ніхто не хоча дзяліцца ўладай – вядома – і таму ўчыніўся вялікі скандал з боку „сяброў” СЛД і іх прыхільнікаў.

З адным сцвярджэннем згаджаюся з маімі суразмоўцамі: „Калі яны, значыць, дзеячы Беларускага саюза, такія беларусы, і хочуць нас прадстаўляць ва ўладах, то чаму не прыедуць і не пагавораць з намі?” Ну і я з імі згодны. Чаму?

Студзень 2003 г.

# ПРА КАНІКУЛЫ І НЕ ТОЛЬКІ

Востраў Борнхальм – рай веласіпедыстам. А ці такім раем не маглі б быць падляшскія раўніны? Што так можа быць, пераканаўся я сёлета, аб'ехаўшы на веласіпедзе бадай усе мясцовасці ў радыусе дзесяці кіламетраў ад Махнатага; заахвоціў мяне да гэтага жыхар Гдыні А. Ельміновіч, які штогод праводзіць водпуск у Орлі.

Глядзеў я на наваколле не толькі вачыма турыста-веласіпедыста, але і беларуса, выхадца з роднай зямлі, лёс якой не перастаў быць мне абыякавым. І сваімі ўражаннямі хачу падзяліцца ў першую чаргу з чытачамі „Нівы", але не толькі. Можа зацікавяцца гэтай інфармацыяй кіраўніцтвы гмін, мо ў будучыні турысты-веласіпедысты з глыбі Польшчы, а мо і з Еўропы. Так-так, не здзіўляйцеся такім сцвярджэнням, прачытайце як нямецкія турысты плылі рэчкай Нараўкай („Osobliwe atrakcje Dzikiego Wschodu", „Polityka" № 34 ад 23 жніўня г.г.) Яны праз мабільны тэлефон расказвалі дзедкам у Брэмене як дояць кароў, пякуць хлеб, б'юць масла ў пральцы „Франя" і захоўваюць яго ў лісцях хрэну, як кормяць курэй, а пасля заахвочвалі іх наведаць гэтыя мясцовасці.

Што трэба, каб пераборлівы турыст заглянуў у наш куток? Перш за ўсё трэба яму падсунуць пад вочы інфармацыю; не абы-якую, але такую, якая яго зацікавіць.

Я, калі ездзіў на веласіпедзе па Гайнаўшчыне, ведаў больш-менш, дзе тыя цікавыя месцы, краявіды і людзі, але нідзе не напаткаў інфармацыі, якая б зацікавіла турыстаў, заахвоціла затрымацца ў Гайнаўцы, у той „браме ў пушчу", пра што так мараць гайнаўскія чыноўнікі, разводзячы рукі, што ў горадзе вялікае беспрацоўе. Інакш у Белавежы, там не толькі ёсць гатэлі і турыстычныя кватэры, але і інфармацыя пра іх пры ўездзе ў мястэчка. Гайнаўка мае што паказаць і чым зацікавіць, але нічым не заахвочвае турыста затрымацца і паглядзець слаўны, але закрыты на чатыры затворы сабор, ці Беларускі музей, ці старую хімічную фабрыку, ці былы тартак. У той „браме ў пушчу" не мог я ў нядзелю набыць маю ўлюбёную „Ніву", бо ўсе кіёскі зачынены, а калі мае сябры з Гдыні спыталі, дзе там можна смачна і нядорага пад'есці, я проста развёў рукі ад бязраднасці.

Дзе, апрача „Нівы" („Помнікі мінуўшчыны ў Арлянскай гміне" Міхала Мінцэвіча ад 26 студзеня г.г.), можна даведацца пра мінуўшчыну Арлянскай гміны? У якіх даведніках? Быў я ў Орлі сёлета ў ліпені. Драўляная царква з 1796 года закрыта, не згадваючы пра мураваную бажніцу з другой паловы XVIII стагоддзя. На маім веласіпедным шляху ўсе цэрквы былі закрыты – я нават гэта разумею, – але дзе нейкая табліца з інфармацыяй пра іх, як

у Дубічах-Царкоўных? Нідзе. А сакральныя аб’екты гэта ж нашы матэрыяльныя каштоўнасці ў сферы духоўнай культуры. Хто, апрача настаўнікаў, як не бацюшка можа расказаць маладому пакаленню пра нашу багатую мінуўшчыну? Даступнасць сакральных аб’ектаў прынясе карысць не толькі турыстам, але і храмам, бо да ўлад будзе даходзіць інфармацыя, што трэба ўкладваць грошы на іх аднаўленне, каб не занепадалі помнікі мінуўшчыны. Інакш кажучы, каб турыст зацікавіўся нашай падляшскай зямлёй, ён павінен мець пра яе інфармацыю ці ў турыстычных даведніках, ці ў Інтэрнэце, ці нават у штодзённай прэсе. Апрача таго, з чым цяпер ужо і не так дрэнна, павінен мець дзе заначаваць, памыцца і добра паесці.

З таго, што мне вядома, дык у Дубіцкай гміне ёсць дзе пераначаваць, памыцца і паесці, дзе ў Арлянскай – не ведаю, пра Чыжоўскую – нічога не ведаю, а пра Гайнаўскую мне вядома тое, што ў Гайнаўцы. Пра кватэры на вёсках мне нічога не вядома. Пішу пра вёскі адлеглыя ад Махнатага менш за дзесяць кіламетраў, хаця ў іх ёсць па некалькі пустых хат, у якіх можна ладзіць начлегі. У самым Махнатым можна пераначаваць у вясковым клубе і пад палаткамі на вясковым пляцы.

Хто меў бы ладзіць такую мінімальную турыстычную інфраструктуру? Думаю, што гэтым можа заняцца кожны, а напэўна аддзелы культуры ў гмінах; для гэтага не трэба вялікіх грошай, толькі ахвота і арганізацыйныя здольнасці. Маю прапанову ніўскім карэспандэнтам: распытайце пра гэта сваіх гмінных чыноўнікаў і напішыце ў „Ніву”. Мо тады заахвочу некалькіх турыстаў Трыгарада наведаць не толькі Белавежу і пушчу.

А так пры нагодзе, у Махнатым, Старым Корніне і Моры стаяць пустыя будынкі па колішніх школах. У канікулы гарадскія дзеці з небагатых сем’яў нікуды не выязджаюць – чаму б не наладзіць ім пабыўкі на вёсцы? Кошт невялікі, а якая радасць і ўдзячнасць. Калі хто не ведае, як гэта зрабіць, служу вопытам. Мы ў пачатку дзевяностых гадоў арганізавалі ў Гданьску пабыўку дзецям з Гайнаўшчыны. Не было раскошна, але не ў тым справа. Найважнейшае чыстае паветра і прыгожыя краявіды, а скарыстаюць не толькі дзеці, але і вясковыя прадуктовыя крамы – у іх можна купіць усё неабходнае харчаваць дзяцей.

Мае вывады ў гэтай справе такія:

– органы мясцовага самакіравання няхай не разводзяць рук і не гавораць, што няма магчымасцей панізіць беспрацоўе; хай робяць стаўку на турызм; а як гэта зрабіць – хай думаюць або вучацца ў іншых; нельга сесці і чакаць, што турыст з’явіцца сам па сабе,

– трэба пачаць з інфармацыі – пры кожнай публічнай дарозе паставіць інфармацыйныя шыльды: ці то вялікія, ці такія дошчачкі, як каля Арэшкава пра тамашні міні-заапарк,

– павятовыя ці нават гмінныя дарогі між Орляй, Дубічамі-Царкоўнымі і Гайнаўкай – нядрэнныя для веласіпеднага турызму і яны павінны быць пазначаны для гэтай мэты; добра было б, калі б на іх быў асфальтавы насціл, так як на Борнхальме – раі для веласіпедыстаў; мо і я дачакаю такіх дарог на Гайнаўшчыне.

На веласіпедных дарогах вакол Махнатага сустракаў я адзінокіх турыстаў, значыць, нейкі пачатак ужо ёсць. І гэтай аптымістычнай акалічнасцю завяршаю свае прапановы.

Люты 2003 г.

# БЯРЫЦЕСЯ ЗА СПРАВУ

Калі так ездзіў я веласіпедам па гмінных дарогах і вёсках Гайнаўшчыны, дык меў уражанне, што крызіс вёскі, прынамсі той, якую я бачыў, не дасягае. Аблогаў са свечкай шукаць. Лугі зялёныя, палі абсеяны. Значыць, так і трэба. А ў вёсках хаты – не хаты, проста шыкарныя дачы, двухпавярховыя, а на кожным панадворку, толькі дзе-нідзе „малы фіят", а то пераважна заграгранічная машына. Жніво не цягнулася, як калісьці, тыднямі – некалькі дзён і па жніве. Пэўна, работа кругом, але добра, што ёсць, не то што ў горадзе, дзе замыкаюць заводы адзін за адным. Аўтакрама давязе і хлеб, і муку, мяса ды макароны. Заварыш вады, сыпнеш у гаршчок быстрасуп, і страва гатова. У такі гарачы час, які быў сёлета, не трэба было стаяць гадзінамі пры кухні, каб накарміць сям'ю. Мала таго, чытаю ў „Ніве" ад 24 жніўня 2003 года („Селянін, што далей?"), што „сяляне ад будучага года і праз наступныя два гады змогуць карыстацца гэтак званай структурнай дапамогай Еўрасаюза". І так, на пабудову або рамонт гаспадарчых будынкаў, закупку машын для земляробства, закупку зямлі і жывёлы можна атрымаць не больш чым 160 тысяч зл.

А ў рамках Праграмы аднаўлення вёскі (ой, прыдалася б шыкарная сетка асфальтавых дарог, нават між палямі) можна атрымаць 450 тысяч зл. пры ўмове, што гэтыя грошы могуць атрымаць тыя сяляне, якія самі пішуць праекты. Дапамога, чытаю, будзе таксама ахопліваць разбудову і адаптацыю жылля і гаспадарчых будынкаў на агратурыстычныя мэты і іх абсталяванне. Разам на гэта можна атрымаць нават і 100 тысяч злотых. Чытаю далей, што на мадэрнізацыю ўнутраных дарог, напрыклад, з Махнатага ў Дубічы-Асочныя, і з Махнатага ў Барок можна атрымаць да 200 тысяч зл. Шкада, што аўтар допісу „Селянін, што далей ?" не падаў інтэрнэтавага адраса Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі.

Дарагія дзеячы розных арганізацый, радныя, солтысы, войты, бярыцеся за справу. Як кажуць, грошы ляжаць на вуліцы, не на вуліцы, але ў Еўрасаюзе. Трэба толькі ўмела іх узяць.

Красавік 2003 г.

# НЕ ГЛЯДЗЕЦЬ НА МІНУЛАЕ ЧУЖЫМІ ВАЧЫМА

Нарэшце пра маю родную вёску ў „Ніве” пішуць на першай старонцы. І, як не кажы, ёсць і здымак з назвай вёскі („Ніва”, ад 7 снежня 2003 г.). З зацікаўленнем пачаў чытаць я тэкст Аляксея Мароза пра маю вёску і яе жыхароў. Пэўна, калісь гэта была вельмі людная вёска, многа дзяцей, моладзі і пажылых людзей тады было, але ў пахмурнае надвор’е на вуліцы была пустэча як і цяпер. А. Мароз піша, што „сумнымі паказваюцца мне вялікія мураваныя і драўляныя дамы, якія будаваліся дваццаць-трыццаць гадоў таму”. Калі чытаю такую канстатацыю, не ведаю, чаму аўтару гэтых слоў вялікія мураваныя і драўляныя дамы паказваюцца сумнымі? Ці таму, што сумнае і пахмурнае надвор’е? Ці таму, што гэтыя вялікія мураваныя і драўляныя дамы стаяць апусцелыя і запушчаныя? А запушчаныя таму, што будаваліся дваццаць-трыццаць гадоў таму? Ці можа таму А. Мароз так напісаў, каб проста падбудаваць свой тэзіс, што беларуская вёска пусцее, старэе і г.д. Думаю, што калі б А. Мароз не ехаў праз Старое Беразова і Махнатае, а затрымаўся і папытаў людзей, калі яны будавалі вялікія мураваныя і драўляныя дамы, то даведаўся б, што некаторыя былі будаваныя не так ужо і даўно. А калі б ехаў, або яшчэ лепш затрымаўся і паглядзеў на нашы вёскі вясной або летам, то не паказаліся б гэтыя шыкарныя дамы сумнымі.

Далей, думаю, што ацэнка гаспадарання якраз у гэтых вёсках больш складаная чым вынікае з артыкула Мароза. Добра, што журналіст, хоць крыху, прыбліжае чытачам „Нівы”, чым жыве сучасная вёска. Вёска, дзе ёсць актыўных прынамсі 15 малодшых гаспадароў і дзе няма кавалачка неабробленай зямлі.

Вядома, можна спытаць, каму перашкаджала такое жыццё, калі „многія гаспадары працавалі ў Гайнаўцы або Бельску-Падляшскім... Іх жонкі і дзеці даглядалі жывёлу, куплялі „фіаты”, „паланезы” і патрэбную сельгастэхніку... Дзесяцігектарных гаспадарак хапала для дастатковага жыцця. Складанасці паявіліся, калі ў краіне пачаліся перамены.” Такі вобраз быўшага жыцця на вёсцы не зусім праўдзівы, бо не заўсёды так было, а дзесяцігектарных гаспадарак не было так многа. Купіць „фіат” ці „паланез”, не гаворачы пра сельгастэхніку, было вельмі складана. Без хабараў і блату нічога не можна было купіць. А складанасці паявіліся, бо рэчаіснасць лопнула. Каб штось купіць, хабары і блат ужо не памагалі. Перамены пачаліся, бо паявіліся сур’ёзныя складанасці, а не наадварот. Не ведаю, які ўзрост А. Мароза, але калі ён сам не памятае як было, то павінен прынамсі пачытаць, каб не глядзець на мінулае вачыма сваіх суразмоўцаў.

Студзень 2004 г.

# ДУМКІ – КВЕТКІ

Калі чытаю „Ніву”, кідаюцца мне ў вочы так званыя „думкі-кветкі” аўтараў допісаў. Напрыклад, заўвагі Ежы Плютовіча („Ніва” № 18) пры нагодзе разважанняў аб нудзе: „Нуда і прыналежная ёй нецярплівасць – недамаганне некаторых кругоў інтэлігенцыі, асабліва той прафанскай, фанабэрыстай, якая пярэчыць Богу і прысутнасці святога ў жыцці”. Не ведаю, дзе тыя кругі інтэлігенцыі цяпер знаходзяцца, бо Ежы Плютовіч пальцам іх не паказвае, а што гэтыя кругі фанабэрыстай інтэлігенцыі пярэчаць Богу – гэта ўжо зусім феномен.

Некалькі радкоў далей у Ежы Плютовіча чытаем, што правадырамі анархістаў, бальшавікоў, нацыстаў, ісламістаў станавіліся... інтэлігенты. Паводле Плютовіча цэлае зло сучаснага жыцця ствараюць інтэлігенты, асабліва адукаваныя і заможныя. Такім чынам „думка-кветка” Ежы Плютовіча ўпісваецца ў паслядоўнасць усяго таго, што зараз дзеецца ў палітыцы, а вінаваты ўсяму інтэлігенты. Не ведаю ці Плютовіч – інтэлігент, але аб тым, што іх не любіць, напісаў у „Ніву”.

Дзядзька Захар не любіць Еўрасаюза і аб гэтым можна прачытаць у яго-ных допісах. Адкуль ён даведаўся, што „чэрствы хлеб прыйдзецца спальваць у печы” і хто яго прымусіць да гэтага – невядома, але Дзядзька Захар турбуецца тым, і гэтай турботай дзеліцца з чытачамі „Нівы”. „Думкай-кветкай” было напоўнена трывожнае выступленне Анны Радзюкевіч са штомесячніка „Przegl№d Prawosiawny” – прынамсі так вынікае з інфармацыі (ав) з канферэнцыі ў Нараўцы пад лозунгам „Краіна шчаслівасці. Рэгіён Белавежскай пушчы – перспектывы развіцця ў Еўрасаюзе” („Ніва” № 18). А можа не была гэта думка, толькі самай кветкай было пытанне: „Ці ў свеце масавай культуры, які губляе маральныя арыенціры і заворвае мяжу між дабром і злом, магчымая рэфлексія пра сэнс жыцця?..” Свет масавай культуры губляе маральныя арыенціры? Затым, культура мае быць элітарнай. Яна ўжо памаленьку такой становіцца. Прытым, думаю, прычынай згубы не з’яўляецца „свет масавай культуры”, які наогул абмяжоўваецца да культуры з тэлевізара.

„Я таксама супраць”,– піша Міхась Сцепанюк. А я не супраць таго, каб ён быў супраць. Няхай сабе будзе супраць, але... М. Сцепанюк шчыра і голасна гаворыць: „Не!!!” для таго, каб гінулі нашы хлопцы за амерыканскую нафту. Можа М. Сцепанюк не ведае, але арабская нафта не з’яўляецца толькі амерыканскай, і калі яе не стане, цэны рускай нафты, якой карыстаецца гаспадарка Польшчы, павысяцца. Гэта такая заўвага пры нагодзе думак карэспандэнта „Нівы”. Вывад Сцепанюка такі: калі б нашых хлопцаў у Іраку не было, то нас талібы не краналі б, і перамяшчаўся б наш карэспандэнт на

метро не 10 хвілін, а толькі пяць. Пэўна, можна жыць у хаце з краю, але адкуль вядома, што яна з краю, а не ў сярэдзіне глабальнай вёскі?

Не пазбегнуў „думак-кветак" Яўген Мірановіч у фельетоне „У марыянетачным свеце" („Ніва" № 19). Можна ўсяляк ацэньваць польскі ўдзел у гэтак званай стабілізацыі ў Іраку, але параўноўваць акупацыю Ірака да акупацыі Польшчы немцамі ў час II сусветнай вайны гэта звышінтэрпрэтацыя.

Вядома, вясной кветак ураджай, але добра было б, каб у „Ніве" было іх як найменш.

Сакавік 2004 г.

# ЯШЧЭ ПРА МУЗЕЙ

Наталля Герасімюк („Ніва”, ад 1.02.2004 г.) звярнулася да беларусаў, між іншым, з пытаннем „як удыхнуць жыццё” ў велізарны будынак музея. Помню палеміку на старонках „Нівы”, звязаную з пабудовай беларускага музея ў пачатку, бадай, васьмідзесятых гадоў мінулага стагоддзя. Цяпер ставіцца пытанне, што зрабіць з такім агромністым будынкам, калі тады было вядома, што ў Гайнаўцы няма каму прафесійна весці музейную ўстанову. Каб гэта прадбачыць, не трэба было выказвацца вялікай пранізлівасцю. Калі так, дык можна сказаць, што калі наварылі такога піва, дык піце, таварышы, яго самі. Шкада толькі тысяч долараў ахвяравальнікаў з усяго свету, пры дапамозе якіх паўстаў „даўгабуд”. Дзесяцігоддзямі „Ніва” друкуе спісак ахвяравальнікаў, але ні разу не ўдалося мне прачытаць, як былі расходаваныя гэтыя, як не кажы, але грамадскія грошы. Пішу пра гэта, бо калі чытаю ў допісе Юркі Харкевіча „Якім быць музею ў Гайнаўцы” пра фінансавы балаган, дык не дзіўна, што „гэта ўсё не стварала добрай атмасферы вакол Музея”. Ю. Харкевіч піша далей, што „будуючы забыліся – мы ўсе – пра яго ідэю”. Не ўсе, спадар Харкевіч, не ўсе. І яшчэ адна праўда, якую трэба сабе ўсведаміць: ніколі вялікі будынак Беларускага музея не будзе цэнтрам культуры беларускай меншасці. Чаму? – часткова на гэтае пытанне адказвае аўтар допісу. Каб у Беластоку, пэўна так, хаця толькі 7 434 жыхары горада прызналіся да беларускасці, але патэнцыял куды большы чым у Гайнаўцы, ну і кадры, якія ўсё вырашаюць, як нехта казаў.

Некалькі дзён таму аглядаў я старонку www.hajnowka.pl у Інтэрнэце і пра беларускі музей ёсць там адзін сказ, што такі існуе. Нічога пра беларусаў, беларускасць, культуру, адметнасць рэгіёна і г.д.

А так пры нагодзе, спадар Харкевіч, думка, каб пры Музеі заснаваць эстраду, гэта ўжо зусім кур’ёз. Хіба, што музейную. З тым згаджаюся. Музейных эстраднікаў не так ужо і мала.

Красавік 2004 г

# Міхась Куптэль (М. Махнацкі) ў “Ніве”

1.Дарагая “Ніва”, № 40, 5.12.1982, с. 6 (пра бел. назвы)

2.Нацянальнасьць мяняць нельга і немагчыма, № 13, 27.03.1983, с. 11
3. Беларуская мова, № 20, 15.05.1983, с.4
4. Усе тайны крану, № 22, 29.05.1983, с. 7
5. Музей – элемент жывой культуры, № 24, 12.06.1983, с. 7
6. Сопат, № 25, 19.06.1983, с. 11
7. Мае думкі пра нас, № “8, 10.07.1983, с. 4, 11
8. Пра студэнцкі рух, № 30, 24.07.1983, с. 4
9. Якія мы людзі?, № 32, 7.08.1983, с. 4
10.Мінулае, № 34, 21.08.1983, с. 8
11. Адгалоскі на адгалоскі, № 35, 28.08.1983, с. 4
12. Якая “Ніва”, № 39, 25.08.1983, с. 4, 11
13. Якія мы людзі, № 40, 2.10.1983, с. 11
14. Якія вы паэты, № 42, 16.10.1983, с. 4
15. Што добра, што кепска, № 43, 23.10.1983, с. 11
16.Аб ранах душы, № 47, 20.11.1983, с. 2
17. Падарожжа (верш), № 49, 4.12.1983, с. 12

18. Наша пошта, № 21, 20.05.1984, с. 11 (пра выкідванне з карэспандэнцыі выказванняў наконт прозы Яновіча)
19. Віктар Швед і гданьскія куранты, № 22, 27.05.1984, с. 4
20. Што ў нас?, № 26, 30.06.1984, с. 5
21. Няма благога без добрага, № 27, 1.07.1984, с. 4
22. Антарктычнае падарожжа, № 33, 12.08.1984, с. 2-3
23. Божа барані Петручука!, № 38, 16.09.1984, с. 4-5
24. Пустыня, № 39, 23.09.1984, с. 4
25. Працяг думкі, № 47, 18.11.1984, с. 4
26. Не тое лякарства, не тое лячэнне, № 53 (54?), 30.12.1984, с. 4, 6-7

27. Аб восені, лесе і паэзіі, № 3, 20.01.1985, с. 4
28. Заказваю касеты, № 11, 17.03.1985, с. 4
29. Гледзячы збоку, № 15, 14.04.1985, с. 5
30. Наша пошта, № 15, 14.04.1985, с. 11 (пра даклад “Беларусы і БГКТ у Польшчы)
31. Не мода, № 16, 21.04.1985, с. 7
32. Прапаную мужчынскія клубы, № 18, 5.05.1985, с. 5
33. Дадаць дрожджы, № 20, 19.05.1985, с. 4

34. У чым паэзія, № 32, 11.08.1985, с. 4
35. Дыхаю палемікай, № 33, 18.08.1985, с. 1, 4
36. Больш практыкі, № 36, 8.09.1985, с. 3-4
37. Як жыць з “Нівай”, № 42, 20.10.1985, с. 1, 4
38. Брава, № 51, 22.12.1985, с. 4

39. Зіма не страшна, № 2, 12.01.1986, с. 4
40. “Не тое лякарства, не тое лячэнне”, № 5, 2.02.1986, с. 4-5
41. Прыдзі сон, № 6, 9.02.1986, с. 7
42. Аб студэнцкай “Прысутнасці”, № 12, 23.03.1986, с. 1
43. Зайздрасць – брыдкая рыса, № 12, 23.03.1986, с. 4
44. Кожнаму чагосці не хапае, № 13, 30.03.1986, с. 4
45. Які заўтрашні дзень?, № 14, 6.04.1986, с. 2
46. Недахоп ідэі ці ахвоты, № 21, 25.05.1986, с. 4
47. Сум і самота, № 21, 25.05.1986, с. 4
48. Навеянае вершамі Надзі Артымовіч, № 22, 1.06.1986, с. 3
49. Аб чым марыш чалавеча, № 33, 17.08.1986, с. 2
50. Якая праўда, № 44, 2.11.1986, с. 4, 6
51. Не магу зразумуць, № 46, 16.11.1986, с. 1

52. Нацыяналізм перашкаджае патрыятызму, № 2, 11.01.1987, с. 1
53. Сход гданьскіх беларусаў, № 9, 1.03.1987, с. 5
54. Без комплексаў, № 9, 1.03.1987, с. 2-3
55. Юзвюк не дадумаў праблему, № 15, 12.04.1987, с. 3
56. Рабіць на гультаёў, № 21, 24.05.1987, с. 3-4
57. Не забаронена, значыць: дазволена, № 27, 5.07.1987, с. 4
58. Без комплексаў, № 34, 23.08.1987, с. 2-3
59. Мастацтва – сур’ёзная справа, № 38, 20.09.1987, с. 4

60. Дзеля разнастайнасці, № 7, 14.02.1988, с. 4, 11
61. Беларусы і “Пожня”, № 14, 3.04.1988, с. 3
62. Час усяму суддзя, № 21, 22.05.1988, с. 6
63. Наша пошта, № 33, 14.08.1988, с. 6
64. Наша пошта, № 36, 4.09.1988, с. 4
65. Лета, лета і па леце..., № 49, 4.12.1988, с. 3
66. Галасы з’езда, № 50, 25.12.1988, с. 2

67. Адкрытае пісьмо сябрам, № 36, 17.09.1989, с. 11

68. Прыбытак на беларускую дзейнасць, 28.01.1990, с. 5

69. Новы час (Адгалоскі), № 44, 4.11.1990, с. 6-7
70. Дух сталінізму, № 47, 25.11.1990, с. 4-5
71. Жыццё годнае, № 50, 16.12.1990, с. 6

72. Невядомыя літаратуры (адгалоскі), № 14, 7.04.1991, с. 6
73. У чым справа?, № 20, 19.05.1991, с.2
74. У чым справа?, № 33, 18.08.1991, с. 5
75. Пра банк і іншыя справы, № 51, 22.12.1991, с. 8

76. Як жыць?, № 16, 19.04.1992, с. 4
77. Размовы аб мінулым, 05.1992
78. Агітацыя з дапамогай капіталістаў, № 39, 27.09.1992, с. 4, 8
79. Юбілей Гомеля, № 46, 15.11.1992, с. 5

80. "Круг параноі, але дзе?", № 11, 14.03.1993, с. 8
81. Ліст з-над мора, № 34, 22.08.1993, с. 3
82. Яшчэ пра выбары, № 46, 14.11.1993, с. 4
83. Не трэба мяшаць!, № 50, 12.12.1993, с. 10

84. Соль і перац, № 1, 2.01.1994, с.
85. Што там у Гайнаўцы, № 3, 16.01.1994, с.
86. Мець і быць, № 4, 23.01.1994, с.
87. Соль і перац, № 5, 30.01.1994, с.
88. Што з цэнтрам беларускай культуры, № 5, 30.01.1994, с.
89. Павеяла нацыяналізмам, № 13, 27.03.1994, с. 4
90. "Пільнуйцеся ад ілжывых прарокаў", № 16, 17.04.1994, с. 9
"Падбайце аб культуру мовы" -№ 16, 17.04.1994,с. 5
91. Адгалоскі. Да палемікі..., № 49, 25.09.1994, с. 9
92. Беларусы ў запаведнік, № , 23.10.1994, с. 9
93. Яшчэ пра беларускую мову ў школах, 11.12.1994, с. 5

94. Этнічнасць – праблема сучаснага свету, № 23, 4.06.1995, с. 4
95. Кліф, № 28, 9.07.1995, с.
96. Годнасць беларуса, № 30, 23.07.1995, с. 5
97. "Справа Яновіча", № 32, 6.08.1995, с. 4
98. Што з Гданьскім аддзелам БГКТ?, № 34, 20.08.1995, с. 8 (з Г. Глагоўскай)
99. У справе Гданьскага аддзела БГКТ, № 43, 22.10.1995, с. 9
100. Што з музеем?, № 21.01.1996, с. 5
101. Пры нагодзе юбілею, № 12, 24.03.1996, с. 5

102. Адгалоскі, № 13, 31.03.1996, с. 3
103. Пратэст, № 20, 19.05.1996, с. 4
104. Што мае думаць беларус?, № 28, 14.07.1996, с. 5
105. Прысылайце свае прапановы, № 30, 28.07.1996, с.
106. Фэсты і паслы, № 32, 11.08.1996, с. 5
107. Палемісты, № 33, 18.08.1996, с. 10
108. Як выйсці з круга бегэкатызацыі, № 37, 15.09.1996, с. 9
109. Ці трэба завозіць культуру, № 40, 6.10.1996, с. 8
110. Крышку пра палітыку, № 44, 3.11.1996, с. 10

111. Адгалоскі, № 7, 16.02.1997, с. 11
112. Аб'ява, № 8, 23.02.1997, с. 10
113. Трэба вярнуць памяць, № 21, 25.05.1997, с. с. 4
114. Усе наракаюць, № 22, 1.06.1997, с. 4
115. Фальшаванне гісторыі, № 27, 6.07.1997, с. 10
116. Тэлебачанне і выбары, № 28, 13.07.1997, с. 10
117. Аб розных поглядах, № 29, 20.07.1997, с. 4
118. Litwo, Ojczyzno nasza, № 31, 3.08.1997, с. 10
119. Разважанні пра дэмакратыю, № 35, 31.08.1997, с.
120. У чым заключаецца пазітывісцкая праца, № 47, 23.11.1997, с. 4
121. Адзін у полі - не воін, № 49, 7.12.1997, с. 4
122. Культура гэта шчасце, № 52, 27.12.1997, с. 4, 11

123. Невыкарыстаныя фонды, № 2, 11.01.1998, с. 4
124. Займайцеся еадзённымі справамі, № 9, 1.03.1998, с. 4
125. 80-я ўгодкі БНР у Гданьску, № 17, 26.04.1998, с. 3
126. Добра, што хоць адзін зразкмеў, № 18, 3.05.1998, с. 4
127. Экскурсія ў кашубскую вёску, № 29, 19.07.1998, с. 8
128. Пра помнік і выбары, № 30, 26.07.1998, с. 11
129. Неабходна арганізаваць збыт, № 34, 23.08.1998, с. 3
130. Немцы – дэмакратычны народ, № 34, 23.08.1998, с. 9
131. Новы паклоннік, № 35, 30.08.1998, с. 9
132. Беластоцкі песімізм, № 38, 20.09.1998, с. 11
133. Цяжкі палеміст, № 39, 27.09.1998, с. 11
134. Я – вораг адмоўнага, № 51, 20.12.1998, с. 4

135. Публіцысты і публіцыстыка, № 8, 21.02.1999, с. 4
136. Гутарка з кандыдатам, № 9, 28.02.1999, с. 3
137. Вінаваты простыя людзі, № 13, 28.03.1999, с. 4
138. Сумую і не сумую, № 24, 13.06.1999, с. 4

139. Разлады (верш), № 40, 3.10.1999, с. 5
140. Гісторычныя вывады, № 42, 17.10.1999, с. 4
141. Спатканне парламентарыяў з нацменамі, № 44, 31.10.1999, с. 4
142. Заўвагі аб “Ніве”, № 50, 1999, с. 5
143. Адсутнасць аргументаў, № 51, 19.12.1999, с. 11
144. Гуманны закон, № 52, 26.12.1999, с. 11

145. Халодным вокам, № 1, 2.01.2000, с. 10
146. Ёсць штосці аптымістычнага ў інфармацыі, № 3, 16.01.2000, с. 4
147. Круціць і верціць Макацёр, № 9, 28.02.2000, с.
148. Гайнаўшчына ў інтэрнэце, № 15, 9.04.2000, с. 10
149. Будучыня ў сельскай гаспадарцы, № 12, 19.03.2000, с. 3
150. Падвойная маральнасць, № 17, 23.04.2000, с. 2
151. Аб нашым яднанні, № 46, 12.11.2000, с. 4

152. Няхай вас не зводзяць пахвальеыя лісты, № 4, 28.01.2001, с. 4
153. Неадпаведнае папаўненне, № 8, 25.02.2001, с. 4
154. Нацыянальная тоеснасць і царква, № 11, 18.03.2001, с. 9
155. Аб заняпадзе беларускасці, № 15, 15.04.2001, с. 5
156. Мерапрыемствы “Хаткі”, № 16, 22.04.2001, с. 5
157. Стараюся памагчы добрым словам, № 17, 29.04.2001, с. 9
158. Ці чакаць нам манны нябеснай, № 32, 18.08.2001, с. 3
159. Дыктатары не сумняваюцца ў рацыі, № 45, 11.11.2001, с. 4

160. Крытычна дзеля прагрэсу, № 9, 3.03.2002, с. 11
161. Дзень волі ў Сопаце, № 17, 28.04.2002, с. 3
162. Наракаць кожны можа, але..., № 32, 11.08.2002, с. 10
163. І ў Амэрыцы патрэбны білет, № 33, 18.08.2002, с. 5
164. Разважанні аб праўдзе, № 41, 13.10.2002, с. 4

165. Чаму не прыедуць пагаварыць з намі?, № 1, 5.01.2003, с. 3
166. Пра канікулы і не толькі, № 39, 28.09.2003, с. 1, 4
167. Бярыцеся за справу, № 41, 12.10.2003, с. 4

168. Не глядзець на мінулае чыстымі вачыма, № 1, 4.01.2004, с. 9
169. Адсутнасць публіцыстыкі, № 6, 8.02.2004, с. 4
170. Яшчэ пра музей, № 17, 25.04.2004, с. 5
171. Думкі кветкі, № 23, 6.06.2004, с. 5

# Змест


Дарагая “Ніва” .......... 9
Нацыянальнасць мяняіь нельга і немагчыма .......... 10
Веларуская мова .......... 11
Музей – элемент жывой культуры .......... 12
„Мае думкі пра нас” (П. Байко, „Ніва” № 20) .......... 13
Пра студэнцкі рух .......... 15
Адгалоскі на адгалоскі .......... 16
Якая „Ніва” .......... 17
Якія мы людзі .......... 18
Якія вы паэты .......... 19
Што добра. Што кепска .......... 20
Аб ранах душы .......... 21
Няма благога без добрага .......... 22
Божа барані петручука! .......... 23
Пустыня .......... 25
Не тое лякарства, не тое лячэнне .......... 26
Гледзячы з боку .......... 29
Не мода .......... 30
Зайздрасць – брыдкая рыса .......... 31
Праўда .......... 32
Не магу зразумець .......... 34
Нацыяналізм перашкаджае патрыятызму .......... 35
Юзвюк не дадумау праблему .......... 36
Рабіць на гультаёў .......... 37
Мастацтва – сурёзная справа .......... 39
Беларусы і “пожня” .......... 40
Час усяму суддзя .......... 41
Новы час .......... 42
Дух сталінізму .......... 44
Жыццё годнае .......... 46
Невядомыя літаратуры .......... 47
У чым справа .......... 48
Пра банк і іншыя справы .......... 49
Як жыць? .......... 51

Агітацыя 3 дапамогай капіталістаў ........................................ 52
„Круг параноі, але дзе?” ........................................ 43
Яшчэ пра выбары ........................................ 56
Да палемікі праф. Вандала Арлян-скага і Барыса Штотыднёвага
з Глебам Штодзённым ........................................ 58
Беларусы ў запаведнік? ........................................ 60
Яшчэ пра беларускую мову ў школах ........................................ 61
Што мае думаць беларус? ........................................ 62
Прысылайце свае прапановы ........................................ 64
Фэсты і паслы ........................................ 65
Палемісты ........................................ 66
Як выйсці з круга бэгэкатызацыі ........................................ 67
Крышку пра палітыку ........................................ 68
Ці трэба завозіць культуру? ........................................ 70
Разважанні пра дэмакратыю ........................................ 72
Усе наракаюць ........................................ 73
Фальшаванне гісторыі ........................................ 74
Litwo, ojczyzno nasza ........................................ 75
Тэлебачанне і выбары ........................................ 76
Аб розных поглядах ........................................ 77
Адгалоскі ........................................ 79
Адзін у полі – не воін ........................................ 80
У чым заключаецца пазітывісцкая праца? ........................................ 82
Нявыкарыстаныя фонды ........................................ 83
Цяжкі паленіст ........................................ 84
Немцы – дэмакратычны народ ........................................ 85
Неабходна арганізаваць збыт ........................................ 86
Добра, што хоць адзін зразумеў ........................................ 88
Гуманны закон ........................................ 89
Адсутнасць аргументаў ........................................ 89
Заўвагі аб „Ніве” ........................................ 90
Вінаваты простыя людзі ........................................ 91
Сумую і не сумую ........................................ 92
Агістарычныя вывады ........................................ 93
Гутарка з камендантам ........................................ 94
Халодным вокам ........................................ 96
Ёсць штосьці аптымістычнага ў інфармацыі ........................................ 98
Круціць і верціць Макацёр ........................................ 99
Гайнаўшчына ў Інтэрнэце ........................................ 100
Будучыня ў сельскай гаспадарцы ........................................ 101

Падвойная маральнасць ........................................................................ 103
Аб нашым яднанні ................................................................................ 104
Ці чакаць нам манны нябеснай?.......................................................... 105
Мерапрыемствы „Хаткі” ..................................................................... 107
Няхай вас не зводзяць пахвальныя лісты ............................................ 108
Неадпаведнае параўнанне .................................................................... 110
Нацыянальная тоеснасць і Царква ........................................................ 111
Аб заняпадзе беларускасці ..................................................................... 112
Стараюся памагчы добрым словам ....................................................... 113
Крытычна дзеля прагрэсу ..................................................................... 115
Наракаць кожны можа але.................................................................... 116
Чаму не прыедуць пагаварыць з намі?................................................. 118
Пра канікулы і не толькі ........................................................................ 119
Бярыцеся за справу ................................................................................ 122
Не глядзець на мінулае чужымі вачыма................................................ 123
Думкі – кветкі ......................................................................................... 124
Яшчэ пра музей ...................................................................................... 126
Міхась Куптэль (М. Махнацкі) ў “Ніве” ................................................ 127